Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

Д. У. ДУК

# АРХЕАЛОГІЯ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасці
1-21 03 01 “Гісторыя”

Наваполацк
ПДУ
2009

УДК 902/904(075.8)
ББК 63.4я73
Д81

Рэкамендавана да выдання метадычнай камісіяй
гісторыка-філалагічнага факультэта ў якасці
вучэбна-метадычнага комплекса (пратакол № 8 ад 11.03.2008)

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
д-р гіст. навук, кіраўнік Цэнтра археалогіі даіндустрыяльнага грамадства
ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" В. М. ЛЯЎКО;
канд. гіст. навук, дац. каф. айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА "Полацкі
дзяржаўны універсітэт" У. А. ЛОБАЧ

**Дук, Д. У.**
Д81 Археалогія : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў спец. 1-21 03 01 "Гісторыя" / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 156 с.

ISBN 978-985-418-818-8.

Змяшчае лекцыйны матэрыял па дысцыпліне, кантрольныя пытанні і заданні да семінарскіх заняткаў, тэмы рэфератаў для самастойнай работы. Складзены ў адпаведнасці з базавай праграмай дысцыпліны "Археалогія" і спалучае ўласны досвед беларускіх археолагаў і сусветную практыку ў справе археалагічнага вывучэння старажытнага грамадства.

Прызначаны для студэнтаў спецыяльнасці "Гісторыя", выкладчыкаў.

**УДК 902/904(075.8)**
**ББК 63.4я73**

**ISBN 978-985-418-818-8**

© Дук Д. У., 2009
© УА "Полацкі дзяржаўны
універсітэт", 2009

# УВОДЗІНЫ

Археалогія з'яўляецца важнай часткай гістарычнай навукі, з дапамогай якой чалавецтва спасцігае большаю частку сваёй "дапісьмовай" гісторыі. Археалагічная навука ў Рэспубліцы Беларусь развіваецца ў рэчышчы агульнасусветнай практыкі. Рэчавыя помнікі чалавечай дзейнасці захаваліся ў выглядзе адкладанняў культурнага пласта, асобных рэчаў, пабудоў і іншых катэгорый помнікаў. Матэрыяльная спадчына незваротная. Разбураны курган ці знішчанае гарадзішча падобныя на страчаныя старонкі летапісу пэўнага народа і чалавецтва ў цэлым. Таму вывучэнне археалогіі спрыяе вялікай выхаваўчай задачы: фарміраванню ў будучых прафесійных гісторыкаў пачуцця адказнасці за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. А дзеля гэтага вельмі актуальным з'яўляецца папулярызацыя археалогіі як навукі.

Нягледзячы на вялікую сацыякультурную значнасць дысцыпліны "Археалогія" метадычнае забяспячэнне курса ў айчыннай гуманітарыстыцы вельмі сціплае. На сённяшні дзень адстунічае комплекснае метадычнае выданне, якое б адпавядала праграме курса, зацверджанай для студэнтаў спецыяльнасці 21 03 01 "Гісторыя" гістарычных факультэтаў ВНУ Беларусі. Дадзены вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове базавай праграмы дысцыпліны "Археалогія" і спалучае ўласны досвед беларускіх археолагаў і сусветную практыку ў справе археалагічнага вывучэння старажытнага грамадства.

Мэты дысцыпліны: авалоданне студэнтамі ведамі аб прадмеце археалогіі, набыццё ўмення і першасных навыкаў па методыцы археалагічных даследаванняў, азнаямленне з асноўнымі праблемамі вывучэння археалагічных помнікаў свету.

Задачы вывучэння дысцыпліны:

1. Даць уяўленне аб археалогіі як галіне гістарычнай навукі, якая адлюстроўвае гістарычны працэс шляхам вывучэння рэчавых крыніц.
2. Разгледзець этапы станаўлення вытворчай дзейнасці чалавека.
3. Прасачыць працэсы ўтварэння і эвалюцыі археалагічных культур.
4. Даць уяўленне аб працэсах этнагенезу на дагістарычным этапе.
5. Асвятліць праблему ўзаемадзеяння культуры і прыроднага асяроддзя на аснове археалагічных звестак.

Аптымальнае вывучэнне дысцыпліны "Археалогія" прадугледжвае самаадукацыю студэнта пад кіраўніцтвам выкладчыка. Дзеля гэтага ў вучэбна-метадычны комплекс закладзены лекцыйны матэрыял па

дысцыпліне, кантрольныя пытанні да тэм курса, заданні да семінарскіх заняткаў са спісам літаратуры, а таксама тэмы рэфератаў для самастойнай работы. Тэрміналагічны слоўнік з'яўляецца абавязковым для засваення зместу лекцый. Належнае выкананне ўсіх заданняў да семінарскіх заняткаў, вольнае валоданне адказамі на кантрольныя пытанні да лекцый, своечасовае вырашэнне тэст-заданняў і кантрольных работ пасля кожнай з тэм гарантуюць студэнту высокую адзнаку па выніках самастойнай работы.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ**

| № тыдня | № тэмы | Пытанні, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (нумары) | | Наглядныя і метадычныя сродкі навучання | Самастойная работа студэнта пад кіраўніцтвам выкладчыка | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | семі-нар. | лабар. | | змест | гадзі-ны | |
| 1, 2<br><br>3, 4 | 1 | **Археалогія як навука.** Вызначэнне археалогіі і яе месца сярод гістарычных навук. Станаўленне археалогіі як навукі. Асноўныя тыпы гістарычных крыніц. Віды археалагічных помнікаў. Асноўныя заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў. Віды археалагічнай разведкі. Адкрытыя лісты. Археалагічныя раскопкі. Культурны пласт і археалагічная стратыграфія. Крыніцы і метады датавання ў археалогіі. Абсалютная і адносная | 1<br><br>2 | | Падручнікі, дапаможная літаратура | | | Апытанне ў вуснай (пісьмовай) форме, тэсціраванне |

| № тыдня | № тэмы | Пытанні, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (нумары) | | Наглядныя і метадычныя сродкі навучання | Самастойная работа студэнта пад кіраўніцтвам выкладчыка | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | семі-нар. | лабар. | | змест | гадзі-ны | |
| | | храналогія. Паняцце “археалагічная культура”. | | | | | | |
| 5, 6 | 2 | **Палеаліт.** Алдувайская эпоха. Эпоха ашэль. Мусцье. Верхні палеаліт. | 3 | | Падручнікі, дапаможная літаратура, археалагіч-ныя карты | | | Апытан-не ў вуснай (пісьмо-вай) форме, калок-віўм |
| 7, 8 | 3 | **Мезаліт.** Культурныя зоны і культуры мезаліту. | | | Падручнікі, дапаможная літаратура, археалагіч-ныя карты | | | Кантроль-ная работа |
| 9, 10, 11, 12 | 4 | **Неаліт.** “Неалітычная рэвалюцыя” і распаўсюджванне вытворчай гаспадаркі | 4 | | Падручнікі, дапаможная літаратура, археалагіч-ныя карты | | | Апытан не ў вуснай (пісьмо-вай) форме, калок-віўм |
| 13, 14 | 5 | **Энеаліт і бронзавы век.** Перыядызацыя і храналогія энеаліту і бронзавага веку. Развіццё вытворчых гаспадарак. Трыпольская культура. Старажытна-ямная, катакомбная і зрубная культуры. Крыта-мінойская цывілізацыя. Мегалітычныя культуры ў Еўропе. Лужыцкая культура. | 5 | | Падручнікі, дапаможная літаратура, археалагіч-ныя карты | | | Міні-кантроль-ная работа |

| № тыдня | № тэмы | Пытанні, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (нумары) | | Наглядныя і метадычныя сродкі навучання | Самастойная работа студэнта пад кіраўніцтвам выкладчыка | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | семі-нар. | лабар. | | змест | гадзі-ны | |
| | | Індаеўрапейская праблема. Узнікненне першых цывілізацый. | | | | | | |
| 15, 16 | 6 | **Жалезны век.** Металургія жалеза. Гальштат. Кельты і латэнская цывілізацыя. Антычная археалогія і старажытнарымская археалогія. Скіфы і сарматы. Культуры балцкіх плямёнаў і фіна-угры. Праблемы пошукаў прарадзімы славян. Балты, славяне, фіна-угры, германцы: праблема этнічнай інтэрпрэтацыі. | 6 | | Падручнікі, дапаможная літаратура, археалагіч-ныя карты | | | Апытанне ў вуснай (пісьмо-вай) форме, калок-віўм |
| 17, 18 | 7 | **Старажытная Русь.** Праблема ўзнікнення гарадоў Еўропы. Шляхі станаўлення гарадскіх цэнтраў. Роля гандлю ва ўтварэнні першых гарадоў. Рамёствы. | 7 | | Падручнікі, дапаможная літаратура, археалагіч-ныя карты | | | Апытанне ў вуснай (пісьмо-вай) форме, праверка планаў-канспек-таў да семінар-скіх заняткаў |

**Прыкладныя тэмы кантрольных работ для студэнтаў завочнага аддзялення**

1. Станаўленне археалогіі як навукі.
2. Археалагічная храналогія і перыядызацыя.
3. Віды археалагічнай разведкі.
4. Ранні палеаліт.
5. Эпоха мусцье.
6. Позні палеаліт.
7. Асноўная характарыстыка мезаліту.
8. Тыпы каменных прылад працы ў каменным веку.
9. Неалітычная рэвалюцыя.
10. Мастацтва верхняга палеаліту.
11. Праблема паходжання гарадоў па археалагічных даных.
12. Агульная характарыстыка энеаліту.
13. Агульная характарыстыка эпохі бронзы.
14. Мегалітычныя культуры ў Еўропе.
15. Праблема паходжання індаеўрапейцаў.
16. Жалезны век Еўропы.
17. Гальштат.
18. Кельты і латэнская цывілізацыя.
19. Кімерыйцы, скіфы і сарматы па археалагічным даным.
20. Праблема паходжання славян.
21. Узнікненне Русі паводле археалагічных даных.
22. Усходнеславянскі горад па археалагічных даных у XI–XIII стст.
23. Вікінгі, нарманы, варагі на Русі па археалагічных даных.

**Прыкладныя пытанні да экзамену**

1. Станаўленне археалогіі як навукі.
2. Месца археалогіі сярод гістарычных навук.
3. Віды археалагічных помнікаў.
4. Культурны пласт і археалагічная стратыграфія. Паняцце адкрытага і закрытага комплексаў.
5. Віды археалагічнай разведкі.
6. Археалагічныя раскопкі.
7. Камеральная апрацоўка археалагічнага матэрыялу.
8. Археалагічная храналогія і перыядызацыя.
9. Крыніцы і метады датавання ў археалогіі.
10. Паняцце культуры ў археалогіі.
11. Агульная характарысытыка эпохі палеаліт.
12. Алдувайская і ашэльская эпохі.
13. Каменная індустрыя эпохі палеаліт.
14. Эпоха мусцье і верхняга палеаліту.
15. Мастацтва верхняга палеаліту.
16. Агульная характарыстыка эпохі мезаліт.
17. Мастацтва мезаліту.
18. Агульная характарыстыка эпохі неаліт. Неалітычная рэвалюцыя.
19. Мастацтва неаліту.
20. Агульная характарыстыка эпохі энеаліт. Асноўныя культуры энеаліту Еўропы.

21. Мегалітычныя культуры ў Еўропе. Стонхендж.
22. Агульная характарыстыка эпохі бронзы.
23. Старажытна-ямная, катакомбная і зрубная культурна-гістарычныя супольнасці.
24. Культуры шарападобных амфар, шнуравой керамікі. Тшынецкая і сосніцкая культуры.
25. Індаеўрапейская праблема.
26. Культура палёў пахаванняў. Лужыцкая культура.
27. Мастацтва бронзавага веку.
28. Агульная характарыстыка жалезнага веку.
29. Гальштацкі перыяд.
30. Кельты і латэнская цывілізацыя.
31. Кімерыйцы, скіфы і сарматы па археалагічных даных.
32. Культуры балтаў ва Ўсходняй Еўропе.
33. Культуры фіна-ўграў ва Ўсходняй Еўропе.
34. Заходнееўрапейская сярэдневякоўе па археалагічных даных.
35. Праблема паходжання славян. Першыя славянскія культуры.
36. Узнікненне Русі па археалагічным даных. Гнёздаўскі курганны могільнік.
37. Старажытнаруская вёска.
38. Старажытнарускія гарады (паходжанне, забудова, рамяство, гандаль).
39. Манументальнае дойлідства гарадоў Старажытнай Русі.
40. Пісьменнасць паводле археалагічных даных.

# 1. АРХЕАЛОГІЯ ЯК НАВУКА, ЯЕ ПРАДМЕТ, МЕТАДЫ І ЎЗАЕМАСУВЯЗЬ З СУМЕЖНЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ

1.1. Вызначэнне археалогіі як навукі.
1.2. Гісторыя археалогіі.
1.3. Помнікі археалогіі як гістарычная крыніца. Віды археалагічных помнікаў.
1.4. Заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў.
1.5. Археалагічныя разведкі і раскопкі.
1.6. Культурны пласт і стратыграфія.
1.7. Камеральная апрацоўка археалагічнага матэрыялу.
1.8. Археалагічная культура.
1.9. Метады датавання ў археалогіі.
1.10. Тэорыі развіцця грамадства ў археалогіі.

**1.1. Вызначэнне археалогіі як навукі.** Археалогія – навука, якая вывучае гістарычнае мінулае чалавецтва па рэчавых помніках. Археалогія – гэта раздзел гістарычнай навукі. Асаблівую роль археалогія мае ў навуковай рэканструкцыі дапісьмовай гісторыі (99,998% усёй гісторыі чалавецтва). Паводле прадмета даследавання археалогія можа падзяляцца на першабытную (дапісьмовую) і протагістарычную (пісьмовую), а таксама антычную, сярэднявечную, індустрыяльную і інш. [10, с. 14 – 15]. Пры гэтым вызначэнне мяжы паміж "дагісторыяй" і "гісторыяй" вызначаецца вучонымі розных краін па-рознаму ў залежнасці ад часу з'яўлення пісьмовых крыніц.

Важнае значэнне ў вывучэнні першабытнай гісторыі мае этналогія. Прынцып рэканструкцыі мінулага з дапамогай этналогіі заснаваны на перакананні, што некаторыя рысы гаспадарскі, грамадскага ладу, матэрыяльнай і духоўнай культуры, засведчаныя ў традыцыйных грамадскіх супольнасцях сучаснасці, у далёкім мінулым былі характэрны для ўсяго чалавецтва. Археолаг выкарыстоўвае даныя этналогіі пасля глыбокага аналізу з улікам канкрэтнага гістарычнага кантэксту старажытнай эпохі. Акрамя этналогіі, важнымі крыніцамі вывучэння першабытнай гісторыі з'яўляюцца даныя лінгвістыкі, палеантрапалогіі [11, с. 62 – 64].

**1.2. Гісторыя археалогіі.** Узнікненне археалогіі пачалося з эпохі, калі людзі сталі разглядаць рэчавыя помнікі як сведчанні гісторыі чалавецтва. Першым народам, які звярнуў увагу на помнікі мінулага, былі грэкі. Герадот апісвае егіпецкія піраміды і пасяленні на па́лях на возеры Празіас ў Македоніі, матэрыяльную культуру скіфаў і старажытныя пахаванні кімерыйскіх цароў. У "Археалогіі" Фукідзіда (першыя 23 главы кнігі І) зроблена спроба шляхам аналізу старажытных звычаяў і рэчавых помнікаў рэканструяваць старажытную гісторыю Грэцыі [11, с. 10].

У эпоху элінізму шырокае распаўсюджванне атрымаў асаблівы від літаратуры – “перыэгесіс”, альбо апісанне вучонымі вандроўнікамі краін, гарадоў і галоўных помнікаў мінулага. Класічным творам перыэгетычнай літаратуры з’яўляецца “Апісанне Эліады” Паўсанія (ІІ ст. н. ч.). Зварот да мінулага выклікаў цікаўнасць да узораў старажытнай культуры. Пачалося калекцыянаванне старажытных рэчаў. Страбон (66 г. да н. ч. – 24 г. н. ч.) паведамляе, што ў яго час адбывалася разрабаванне старажытных грабніц ў Карынфе з мэтай здабычы прадметаў для продажу калекцыянерам. Ёсць звесткі аб збіранні ў Сярэднявеччы франкамі старажытнага рымскага посуду. Свецкія і царкоўныя дзеячы займаліся зборам калекцый старажытнага начыння, каштоўных камянёў, манет і інш. [11, с. 10].

У эпоху Адраджэння захапленне Антычнасцю ахапіла шырокія кругі грамадства. Імкненне да калекцыянавання асабліва праявілася ў Італіі ў апошніх дзесяцігоддзях XV ст. і асабліва ў XVI ст. Пачатак гэтаму захапленню паклалі папы Сікст IV і Юлій II. У 1506 г. папа Юлій II пабудаваў у Бельведэры ў Ватыканскім палацы спецыяльны двор для антычных статуй. У 1515 г. Леў X выдаў дэкрэт, які абавязваў кожную знойдзеную падчас раскопак рэч прадстаўляць папскаму ўраду. Папа Павел III заснаваў камісарыят старажытнасцяў і распачаў раскопкі ў церамах Каракалы. Апошнім папай-збіральнікам быў Юлій III, які памёр у 1555 годзе. Пасля яго антычнае мастацтва было прызнана заганным [11, с. 11].

Першыя спробы сістэматызацыі археалагічнага матэрыялу былі зроблены ў эпіграфіцы. Эпіграфіка, як вобласць археалогіі, першай аформілася як самастойная навука. У 1603 г. гейдэльбергскі прафесар галандзец Грутэр выдаў зборнік, які ўтрымліваў 12 тысяч надпісаў, пераважна на латыні. Бернард дэ Манфакон (1655 – 1741) надрукаваў шмат навуковых прац, сярод якіх найважнейшая – “Старажытнасці, прадстаўленыя і растлумачаныя ў малюнках” (у 15 тамах). У гэтай працы Манфакон аб’яднаў увесь разнастайны антыкварны матэрыял, абагульніў вынікі навуковых даследаванняў антыквараў розных краін і ўпершыню прадставіў грэчаскія і рымскія старажытнасці ў адзінстве [11, с. 11].

У 1711 г. пачаліся раскопкі Геркуланума, а ў 1748 г. – Пампеяў. Нягледзячы на тое, што спачатку яны насілі варварскі характар і суправаджаліся разбурэннем помнікаў, менавіта тут зарадзіліся ідэі навуковага падыходу да раскопак.

Больш за ўсё садзейнічалі прагрэсу класічнай археалогіі ў XVIII ст. сачыненні двух класікаў – графа Кэлюса (1692 – 1765) і Іагана Іоахіма Вінкельмана (1717 – 1768). Сямітомная праца Кэлюса “Зборнік егіпецкіх, этрусскіх, грэчаскіх і рымскіх старажытнасцяў” утрымлівае класіфікацыю

старажытных рэчаў па матэрыялу, мастацкіх формах і адметнасцях. Асноўная праца Вінкельмана – "Гісторыя мастацтва старажытнасці" паклала пачатак навуковаму даследаванню помнікаў антычнага мастацтва. Вінкельмана называлі "бацькам археалогіі", паколькі пад археалогіяй тады разумелі вывучэнне помнікаў мастацтва [11, с. 12].

У 1753 – 1756 гг. быў заснаваны і адчынены Брытанскі музей у Лондане, які стаў адным з самых вялікіх збораў археалагічных знаходак. У 1804 г. у Парыжы была заснавана Кельтская акадэмія (у 1814 г. Нацыянальнае таварыства антыквараў Францыі). У 1834 г. Грэцыя абвесціла ўсе знойдзеныя на яе тэрыторыі старажытнасці нацыянальнай спадчынай усіх элінаў [11, с. 15].

У XIX ст. была навукова абгрунтавана "сістэма трох вякоў". Зрабіў гэта дырэктар музея ў Капенгагене Крысціян-Юргенс Томсэн (1788 – 1865). Томсэн не вызначаў ніякіх дат, ён паказаў змену розных стадый развіцця ў вытворчасці прылад. "Сістэма трох вякоў" прадстаўлена ў 1816 – 1819 гг. Томсэн падзяліў прылады па матэрыялу, з якіх яны былі зроблены, і вызначыў адносную храналогію рэчаў. Атрымалася тры стадыі развіцця прылад працы – ад каменных да бронзавых і жалезных [11, с. 17].

Перыядызацыя "трох вякоў" аказала вялікі ўплыў на развіццё археалагічнай навукі ў Еўропе, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі. Яе прыхільнікамі з'яўляліся заснавальнікі Віленскага музея старажытнасцяў браты Тышкевічы, у прыватнасці Яўстафій Тышкевіч, які ў 1843 г. з мэтай археалагічнага даследавання наведаў Данію, Швецыю, Фінляндыю. Пералік калекцыі Віленскага музея дазваляе сцвярджаць, што прыярытэтным накірункам з'яўлялася не толькі збіранне ўласна літоўскіх і беларускіх старажытнасцяў, але і старажытнасцяў іншых краін – традыцыя, якая цалкам упісваецца ў сусветную практыку [3].

Сэр Джон Леббак (лорд Эвбюры) (1834 – 1913) аказаў значны ўплыў на развіццё археалогіі каменнага веку. У кнізе Леббака "Дагістарычны час" (1865) упершыню былі выкарыстаны тэрміны "палеаліт" і "неаліт".

Верхні палеаліт як асобную эпоху ў развіцці чалавецтва ўпершыню вылучыў Эдуард Лартэ (1801 – 1871). Перыядызацыю каменнага веку зрабіў вучань Лартэ Габрыэль дэ Марцільe (1821 – 1898). Паводле Марцільe, эпохі палеаліту атрымалі назву шэль, ашэль, мусцье, салютрэ, мадлен. У 1875 г. Марселіно дэ Саўтуола пачаў раскопкі пячоры Альтамір у Іспаніі, было распачата вывучэнне палеалітычнага наскальнага жывапісу. Напрыканцы XIX ст. актыўна пачалі раскопвацца помнікі антычнасці [11, с. 24 – 27].

Важныя адкрыцці былі зроблены падчас раскопак сталіцы старажытнай Асірыі – Нінэвіі – сэрам Осцінам Генры Лэйярдам (1817 –

1894), дзе было знойдзена больш 20 тыс. клінапісных таблічак [1, с. 143]. Адкрыццё бронзавага веку належыць шведскаму археолагу Оскару Мантэлеусу (1843 – 1921) [1, с. 163].

У 1871 г. Генрых Шліман (1822 – 1890) пачаў раскопкі старажытнай Троі на пагорку Гісарлык (Турцыя). Тут ён правёў чатыры палявыя экспедыцыі (1871 – 1873, 1879, 1882 – 1883, 1889). Паміж кампаніямі ён праводзіў раскопкі ў Мікенах і на Ітаке (1874 – 1876), у Архамэне (1880 – 1881), Цірынфе (1884 – 1885). У выніку 20-гадовых раскопак Шліман адкрыў невядомы дагэтуль Эгейскі свет дагамераўскай Грэцыі. Дзякуючы Шліману, археалогія стала самай папулярнай тагачаснай навукай у Еўропе [11, с. 28].

Англійскі археолаг сэр Артур Эванс (1851 – 1941) пачаў свае даследаванні на в. Крыт у 1900 г. Ён адкрыў рэшткі вялікага палаца, які назваў палацам Мінаса [11, с. 28]. Навуковец даказаў, што ў эпоху бронзавага веку Крыт з'яўляўся цэнтрам Эгейскай цывілізацыі.

У ХХ ст. былі зроблены важныя адкрыцці агульначалавечай спадчыны, сярод якіх варта вылучыць стаянкі першабытных людзей, даследаваных сям'ёй Лікі ва Ўсходняй Афрыцы (з 1959 г.) [10, с. 118 – 119]. Помнікамі археалогіі сусветнага значэння з'яўляюцца: адкрытая ў 1922 г. грабніца фараона канца XVIII дынастыі Тутанхамона (археолаг Г. Картэр); "падземнае войска" імператара Шы-Хуана, заснавальніка дынастыі Цынь, якое раскопваецца з 1974 г.; грабніца македонскіх цароў, у тым ліку Філіпа II (археолаг Маноліс Андранікас, 1977 г.); адкрыццё "лёдавага чалавека" у аўстрыйскіх Альпах, які жыў 3300 гадоў да н. ч. (1991 г.) і шматлікія іншыя [6]. Вялікія поспехі дасягнуты ў вывучэнні антычнай, кельцкай, славянскай і іншай археалогіі. Археалагічныя даследаванні праводзяцца ў зоне вечнай мерзлаты, у пустынях, пад вадой, на горных плато і паўсюдна робяцца важныя гістарычныя адкрыцці.

**1.3. Помнікі археалогіі як гістарычная крыніца. Віды археалагічных помнікаў.** Асноўныя тыпы гістарычных крыніц – гэта пісьмовыя і рэчавыя. Паводле Л. М. Пушкарова, існуюць таксама этнаграфічныя, фальклорныя, моўныя, кінафотадакументы і фонадакументы [2, с. 277]. Археалогія мае справу з рэчавымі крыніцамі, паводле якіх вызначаецца тэхналагічны ўзровень равіцця грамадства. Уявіць гэтае грамадства ў цэлым магчыма толькі шляхам навуковай рэканструкцыі, дзеля чаго неабходна выкарыстоўваць розныя віды гістарычных крыніц. З дапамогай адных рэчавых крыніц можна высветліць толькі важнейшыя змены ў развіцці прадукцыйных сіл, агульную карціну міжплемянных сувязяў і адносін. Аднак канчатковая мэта археолага – аднаўленне гісторыі па археалагічных даных, таму археолаг – гэта ў першую чаргу гісторык [11, с. 61].

Археалагічныя помнікі вельмі шматлікія. Розныя і іх класіфікацыі. Агульнапрызнаным з'яўляецца іх раздзяленне на два асноўных віды: ***пасяленні і пахавальныя збудаванні***. Да іншых відаў належаць ***вытворчыя збудаванні і помнікі духоўнага жыцця***. Яны могуць знаходзіцца як у рысе пасяленняў (рамесныя майстэрні, храмы, алтары), так і за іх межамі (горныя выпрацоўкі, каменаломні, арашальныя сістэмы, капішчы, наскальныя выявы, каменныя стэлы і інш.).

***Пасяленні.*** "Пасяленне" – вельмі шырокае паняцце. Ім пазначаюць любое больш-менш працяглае пражыванне людзей на адным месцы. Па спосабу ўладкавання яны падзяляюцца на *неўмацаваныя* і *ўмацаваныя*. Першыя – гэта стаянкі і селішчы. Стаянкі – гэта, як правіла, месцы жыцця і дзейнасці першабытных людзей (палеалітычныя стаянкі, пячорныя стаянкі, неалітычныя стаянкі, стаянкі эпохі бронзы). Селішчы – гэта неўмацаваныя пасяленні больш позніх эпох, у тым ліку Сярэднявечча.

Да ўмацаваных пасяленняў належаць *гарадзішчы*. Паняцце "гарадзішча" дастаткова шырокае. Спачатку гарадзішчамі называліся рэшткі старажытнарускіх гарадоў, зараз пад тэрмінам разумецца больш шырокае кола помнікаў (руіны антычных гарадоў, сярэднеазіяцкіх крэпасцей, замкаў і інш. помнікаў). Галоўнай асаблівасцю гарадзішчаў з'яўляюцца рэшткі абарончых умацаванняў (валоў, ірвоў, і іншых фартыфікацыйных збудаванняў). Часам сустракаюцца пасяленні змешанага характару. Напрыклад, старажытнабеларускія гарады мелі *дзяцінец*, антычныя – *акрополь*, сярэднеазіяцкія – *цытадэль*. Усё гэта – умацаваныя часткі. Вакол гэтых цэнтраў размяшчаліся неўмацаваныя часткі (напрыклад, для старажытнабеларускага горада звычайна сістэма дзяцінец-пасад) [9, с. 5 – 6].

*Стаянкі.* Большасць палеалітычных пасяленняў – гэта стаянкі, напрыклад, Тэра Амата (Францыя, эпоха ашэль), Кіік-Коба і Шайтан-Коба (Крым, Украіна, эпоха мусцье), Бердыж і Юравічы (Беларусь, верхні палеаліт).

*Селішчы.* З эпохі мезаліту адбываецца дыферэнцыяцыя пасяленняў, што звязана з умовамі развіцця асобных культур. На Блізкім Усходзе і поўдні Сярэдняй Азіі ў эпоху мезаліту з'яўляюцца пасяленні з глінабітнымі дамамі – Чатал-Хююк (Турцыя), Джэйтун (Туркменія) і інш. Для жалезнага веку Беларусі звычайны падзел: умацаванае гарадзішча – неўмацаванае паселішча. У антычную эпоху і сярэдневякоўе практычна паўсюль з'яўляюцца выразныя адрозненні паміж сельскім пасяленнем (селішча) і гарадскім (гарадзішча, град).

*Гарадзішчы.* Некаторыя старажытныя гарадзішчы з'яўляліся пачатковымі пасяленнямі на месцы будучых гарадоў (Полацк, Віцебск, Браслаў і

інш.). Гэтыя гарадзішчы нярэдка захоўвалі сваю назву і пасля станаўлення горада. Больш складаным з’яўляецца справа з гарадамі разбуранымі і закінутымі яшчэ ў старажытнасці. Многія з іх ідэнтыфікуюцца з пісьмовымі крыніцамі. Але ёсць выпадкі, калі адкрытае археолагамі гарадзішча існуе пад назвай сучаснага паселішча, паблізу якога яно размешчана, напрыклад, гарадзішча Свіла 1 (Беларусь), гарадзішча на востраве Беразань (Украіна, магчымы старажытны Барысфен) і інш.

***Пахавальныя збудаванні.*** Старажытныя могілкі (некропалі ці могільнікі), калі яны належалі аседлай культуры, заўсёды размяшчаюцца побач з пасяленнямі. Качавыя культуры, як правіла, вывучаюцца па могільніках, таму што сляды стаянкі (зімніка) выявіць вельмі складана. Формы пахавальных збудаванняў вельмі разнастайныя.

*Грунтовыя пахаванні* не маюць якіх-небудзь выразных прыкмет на паверхні: яны ўпершыню з’яўляюцца ў мусцьерскі час у пячорах і гротах (Цешык-Таш, Узбекістан; Шанідар, Ірак і інш.), вядомы ў верхнім палеалітце (Мальта, Сунгір і інш.) і шырока распаўсюджаны ў эпоху бронзы. Магчыма, пасля пабудовы грунтовыя могільнікі мелі нейкія прыкметы на паверхні, аднак да нашага часу яны не захаваліся [9, с. 8].

*Курганы.* Пачатковае значэнне цюркскага тэрміна “курган” – “гарадзішча”, а дакладней – крэпасць. У гэтым значэнні яно сустракаецца ў летапісах да XV ст. З тых часоў і да нашых дзён яно мае значэнне “магільны холм”.

Курганы – гэта вельмі вялікае кола помнікаў, таму археолагі дэталізуюць назву: “доўгія курганы”, “круглыя курганы”, “каменныя курганы” і інш. Памеры курганоў вельмі розняца: ад 60 – 70 м у дыяметры і 8 – 10 м вышынёй, да 2 – 3 м дыяметра і 0,3 – 0,5 м вышынёй. Адзінкавыя курганы сустракаюцца рэдка, звычайна яны ўтвараюць *могільнікі.*

*Дальмены, менгіры і кромлехі.* З гэтых трох груп помнікаў дакладна вядома, што толькі дальмены (ад брэтон. tol – стол, men – камень) з’яўляюцца пахавальнымі збудаваннямі. Дальмены ўяўляюць сабой вялікія збудаванні з буйных (да 2 – 3 м) камянёў, якія нагадваюць скрыню, зверху перакрытую плоскай каменнай плітой. Яны з’явіліся ў эпоху бронзы і сустракаюцца шырока на Атлантычным узбярэжжы Еўропы, Паўночнай Афрыцы, на Каўказе і ў Крыме [9, с. 9].

Адносна менгіраў (брэтон. men – камень, hir – доўгі) і кромлехаў (брэтон. krom – круглы, lech – камень) дакладна не высветлена іх прыналежнасць да пахавальных помнікаў. Менгіры – гэта высокія (3 – 4 м) каменныя стэлы, якія нярэдка аздабляліся выявамі. Кромлехі – круглыя агароджы з камянёў. Менгіры і кромлехі распаўсюджаны шырока ў эпоху

неаліту і бронзы. Вядомы на Атлантычным узбярэжжы, Каўказе, у Сярэдняй Азіі, Паўднёвай Сібіры і інш.

*Кенатафы*. Кенатафам у археалогіі называецца курган з усімі знешнімі прыкметамі пахавальнага збудавання, але без усялякіх слядоў пахавання. Верагодна, кенатафы будаваліся ў тым выпадку, калі чалавек загінуў далёка ад дома.

*Грабніцы, маўзалеі і склепы*. Гэтая катэгорыя помнікаў з'яўляюцца рэдкімі. Іх будавалі для асоб, якія займалі адметнае сацыяльнае становішча. Самыя вядомыя з іх – піраміды фараонаў у Егіпце, грабніцы ханьскіх і мінскіх імператараў у Кітаі, усыпальні інкскіх правадыроў і інш.

*Помнікі вытворчай дзейнасці*. Гэта ў першую чаргу старажытныя шахты, арашальныя сістэмы, закінутыя майстэрні і інш.

*Скарбы*. У археалогіі скарб – гэта не толькі каштоўныя рэчы, закапаныя ў зямлі, схаваныя ў мурах і інш. Скарб – гэта ў тым ліку і бронзавыя, шкляныя, каменныя рэчы, якія мелі вялікую каштоўнасць у эпоху свайго абарачэння.

*Архітэктурныя і выяўленчыя помнікі*. Іх вывучэнне палягае на сутыку археалогіі і мастацтвазнаўства. Аднак любое рэстаўрацыйнае даследаванне помнікаў архітэктуры немагчыма без археалагічных раскопак.

*Каменныя стоды і петрогліфы*. Каменныя стоды нярэдка не маюць адрозненняў ад менгіраў. Тым не менш, у шэрагу выпадкаў гэта асобная група помнікаў. Петрогліфы (лат. petros – камень, glyphos – знак) сустракаюцца шырока.

*Падводныя помнікі*. Да іх належаць затанулыя караблі, старажытныя хвалярэзы, гарады, якія ў сілу розных абставін апынуліся пад вадой. Даследаванне і ахова такіх помнікаў рэгламентуюцца ЮНЭСКА [9, с. 11 – 13].

**1.4. Заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў.** *Заканадаўчыя палажэнні* аб ахове археалагічных помнікаў у Рэспубліцы Беларусь у сферы аховы культурнай спадчыны вызначаюцца комплексам нарматыўных актаў. Сярод галоўных Канстытуцыя РБ, Крымінальны кодэкс і Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях, законы "Аб культуры" (1991), "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1992), "Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1998, 2002) [8, с. 8].

Канвецыя ЮНЭСКА "Аб абароне культурных каштоўнасцяў ў выпадку ўзброенага канфлікту" (1954 г.) пад паняццем "культурныя каштоўнасці" пазначае вельмі шырокае кола помнікаў. "Рэкамендацыі аб ахове культурных каштоўнасцей, якім пагражае небяспека ў выніку правядзення грамадскіх і прыватных работ" (1968) вызначаюць пад паняц-

цем “культурныя каштоўнасці” помнікі, якія былі выяўлены падчас работ, дапасоўваюць да іх сучасныя ландшафты, архітэктурныя аб’екты, якія маюць мастацкую каштоўнасць [8, с. 9].

У адпаведнасці з Канвецыяй аб ахове сусветнай культурнай спадчыны (1972 г., ратыфікавана ў РБ ў 1988 г.) у паняцце “культурная спадчына” уваходзяць тры катэгорыі аб’ектаў: помнікі, ансамблі, славутыя месцы. Пад “археалагічнай спадчынай” разумеюцца “нерухомыя і рухомыя аб’екты матэрыяльнай культуры, для даследавання і захавання якіх патрабуюцца спецыяльныя метады археалагічнай навукі” [8, с. 9].

У мэтах прапаганды і аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь была прынята Пастанова Савета Міністраў № 651 ад 22 мая 2002 г. аб зацвярджэнні “Палажэння аб ахове археалагічных аб’ектаў падчас правядзення земляных і будаўнічых работ”. Гэтае пастанаўленне рэгламентуе абавязковыя мерапрыемствы па ахове археалагічных аб’ектаў на любой стадыі земляных і будаўнічых работ (пракладка нафта- і газапровадаў, камунікацый, будаўніцтва дамоў, гідратэхнічных і іншых пабудоў, дарог, распрацоўка кар’ераў) [8, с. 13]. На практыцы гэта азначае, што ўсім гэтым работам папярэднічаюць археалагічныя раскопкі ці яны суправаджаюцца археалагічным наглядам.

**1.5. Археалагічныя разведкі і раскопкі.** ***Археалагічная разведка*** – навуковае абследаванне помнікаў археалогіі з мэтай выяўлення і першаснага вывучэння новых, а таксама асэнсавання на сучасным узроўні ужо вядомых літаратурных і архіўных звестак аб іх. Праводзіцца паводле Дазволаў (Адкрытых лістоў) у маршрутных умовах колькасцю не менш за 2 чалавекі, сумесна з мясцовымі жыхарамі. Адкрытыя помнікі фатаграфуюцца, наносяцца на планы маштабам 1 : 500 см ці 1 : 1000 см. Афармляюцца пашпарты, у якіх указваюцца мясцовыя назвы ўрочышчаў, рэк, азёр, прыводзяцца прывязкі да бліжэйшых населеных пунктаў. Апытанне мясцовых жыхароў мае вялікае значэнне, паколькі на тэрыторыі Беларусі многія старажытныя помнікі, у прыватнасці курганы, маюць мясцовыя назвы “французскія могілкі”, “шведскія могілкі”, “валатоўкі”, “капцы” і інш., гарадзішчы нярэдка фігуруюць пад назвамі “княжая гара”, “царкавішча”, “гарадзішча” і інш. Усе яны маюць легенды і паданні, звязаныя з гэтымі назвамі. У выніку археалагічнай разведкі ствараюцца археалагічныя карты пэўных тэрыторый з мэтай уліку, аховы і даследавання адкрытых помнікаў.

***Візуальныя разведкі*** ставяць мэтай вызначэнне найбольш тыповых знешніх прыкмет археалагічных помнікаў. Так, на тэрыторыі Беларусі стаянкі эпохі палеаліту і мезаліту знаходзяцца, як правіла, на другой над-

поймавай тэрасе на вышыні 10 – 30 м над летнім узроўнем вады ў рэках, больш познія помнікі – на першай тэрасе вышынёй да 10 м [12, с. 49]. Могільнікі могуць знаходзіцца ў розных месцах, іх фіксацыя магчыма па знешніх прыкметах ці з дапамогай іншых метадаў археалагічнай разведкі.

Візуальная разведка дазваляе вызначыць размяшчэнне паселішчаў жалезнага веку і Сярэднявечча на месцы ўзараных палёў. Культурны пласт паселішчаў, як правіла, мае колер, які адрозніваецца ад агульнага фону ўзараных палеткаў. На паверхні ворыва можна знайсці рэчы, пераважна фрагменты керамічных вырабаў. Гарадзішчы жалезнага веку, як правіла, размешчаны на пагорку, і маюць плоскую, як бы зрэзаную вяршыню, цёмны, амаль чорны культурны пласт і рэшткі абарончых валоў па краю пляцоўкі.

***Аэрафотаздымка*** – гэта першаснае даследаванне мясцовасці з паветра пры дапамозе фота- ці відэакамеры. Падчас аэрафотаразведкі праводзіцца фотаздымка ландшафта ў трох вымярэннях (стэрэаздымка). З вышыні птушынага палёту бачна тое, чаго нельга заўважыць з паверхні зямлі. Напрыклад, старажытныя аб'екты можна заўважыць па колеру расліннасці. Так, вышыня травянога покрыва на розных участках поля неаднолькавая, там, дзе пад зямлёй знаходзіцца засыпаная гумусам яма – вышыня травянога покрыва будзе большая, наадварот, яма, запоўненая цагляным друзам, на паверхні будзе адлюстравана меншай па вышыні расліннасцю. Метад вельмі важны ў г. зв. аграрнай археалогіі пры даследаванні старажытных меліярацыйных сістэм, палёў і інш. З дапамогай гэтага метаду ў 1956 г. быў адкрыты этрускі горад Спіна, без правядзення раскопак быў зняты план рымскай віллы у Дытчлэй каля Шэрбюры (Оксфардшыр, Велікабрытанія), з 1945 г. у Італіі было адкрыта звыш 200 неалітычных пасяленняў, дзесяткі сярэднявечных пахаванняў, старажытныя палі, дарогі і інш. [11, с. 74].

***Электраразведка і магнітаразведка.*** Дазваляюць вызначыць аб'екты, якія знаходзяцца ў пласце глебы і нават ніжэй яго. Тым самым значна эканоміцца час на пошук макрааб'ектаў (рэштках абарончых муроў, падмуркаў будынкаў, розных прадметаў і інш.).

*Метад электраразведкі* заснаваны на ўласцівасці зямлі праводзіць электрычны ток. Аднак кожная структура праводзіць ток па-рознаму (горныя пароды, гліна, пясок, глеба). Гэта залежыць ад удзельнага супраціўлення рэчыва. Электраразведавальная апаратура вымярае супраціўленне тока, які прапускаецца паміж уведзенымі ў зямлю электродамі. Калі паміж электродамі ў зямлі няма ніякіх інародных уключэнняў, то супраціўленне будзе адпавядаць характару глебы. Калі супраціўленне большае ці меншае,

значыць у зямлі схавана іншае плотнае цела (напрыклад, рэшткі каменнай ці цаглянай муроўкі) [9, с. 45 – 46].

*Прынцып магнітаразведкі* заснаваны на добра вядомым эфекце адхілення магнітнай стрэлкі пры судакрананні з металічным прадметам. Прыборы для магнітаразведкі зробленыя такім чынам, што яны вымяраюць не адхіленні магнітнай стрэлкі, а велічыню напружанасці магнітнага поля зямлі ў канкрэтным месцы. У розных месцах планеты напружанне магнітнага поля рознае, яно вызначана для кожнага рэгіёна. Аднак на яго фоне могуць узнікаць анамаліі, менавіта там, дзе на рознай глыбіні залягаюць прадметы, рэшткі вогнішчаў, засыпаныя ямы і інш. Гэтая розніца фіксуецца магнітометрам і дазваляе іх выявіць [9, с. 47].

***Падводная разведка*** і ***падводная археалогія*** – гэта галіна археалогіі, якая займаецца вывучэннем старажытных аб’ектаў, затопленых вадой. На тэрыторыі Беларусі знаходзяцца каля 100 гідраархеалагічных помнікаў. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць месцы пераправы войскаў праз рэкі. Вада выдатна кансервуе арганіку і металічныя рэчы, дзякуючы гэтаму са дна вадаёмаў нярэдка выпадкова падымаюцца розныя старажытныя рэчы: ад костак маманта эпохі палеаліту да сярэдневяковай зброі. Сусветны вопыт даследавання падводнай археалагічнай спадчыны даволі вялікі. Распрацаваны методыкі пошуку затанулых караблёў, гарадоў, якія апынуліся ў вадзе, асобных артэфактаў. Вядомы прыклады, калі на паверхню падымаліся цэлыя караблі, напрыклад, шведскі карабель XVII ст. “Ваза”, які зараз экспануецца ў музеі Стакгольма [7, с. 76 – 79].

Вынікі археалагічных разведак прадстаўляюцца ў археалагічных справаздачах і навуковых публікацыях. Інфармацыя аб археалагічных помніках сістэматызуецца і, па меры накаплення матэрыялаў, публікуецца ў зводах археалагічных помнікаў, археалагічных картах. Найбольш поўны і сістэматызаваны даведнік культурнай і гістарычнай спадчыны Беларусі пабачыў свет у 1984 – 1988 г. у Мінску пад назвай “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”. Выданне налічвае 7 тамоў (8 кніг) і ўключае 14322 артыкулы, у тым ліку 131 карту археалагічных помнікаў. У кнігах серыі “Памяць” (выдаецца з 1985 г.) утрымліваюцца звесткі аб найбольш значных помніках археалогіі па кожнаму раёну Рэспублікі Беларусь.

На жаль, многія выдадзеныя археалагічныя карты з’яўляюцца даведнікамі для г. зв. “чорных” археолагаў, якія наўмысна разбураюць помнікі археалогіі з мэтай здабычы рэчаў для продажу і калекцыянавання. Таму кожны прафесійны гісторык павінен усведамляць сваю адказнасць па захаванню археалагічнай спадчыны, якая з’яўляецца незваротнай, і неадкладна рэагаваць на факты разбурэння культурнага пласта. Пры выяўленні фактаў

несанкцыянаваных раскопак неабходна тэрмінова звярнуцца ў мясцовыя органы ўлады (аддзелы культуры гарвыканкамаў, райвыканкамаў, сельскія саветы) ці ў міліцыю. Падчас сустрэч з людзьмі, зваротаў да сродкаў масавай інфармацыі, неабходна ўсяляк папярэджваць аб недапушчальнасці самавольных раскопак, прапагандаваць ідэю захавання археалагічнай спадчыны.

Дазвол, альбо Адкрыты ліст – гэта афіцыйны дакумент, які выдаецца Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на права правядзення археалагічных раскопак і разведак. Усе самавольныя раскопкі без Дазвола забаронены. У залежнасці ад характару і маштабу работ Дазволы бываюць чатырох форм. Форма № 1 дазваляе даследчыку праводзіць любыя віды археалагічных раскопак і тапаздымку плана аб’ектаў на вызначаным археалагічным помніку (ці некалькіх пазначаных у Дазволе помніках). Форма № 2 дазваляе праводзіць археалагічную разведку з частковым раскрыццём невялікіх участкаў культурнага пласта (не больш 24 м$^2$). Форма № 3 дае права разведак без правядзення раскопак, дазваляецца паверхневы збор пад’ёмнага матэрыяла, здымкі плана і фатаграфаванне аб’ектаў. Форма № 4 выдаецца найбольш вопытным археолагам на права правядзення экстраных выратавальных работ у зоне будаўніцтва, пабудовы ГЭС, пракладкі дарог, траншэй і інш. Дазвол выдаецца на адзін каляндарны год. Археолаг мае права атрымання Дазволу па форме № 1 толькі пасля правядзення работ па форме № 3 і № 2, г. зн. фактычна толькі пасля абароны справаздач на трэці год паспяховай самастойнай працы.

Археалагічныя раскопкі праводзяцца на падставе Дазволаў (Адкрытых лістоў), выдадзеных Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і зарэгістраваных ва Ўпраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Савеце міністраў РБ. Дазвол выдаецца на імя аднаго даследчыка (Дадатак 1). Даследчык не мае права перадачы правоў па Дазволу іншым асобам. Парадак правядзення і выбар метадаў археалагічных раскопак рэгламентаваны Інструкцыяй (гл. падрабязны разгляд методыкі і паслядоўнасці ўсіх этапаў раскопак у дадатку 2). Фінансаванне археалагічных раскопак ажыццяўляе арганізацыя, супрацоўнік якой атрымаў на сваё імя Дазвол.

Археалагічная справаздача аб раскопках утрымлівае наступныя раздзелы: першасная інфармацыя аб помніку, сістэматызацыя матэрыялаў археалагічнага даследавання асобы, якая атрымала Дазвол, лабараторная апрацоўка матэрыялаў. Складанне навуковай справаздачы ў Рэспубліцы Беларусь рэгламентавана Інструкцыяй (Дадатак 2). Справаздача абмяркоўваецца спачатку на пасяджэнні адпаведных аддзелаў Інстытута гісторыі,

пасля зацвярджаецца Палявым камітэтам Інстытута гісторыі. Палявы камітэт складаецца з найбольш аўтарытэтных і дасведчаных спецыялістаў-археолагаў з ліку супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Справаздача можа быць вернута аўтару на дапрацоўку. Дазвол на правядзенне археалагічных даследаванняў у бягучым годзе можа быць выдадзены толькі пасля належнага афармлення справаздачы і выпраўленні ўсіх заўваг. Навуковая справаздача перадаецца на захаванне ў архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі і з'яўляецца важнай гістарычнай крыніцай.

**1.6. Культурны пласт і стратыграфія.** Культурны пласт – гэта прынятая ў археалогіі і геалогіі назва пласта зямлі, які ўтварыўся ў выніку жыцця і дзейнасці чалавека. Культурны пласт мае сваю кансістэнцыю (гліна, гумус, вуголле, пясок, трэскі, гной, будаўнічы друз і інш.), структуру (шчыльную, рыхлую, камкаватую і інш.), часам спецыфічны пах. У культурным пласце захоўваюцца рэшткі жытлаў, гаспадарчыя пабудовы, помнікі манументальнага дойлідства, прадметы матэрыяльнай культуры. На фарміраванне пласта паўплывае інтэнсіўнасць жыцця і род дзейнасці людзей, працягласць пражывання, знешнія абставіны (войны, надвор'е) і іншыя фактары [5, с. 356].

*Стратыграфія.* Вывучэнне культурных напластаванняў стварыла асобую групу метадаў, якія называюцца стратыграфічнымі (лац. stratum – пласт). Стратыграфія – гэта метад вызначэння адноснай храналогіі помніка па размяшчэнні яго культурных напластаванняў.

Існуе вертыкальная і гарызантальная стратыграфія. Вертыкальная стратыграфія – гэта вызначэнне храналогіі прапластак ад больш ранняй да больш позняй у вертыкальным разрэзе культурнага пласта. Гарызантальная – вызначэнне, якая частка аднапластнага пасялення ўзнікла раней, а якая пазней. Пры пабудове адноснай храналогіі і перыядызацыі выкарыстоўваецца "стратыграфічная калонка" – паслядоўнасць пластоў з "ніжняй" датай (самай старажытнай) і "верхняй датай" – самай позняй [9, с. 16 – 17].

**1.7. Камеральная апрацоўка археалагічнага матэрыялу.** Камеральная апрацоўка археалагічнага матэрыяла – важны этап археалагічнага даследавання. Пачынаецца ў працэсе раскопак. Пасля раскопак усе рэчы пераглядаюцца, групіруюцца паводле матэрыялу, з якога яны выраблены, асобна апрацоўваюцца масавыя і індывідуальныя знаходкі. Складаецца ці ўдакладняецца вопіс масавых і індывідуальных знаходак (гл. Дадатак 2). Замалёўваюцца ўсе найбольш цікавыя артэфакты, усе індывідуальныя знаходкі. Адбіраюцца рэчы, якія патрабуюць кансервацыі ці рэстаўрацыі. Напрыклад, жалезныя вырабы апрацоўваюцца рэстаўратарамі і пасля кан-

сервацыі адмысловымі хімічнымі рэчывамі перадаюцца на захоўванне ці экспанаванне ў музей. Працэс рэстаўрацыі суправаджаецца фотафіксацыяй усіх асноўных стадый працэсу. Рэчавы комплекс апісваецца (гл. Дадатак 2), пасля чаго робяцца археалагічныя класіфікацыі і тыпалогіі артэфактаў. Паколькі археолаг, як правіла, мае справу з вялікай колькасцю матэрыялаў, то працэс яго класіфікацыі з'яўляецца вельмі важным. Напрыклад, пасля аднаго сезону раскопак у Полацку даводзіцца мець справу з 10 – 30 тыс. масавых знаходак. Пасля правядзення камеральнай апрацоўкі археалагічнага матэрыялу археолаг можа зрабіць гістарычныя высновы аб ступені развіцця тэхналогій, стадыі развіцця грамадства, культурных сувязях і г. д. у вывучаемы час.

Трасалогія і мікраструктурны аналіз дазваляюць высветліць асаблівасці ўжывання тых ці іншых прылад працы, склад матэрыялу, асаблівасці тэхналогій яго ўтварэння. Трасалогія вывучае сляды ўздзеяння іншародных прадметаў на матэрыял, а мікраструктурны аналіз дазваляе вызначыць склад матэрыялаў. Гэтымі метадамі ўсебакова даследаваны многія унікальныя артэфакты.

Мадэляванне ў археалогіі залежыць ад метадалагічнай асновы. Яно прысутнічае на ўсіх этапах археалагічнага даследавання. Вельмі важным з'яўляецца вызначэнне прычыны назіраемай з'явы. Археолаг стварае мадэлі, якія тлумачаць тыя ці іншыя з'явы. Падчас археалагічнага мадэлявання трэба ўлічыць усе дробныя факты, каб стварыць агульную карціну. Бывае, маленькае неўлічанае звяно інтэрпрытацыі перакрэслівае ўсю логіку пабудовы мадэлі [9, с. 223 – 225]. Мадэляванне неабходна для стварэння гістарычых высноў.

**1.8. Археалагічная культура.** Археалагічная культура – гэта гістарычная агульнасць археалагічных помнікаў, якія існавалі на акрэсленай тэрыторыі прыкладна ў адзін час і аднастайныя па сваёй матэрыяльнай культуры, але істотна адрозніваюцца ад аднachасовых помнікаў суседніх абласцей [4, с. 47].

Археалагічная культура і этнас – гэта паняцці, якія не заўсёды супадаюць. Падчас гістарычных рэканструкцый археолаг звяртаецца да этнаграфічнага матэрыялу. Заўважана, што мяжа рассялення эскімосаў Амерыкі цалкам супадае з межамі гаспадарча-культурнай арктычнай вобласці. Эскімосы адзіныя ў расавых адносінах. Дыялектнае члянненне мовы не перашкаджае камунікаваць прадстаўнікам эскімосаў з Аляскі і Грэландыі. Адваротны прыклад: індэйцы пуэбла. Іх культура да дробязяў падобная на ўсім арэале пражывання: ад паўднёва-заходніх штатаў ЗША да Паўночнай Мексікі. Аднак гавораць яны на чатырох мовах юта-ацтэкскай

групы. У многіх сучасных этнасаў падобная матэрыяльная культура, але мовы – розныя (латышы і эстонцы, узбекі і таджыкі, чувашы і марыйцы і інш.) [11, с. 80].

Для разумення характару першабытнага грамадства археолагі звяртаюцца да даных этнаграфіі, каб вызначыць спосаб жыцця і асаблівасці матэрыяльнай культуры этнасаў, якія існавалі ў старажытнасці ў падобных умовах. Гэта заканамерна, паколькі асноўныя рысы гаспадарчай дзейнасці, адносіны ўласнасці, сваяцкія сувязі, правілы шлюбу і некаторыя ідэалагічныя універсаліі аўстралійцаў, афрыканцаў ці амерыканскіх індэйцаў былі калісці ўласцівы і народам першабытнай Еўропы [9, с. 230]. Антрапалагічныя даныя дазваляюць дэталізаваць перыядызацыю першабытнага грамадства, вызначыць працоўнае і сацыяльнае жыццё продкаў, узнікненне і развіццё мыслення і мовы. Метады антрапалагічнай навукі дазваляюць вызначыць палеадэмаграфію старажытнага насельніцтва, вытокі развіцця чалавецтва, суадносіны біялагічных і сацыяльных супольнасцей, аўтахтоннасць насельніцтва і інтэнсіўнасць міграцый [9, с. 232].

Даныя лінгвістыкі дазваляюць вызначыць сувязь археалагічнай культуры з этнічнай прыналежнасцю старажытнага насельніцтва – стваральнікам гэтай культуры. Лінгвіст і археолаг выкарыстоўваюць рэтраспектыўны падыход. Археолаг найчасцей мае справу не з канкрэтнай мовай (вызначыць якую паводле даных археалогіі ў дапісьмовы перыяд проста немагчыма), а з арэаламі распаўсюджвання моўных сем’яў (індаеўрапейская, фіна-угорская, алтайская і інш.) [9, с. 234].

**1.9. Метады датавання ў археалогіі.** Метады датавання археалагічных аб’ектаў падзяляюцца на тры групы: гісторыка-філалагічныя (сведчанні пісьмовых і выяўленчых крыніц), археалагічныя (стратыграфічны, тыпалагічны і інш.) і прыродазнаўча-навуковыя (археамагнітны, тэрмалюмінісцэнтны і інш.) [9, с. 178].

У археалогіі выкарыстоўваюцца дзве сістэмы датавання: адносная і абсалютная.

***Адносная храналогія*** – гэта вызначэнне якая з двух і больш рэчаў з’яўляецца найбольш старажытнай. Адносная храналогія выкарыстоўвае некалькі метадаў, важнейшыя з іх – гэта тыпалогія і стратыграфія. Тыпалогія асноўных рэчаў дазваляе супаставіць кожную знойдзеную рэч з ужо вядомымі і вызначыць, такім чынам, час яе адноснага датавання. Стратыграфічны метад дазваляе вызначыць датаванне рэчы па пласту, у якім яна знойдзена. Пласт звычайна ўтрымлівае ніжняю і верхняю даты, якія і вызначаюць інтэрвал існавання знаходкі.

Існуюць і іншыя метады адноснага датавання.

***Астранамічны***. Гэты метад з'яўляецца пераходным ад адноснай да абсалютнай храналогіі. Паводле астранамічнага метаду вызначаюцца перыяды кліматычных зменаў у залежнасці ад актыўнасці сонца, накірунка арбіты Зямлі і іншых прычын. Напрыклад, нямецкі метэаролаг В. Коппэн зрабіў адкрыццё, што перыяды павелічэння сонечнай актыўнасці звязаны з міжледавіковымі перыядамі, такім чынам, робяцца спробы датавання ледавіковых перыядаў палеаліту [11, с. 66].

***Метад пылковага аналізу***. Некаторыя глебы (торф, пясок) добра захоўваюць пылок раслін. Мікраскапічным аналізам магчыма вызначыць віды раслін і склад флоры той ці іншай эпохі. Вучоныя вызначаюць, да якой эпохі належыць той ці іншы пласт торфа. Паводле пылковага аналізу вызначаны змены клімату ў Еўропе ў пасляледавіковы перыяд [11, с. 66].

***Метад хімічнага датавання.*** Косткі, якія захоўваюцца ў зямлі, успрымаюць з глебавых вод фтор. Чым больш старажытная костка, тым больш яна захоўвае фтора. Косткі, узрост якіх 1,5 – 2 тыс. гадоў, маюць 0,3 – 0,5% фтора. Верхнепалеалітычныя – каля 1%, ніжнепалеалітычныя – 2%.

***Метад па сапастаўленні ўзроста костак з дапамогай хуткасці гука.*** Косткі, якія праляжалі ў зямлі больш 500 гадоў удвая запавольваюць хуткасць праходжання праз іх гуку [11, с. 68].

***Метад вымярэння ўзроўня марской паверхні*** быў прапанаваны геолагамі. Заснаваны на ўласцівасці розных участкаў зямной паверхні павышацца альбо паніжацца над узроўнем мора ў ледавіковы і пасляледавіковы час. Прыстасаванне чалавека да гэтых змен фіксуецца археолагамі [11, с. 68].

***Абсалютная храналогія*** – гэта вызначэнне ўзроста помніка ў каляндарных датах (дзень, год, стагоддзе, тысячагоддзе). Тут выкарыстоўваюцца шмат метадаў.

Важнейшы метад абсалютнага датавання – **дэндраханалагічны**. Заснаваны на вызначэнні ўзросту помніка па гадавых колцах дрэў. Паводле дэндраханалогіі можна дакладна (да 1 года) вызначыць час, калі дрэва было зрублена [11, с. 68]. Метад актыўна выкарыстоўваецца ў Еўропе, у прыватнасці, расійскімі археолагамі вызначаны дакладны час існавання драўляных ярусаў забудовы Ноўгарада. Наўгародскі вопыт у справе датавання помнікаў археалогіі вельмі багаты, распрацаваныя інтэрвалы датавання асобных рэчаў з'яўляюцца эталоннымі для шматлікіх помнікаў Паўночнай Русі.

Метад ***палеамагнетызма*** заснаваны на ўласцівасці гліны захоўваць намагнічанасць. Гліна захоўвае інфармацыю аб магнітным полі Зямлі ў час абпалу. Вызначаецца магнітнае поле керамікі, якое супастаўляецца з магнітным полем Зямлі ў той ці іншы час.

***Метад датавання па радыёактыўнаму вугляроду С14.*** Ізатоп вуглярода з атамнай вагой 14 утвараецца ў атмасферы ў выніку ўдзеяння касмічных промняў. Існаванне вугляроду ў мёртвай тканіне пастаянна паніжаецца. Працягласць існавання ізатопа вялікая, паколькі паўраспад вугляроду роўны 5730 ± 40 гадоў ці 5568 ± 30 ("перыяд Ліббі", які з'яўляецца эталонным). Метад мае абмежаванне – вызначэнне ўзросту, старэйшага за 60 тыс. гадоў [11, с. 71]. Гэты метад з поспехам ужываецца ў датаванні помнікаў бронзавага і жалезнага веку Беларусі, паколькі культурны пласт гэтага часу ўтрымлівае вялікую колькасць арганічных рэчываў. Метадам радыёкарбоннага аналізу ў 2007 г. было вызначана датаванне ніжняга пласта полацкага гарадзішча VII ст. да н. ч. – III ст. н. ч.

Для старажытнага палеаліту, дзе датаване па С14 немагчыма, прымяняецца датаванне ***па калій-аргонаваму, торыеваму-230 і рыдзій-акцініеваму метадам***. Распад радыёактыўнага калія-40 у аргон-40 складае $1{,}3\times10^9$ гадоў з папраўкай 10%. Калій утрымліваюць многія горныя мінералы, у прыватнасці базальт і вулканічны туф. Даты ніжняга плейстацэна цясніны Алдувай вызначаны гэтым метадам у 1,75 млн. гадоў, Францыі – 1,6 млн. гадоў [11, с. 72].

**1.10. Тэорыі развіцця грамадства ў археалогіі.** У працэсе станаўлення археалагічная навука выпрацавала некалькі тэорый развіцця грамадства. Важнае месца сярод тэарэтычных канцэпцый займае дыфузіянізм (прасторавае перамяшчэнне культурных з'яў і працэсаў). У археалогіі тэорыю распрацаваў аўстрыйскі археолаг і этнограф О. Менгін у рабоце "Сусветная гісторыя каменнага веку" (1930). Паводле Менгіна, гісторыя першабытнага грамадства – гэта вынік перасялення асобных плямён, якія належаць да розных "культурных колаў". Некаторыя вучоныя бачылі у "культурных колах" адлюстраванне пачатковых уласцівасцяў рас і народаў, а ў гістарычным працэсе – толькі распаўсюджванне гэтых уласцівасцяў шляхам заваёў, міграцый, перайманняў. Важнейшай задачай школы "культурных колаў" з'ўлялася проціпастаўленне іх вучэння "эвалюцыянізму", г зн. уяўленню аб развіцці ад простых да больш высокіх культур і формаў жыцця. Дыфузіяністы лічаць, што ўсе вялікія адкрыцці і вынаходніцтвы былі зробленыя толькі аднойчы і распаўсюджваліся з адных цэнтраў шляхам пераймання, міграцый ці дыфузій элементаў культуры ці цэлых культур. Так, Г. Чайлд (1892 – 1957), Э. Сміт (1871 – 1937) і У. Д. Перры (пам. у 1949 г.) называлі толькі адзін цэнтр цывілізацыі – Старажытны Егіпет [11, с. 42 – 43].

Археалагічнае даследаванне павінна будавацца на аснове ўліку гістарычных заканамернасцяў развіцця грамадства. Напрыклад, у тэорыі

дыфузіянізму адбываецца перабольшванне ролі міграцый і культурных перайманняў як гістарычных фактараў і памяньшаецца такім чынам магчымасць канвергентнага (ад лац. convergere – сыходзіцца, набліжацца) развіцця роднасных элементаў культуры ў розных грамадствах. Парушэнне універсальных законаў гістарычнай навукі прывядзе да скажэння гістарычных высноў, паколькі археолаг – гэта перш за ўсё гісторык.

Тэорыя канвергентнага развіцця прадугледжвае, што ўсе грамадствы развіваюцца па шляху набліжэння, набыцця агульных альбо падобных прыкмет і зліцця ў нейкае адзінае грамадства, якое пераймае асобныя рысы папярэдніх грамадстваў.

Важнае месца займае канцэпцыя Арнольда Тойнбі (1889 – 1975) – англійскага мысліцеля, аднаго з класікаў філасофіі гісторыі. А. Тойнбі з’яўляецца аўтарам 12-томнай фундаментальнай працы “Спасціжэнне гісторыі”. Імкнуўся пераасэнсаваць усё грамадска-гістарычнае развіццё чалавецтва ў святле тэорыі кругазвароту лакальных цывілізацый. Цывілізацыі разглядаў як замкнёныя грамадствы, якія характарызуюцца наборам вызначальных прыкмет. Вылучаў 21 цывілізацыю і каля 650 прымітыўных грамадстваў. Да цывілізацыі адносіў заходняе грамадства, праваслаўнае хрысціянскае грамадства, іранскае і арабскае грамадствы, сірыйскае і інш. Да рэліктавых цывілізацый адносіў мінойскае, шумерскае, хецкае, вавілонскае, андскае, юкатанскае, мексіканскае і майянскае, егіпецкае грамадствы [13].

Культурная антрапалогія – раздзел антрапалогіі, які даследуе культурныя аспекты чалавечага грамадства. Гэты тэрмін шырока распаўсюджаны ў заходняй гістарычнай навуцы ў супрацьвагу “фізічнай антрапалогіі” (біялагічная антрапалогія, якая даследуе выкапнёвыя рэшткі чалавека, яго генетыку, прыматаў і роднасныя групы) [14, с. 262, 268].

“Культурныя мадэлі”, створаныя ў сучасных археалагічных даследаваннях, паказваюць, што некаторыя ранейшыя тлумачэнні былі занадта спрошчаныя (напрыклад, тлумачэнне пераходу да земляробства на Блізкім Усходзе, звязанае з недахопам ежы). Тлумачэнне культурных змен патрабуе больш складаных даследчыцкіх мадэляў. Яны заснаваны на ідэі, што чалавечыя культурныя сістэмы складаюцца не толькі са шматлкіх элементаў (рэлігійных вераванняў, тэхналогій, сродкаў існавання і г. д.), але і самі культурныя сістэмы таксама ўзаемадзейнічаюць са сваім натуральным асяроддзем і з іншымі складанымі сістэмамі [14, с. 220].

## Літаратура


1. Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.
2. Грыцкевіч, В. Крыніцы гістарычныя / В. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. – Мінск : БелЭн, 1997. – С. 277 – 288.
3. Дук, Д. У. Да пытання гістарыяграфіі метадалогіі археалагічнага даследавання Беларусі ў XIX ст. / Д. У. Дук // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2005. – № 7. – С. 31 – 39.
4. Ісаенка, У. Ф. Археалагічная культура / У. Ф. Ісаенка // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 47 – 48.
5. Калядзінскі, Л. У. Культурны пласт / Л. У. Калядзінскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 356.
6. Крывальцэвіч, М. Археалягічныя адкрыцьці сьвету / М. Крывальцэвіч. – Мінск : Atheneum, 2000.
7. Ланитцки, Г. Амфоры, затонувшие корабли, затопленные города (Очерки о подводной археологии) / Г. Ланитцки. – М. : Прогресс, 1982.
8. Левко, О. Н. Практическая археология : учеб. пособие / О. Н. Левко. – Могилёв : МГУ им А.А. Кулешова, 2006.
9. Мартынов, А. И. Методы археологического исследования: учеб. пособие / А. И. Мартынов, Я. А. Шер. – М. : Высш. шк., 2002.
10. Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.
11. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.
12. Побаль, Л. Д. Археалагіная разведка / Л. Д. Побаль // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 49.
13. Тойнби, А. Дж. Постижение истории: пер. с англ. / А. Дж. Тойнби. – М. : Прогресс, 1991.
14. Фэйган, Б. Уводзіны ў археалогію / пер. з англ. В.Міронччык, А. Сташкевіч; Пад навук. рэд. С. Тарасава. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1996.

## Кантрольныя пытанні да тэмы 1.

1. Дайце вызначэнне навукі “археалогія”.
2. З якімі навукамі археалогія мае найбольшыя сувязі? Чаму?
3. Дайце характарыстыку першаснага этапу станаўлення археалогіі як навукі (антычнасць, элінізм, сярэднявечча, Адраджэнне).
4. Ахарактарызуйце працэса сістэматызацыі археалагічных ведаў у XVII – XVIII стст.
5. Дайце характарыстыку перыядызацыі “трох вякоў”.
6. Якія асноўныя ахеалагічныя адкрыцці былі зроблены ў XIX ст.?
7. Назавіце асноўныя вынікі дзейнасці Г. Шлімана, А. Эванса і Г. Картэра.
8. Пералічыце асноўныя археалагічныя адкрыцці XX ст.
9. Назавіце асноўныя тыпы гістарычных крыніц.
10. Назавіце асноўныя віды пасяленняў, якія даследуе археолаг.
11. Пералічыце асноўныя віды пахавальных помнікаў.
12. Дайце характарыстыку асноўных відаў пасяленняў.
13. Назавіце іншыя археалагічныя помнікі, акрамя пахавальных збудаванняў і пасяленняў.
14. Назавіце асноўныя заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў у Рэспубліцы Беларусь.
15. У чым сутнасць Пастановы Савета Міністраў РБ № 651 ад 22 мая 2002 г.?
16. Зрабіце вызначэнне паняцця “археалагічная разведка”.
17. Назавіце асноўныя віды археалагічнай разведкі.
18. Вызначце сутнасць падводнай археалогіі.
19. Назавіце асноўныя даведнікі археалагічных помнікаў Беларусі.
20. Пералічыце віды Дазволаў на права правядзення археалагічных раскопак. Якія паўнамоцтвы мае ўладальнік Дазволаў па кожнай з форм?
21. Вызначце паняцце культурнага пласта.
22. Назавіце асноўныя метады археалагічных раскопак пасяленняў і могільнікаў.
23. У чым заключаецца адказнасць археолага, які атрымаў Дазвол?
24. Назавіце асноўныя этапы камеральнай апрацоўкі археалагічнага матэрыялу.
25. Пералічыце этапы напісання археалагічнай справаздачы. Дзе яна захоўваецца?
26. Вызначце сутнасць стратыграфічнага метаду.

27.Што такое трасалогія і мадэляванне ў археалогіі?

28.Пазначце праблемы суаднясення археалагічнай культуры і этнаса.

29.Пералічыце метады адноснай храналогіі, раскрыйце іх сутнасць.

30.Пералічыце метады абсалютнай храналогіі, раскрыйце іх сутнасць.

31.Вызначце сутнасць дыфузіянізму ў археалогіі.

32.Вызначце сутнасць тэорыі канвергентнага развіцця.

33.У чым сутнасць канцэпцыі А. Тойнбі?

34.Вызначце сутнасць паняццяў “культурная антрапалогія”, “культурныя мадэлі”.

# 2. ПАЛЕАЛІТ

2.1. Агульная характарыстыка палеаліту.
2.2. Алдувайская эпоха.
2.3. Ашэльская эпоха.
2.4. Эпоха мусцье.
2.5. Верхні палеаліт.
2.6. Верхні палеаліт на Беларусі.
2.7. Мастацтва верхняга палеаліту.

**2.1. Агульная характарыстыка палеаліту.** Палеаліт (грэч. palaiós (старажытны) + líthós (камень)) – старажытнакаменны век. Пачынаецца прыкладна 2,6 млн. год таму[1]. Існаваў на працягу большай часткі ледавіковага перыяду – плейстацэна да канчатковага адступлення ледавікоў каля 8300 г. да н. э. Падзяляецца на ніжні (ранні) палеаліт, перыяд найстаражытнейшых людзей (аўстралапітэк, Homo habilis (чалавек умелы), Homo erectus (чалавек прамаходзячы)) і перавагай галечных прылад, ручных рубіл і чопераў; сярэдні палеаліт (мусцье), альбо эру неандэртальскага чалавека і перавагай прылад на адшчэпах; верхні палеаліт – распаўсюджванне культуры Homo sapiens sapiens, пласцінчата-разцовых індустрый і пячорнага мастацтва ў Еўропе. Падчас верхняга палеаліту чалавек засяліў Амерыку і Аўстралію [1, с. 185 – 186]. Храналогія асноўных падзей эпохі палеаліту выглядае наступным чынам:

7 – 3 млн. гадоў таму, аўстралапітэкі, першыя вядомыя прамаходзячыя гамініды жылі ва Ўсходняй Афрыцы, у зоне вялікіх афрыканскіх разломаў, і ў Паўднёвай Афрыцы. Каля 3,5 млн. гадоў таму – першыя звесткі пра аўстралапітэка афарэнсіс ва Ўсходняй Эфіопіі. Каля 3–2 млн. гадоў таму аўстралапітэк афрыканус засяляе Паўднёвую Афрыку.

Першыя сведчанні з’яўлення чалавека ўмелага ў Паўднёвай Афрыцы датуюцца 2,6 млн. гадоў таму. Чалавек умелы мог вырабляць прылады працы. Каля 2 млн. гадоў таму аўстралапітэк магутны з’яўляецца ў Паўднёвай Афрыцы. Знойдзены сляды пражывання аўстралапітэка бойсэй у Алдувайскай цясніне (Танзанія). Чалавек прамаходзячы з’яўляецца ў Афрыцы каля 1,6 млн. гадоў таму. Першыя гамініды трапілі ў Еўропу з Афрыкі 850 000 гадоў таму. У гэты ж час Азія засяляецца гамінідамі. Каля 500 – 250 тыс. гадоў таму паляўнічыя-збіральнікі жылі ў часовых пасяленнях, адно з якіх было выяўлена ў Більцынгслебэне ў Германіі. Людзі прамаходзячыя выкарыстоўвалі агонь, напрыклад, у пячоры Тэра Амата (Паўднёва-Заходняя Францыя). Пячору Джоўкоўдзянь у Кітае засяляюць людзі, якія карыстаюцца агнём для прыгатавання ежы. Першабытныя паляўнічыя яшчэ не авалодалі спосабамі здабычы агню, але яны ведалі як яго зберагчы. Ёсць сведчанні, што вогнішчы падтрымлівалі на працягу стагоддзяў.

[1] Існуе некалькі розных дат пачатку палеаліту: ад 2,7 млн. г. да 1,7 млн. г. таму




Найбольш вядомыя стаянкі палеаліту (паводле Г. М. Мацюшына)


Справа: першае ручное рубіла, якому 1,8 млн. гадоў, злева - больш вытанчаная прылада, узрост якой каля 800 тыс. гадоў

Чалавек умелы і старажытныя ландшафты цясніны Алдувай

Каля 300 тыс. гадоў таму у Паўночнай Афрыцы пражывалі неандэртальцы (homo neandertalensis), альбо палеантрапы (старажытныя людзі). Паступова яны засяляюць тэрыторыю ад Леванта да Цэнтральнай Азіі. У Еўропе неандэртальцы з’яўляюцца каля 100 тыс. гадоў таму. У гэты час адкрыты першыя сведчанні існавання чалавека разумнага, анатамічна сучаснага тыпу. Чалавек разумны з’яўляецца ў Еўропе каля 40 тыс. гадоў таму, гэтым жа часам датуюцца першыя сляды чалавека ў Паўднёвай Амерыцы (пячора Пэдро Фурада ў Бразіліі), людзі дасягаюць берагоў Аўстраліі. У Аўстралію яны трапілі на лодках, прыплыўшы з Інданэзіі.

Каля 30 тыс. гадоў таму адбываецца росквіт пячорнага мастацтва (размалёўка сценаў пячор рэалістычнымі малюнкамі), з’яўляюцца “палеалітычныя венеры” (скульптурныя выявы жанчын, зробленыя з каменю). 15 – 10 тыс. гадоў таму ў Егіпце і Нубіі людзі карыстаюцца каменнымі зернацёркамі для расцірання злакаў і атрымання мукі. Першае глінянае начынне знойдзена ў пячоры Фукуі ў Японіі [3, с. 164 – 167].



Чопінг

Такім чынам, за эпоху палеаліту чалавецтва наблізілася да стварэння асноў цывілізацыі, перажыўшы некалькі стадый змянення віда Homo.

Храналогія палеалітычных індустрый выглядае наступным чынам: алдувайская эпоха, ранні, сярэдні і позні ашэль, мусцье і верхні палеаліт.

Эпоха палеаліту супадае з геалагічнай эпохай – плейстацэнам. Гэта эпоха ледавіковых перыядаў, якая папярэднічала сучаснай геалагічнай эпосе – галацэну. У плейстацэне адбыліся чатыры ледавіковых перыяды, названыя па перыядызацыі альпійскіх адкладаў гюнц, міндэль, рыс, вюрм [5, с. 208]. Дата пачатку плейстацэна дакладна не высветлена і вагаецца ад 3,5 да 1 млн гадоў таму, храналагічныя межы асобных перыядаў абледзянення таксама дакладна не вызначаны.

Дакладна вядома, што апошні вюрмскі ледавік дасягнуў найвышэйшай кропкі каля 16 тыс. гадоў таму. Сярэдняя тэмпература ў Еўропе і Амерыцы была на 18ºС ніжэй за сучасную. Да трэці сучаснай сушы пакрываў ледавік, таўшчыня якога на асобных участках дасягала 3 км. За год ледавік праходзіў ад 600 да 1200 м.

Паколькі льды скоўвалі вялікую колькасць вады планеты, геаграфія і клімат Зямлі значна змяніліся: узровень мора панізіўся на 125 м. Гэта ўтварыла новыя кантыненты і выспы. Сярэдняя колькасць ападкаў значна панізілася.

Тундравыя ланшафты займалі цяперашнюю зону хваёвых лясоў, зону сучасных лісцевых лясоў займалі стэпы. Менавіта ў стэпавай зоне размяшчаліся паляўнічыя на маманта і на т. зв. мамантавую фаўну [3, с. 38].




Ландшафты Вюрмскага зледзянення

**2.2. Алдувайская эпоха.** Алдувайская эпоха (2,6 млн гадоў таму – 700 тыс. гадоў таму) атрымала назву ад цясніны Алдувай у Танзаніі. У алдувайскі час людзі цалкам залежалі ад прыроды. Таму яны не маглі існаваць у краінах з халодным кліматам. Людзі вымушаны былі жыць у зоне тропікаў (тагачасная Паўднёвая Еўропа, Паўночная і Ўсходняя Афрыка). Людзі вынайшлі першыя прылады – чоперы (спалучалі рэжучыя і рубячыя функцыі). Чоперы рабілі з галькі, у якой некалькімі ўдарамі аддзялялі вяршыню альбо край. Часам адбівалі два края, тады ўтвараліся чопінгі.



Прылады каменнага веку: а – адшчэп; б – нуклеўс; в – ручное рубіла

Прылады другога віду былі зроблены на адшчэпах. Рабочы край адшчэпаў падпраўляўся дробнымі ўдарамі. Гэтая тэхніка называецца рэтушшу. Першыя рэтушаваныя прылады яшчэ не мелі вызначаных формы і памераў. Сустракаюцца вельмі дробныя выпадковыя адшчэпы. Адшчэпы выкарыстоўвалі для раздзелкі скур жывёл [2, с. 83 – 85].

Нягледзячы на простую форму, чоперы былі даволі эфектыўнай прыладай. Луіс Лікі эксперыментальна даказаў, што з дапамогай чопераў можна было за 20 хвілін забіць барана, зняць з яго скуру і разабраць тушу на часткі [5, с. 182].

Трэці від алдувайскіх прылад – гэта шматграннікі ці сфероіды. Гэта груба абабітыя камяні акруглай формы з мноствам граняў. Іх выкарыстоўвалі ў якасці ўдарнай прылады пры апрацоўцы раслiннай ці жывёльнай ежы. У алдувайскую эпоху з’явіліся нуклеўсы (ядрышча). Першыя нуклеўсы ўяўлялі сабой жэлвакі ці кускі каменю нявызначанай формы са слядамі некалькіх адшчэпаў. На адной са стаянак цясніны Алдувай археолагі знайшлі круг, выкладзены з кавалкаў базальта. Яго памер у папярочніку складае 4 м. Існуе думка, што гэта раскапаныя рэшткі першага жытла, якое было зроблена ў выглядзе шалаша ці ветравой заслоны з галінак. Магчыма, домабудаўніцтва зарадзілася ў найстаражытнейшую эпоху [2, с. 83 – 85].

**2.3. Ашэльская эпоха.** Ашэльская эпоха ранняга палеаліту датуецца 700 тыс. г. таму – 150 – 120 тыс. гадоў таму. Названа па прадмесцю г. Ам’ен (Францыя) Сэнт Ашэль. У гэты час жылі архантрапы, напрыканцы эпохі з’явіліся неандэртальцы (палеантрапы) [2, с. 86 – 87]. У Еўропе Ашэль падзяляецца на ранні (700 – 400 тыс. г. таму), сярэдні і позні (400 – 120 тыс. г. таму). Характарызуецца распаўсюджваннем новых прылад – ручных рубіл. У познім ашэле вылучаюць культуру клектон (без выкарыстання рубіл) [5, с. 17].



Ручныя рубілы

Культуру ашэль утварыў чалавек умелы, а далей развіваў чалавек прамаходзячы. Напрыклад, універсальная прылада чалавека ўмелага – ручное рубіла, актыўна выкарыстоўвалася людзьмі прамаходзячымі.




Арэал распаўсюджвання чалавека прамаходзячага

Геаграфія стаянак чалавека прамаходзячага ахоплівае тэрыторыі Усходняй Афрыкі, Заходняй Еўропы, Усходняга Кітая, в. Ява. Чалавек прамаходзячы з'явіўся каля 1,6 млн гадоў таму ў Афрыцы, каля 800 тыс. г. таму айкумена дасягае да вострава Ява. Рэшткі прылад працы гамінідаў фіксуюцца ў Еўропе каля 1 млн гадоў таму, а самы ранні чэрап з Араго і сківіца з Гейдэльберга датуецца каля 400 тыс. гадоў таму [3, с 50].



У пачатку ашэля з'явіліся новыя прылады – ручное рубіла і кліверы. Іх памеры перавышаюць алдувайскія. Сыравінай з'яўляўся крэмень, таму што гэты камень мае унікальныя уласцівасці: цвёрдасць, рэжучы востры край, здольнасць расшчапляцца на тонкія пласціны, шырокае распаўсюджванне.

Акрамя крэменю выкарыстоўваўся кварц, абсідыян, сланец.

Ручное рубіла – гэта масіўная прылада міндалявіднай ці авальнай формы, даўжынёй ад 10 да 20 і нават 35 см і вагой 0,5 – 1 кг [2, с. 86 – 87; 5, с. 17]. Рубіла выпрабляліся шляхам двухбаковай аббіўкі. Ручное рубіла мела універсальнае прызначэнне.

Клівер (калун) – прылада з паралельнымі краямі падоўжанай трапецыяпадобнай ці трохвугольнай формы. Лязо не апрацавана рэтушу.

Разам з рубіламі і кліверамі выкарыстоўвалі адшчэпы, колькасць якіх была непараўнальна большай. Адшчэпы выкарыстоўваліся як колючыя, рэжучыя і скрабільныя прылады. У эпоху ашэль выкарыстоўваліся і драўляныя інструменты – дубіны, палкі і коп'і. Працягвалі выкарыстоўвацца чоперы [2, с. 86 – 87].



Рэканструкцыя жытла чалавека прамаходзячага ў Тэра Амата

У ашэльскую эпоху людзі прамаходзячыя маглі будаваць жытлы. На стаянцы Тэра Амата паблізу г. Ніцы ў Францыі захаваліся сляды лёгкіх шалашападобных жытлаў, а на пячорнай стаянцы Лазарэ на паўднёвым узбярэжжы Францыі – своеасаблівы намёт, пакрыты скурамі. Узрост стаянак каля 400 тыс. гадоў. Такія жытлы будаваліся ў тых мясцінах, дзе клімат быў больш цёплы. Жытлы мелі выгляд шалаша, галінкі дрэў абапіраліся на цэнтральны слуп. У Тэра Амата выяўлены рэшткі адзінаццаці авальных жытлаў. Цяжкія камяні прыціскалі ніжні край галінак. Прыкладна ў цэнтры жытла размяшчалася вогнішча. Паляўнічыя спалі на скурах жывёл, магчыма, размалёўвалі свае целы вохрай. Людзі карысталіся драўлянымі чашамі. Людзі стаянкі Тэра Амата ўжывалі мяса сланоў, высакародных аленяў, насарогаў, коз і дзікоў. Знойдзены ракавіны вустрыц, мідзій і іншых малюскаў [3, с. 55].

На стаянках у Торальба і Амброне (Іспанія) выяўлены рэшткі жытлаў, выкладзеных каменем [5, с. 18]. У пячоры Чжоўкоўдзянь у Кітаі пака-

ленні чалавека прамаходзячага жылі на працягу 460 – 230 тыс. гадоў. Людзі пячоры Чжоўкоўдзянь жылі ў халодным клімаце і актыўна карысталіся агнём для ацяплення і прыгатавання ежы [3, с. 56].

**2.4. Эпоха мусцье.** Эпоха мусцье (100 – 80 – 40 – 35 тыс. г. таму) супадае з апошняй (рыс-вюрмскай, на Беларусі – паазерскай) ледавіковай эпохай. У эпоху мусцье ў Еўразіі абіталі неандэртальцы (homo sapiens neanderthalensis). Скелеты неандэртальцаў адкрыты археолагамі на вялізных абшарах: на Блізкім і Далёкім Усходзе, Паўночнай Афрыцы, большай частцы Еўропы, не закранутай ледавіком [1, с. 173]. Неспрыяльны халодны клімат, нават на тэрыторыі Сярэдняга Усходу, абумовіў развіццё ў неандэртальцаў моцнага касцяка і развітай мускулатуры.

Адрозненні мусцьерскіх прылад ад папярэдніх былі прынцыповыя: раней прылады прадстаўлялі сабой па-сутнасці проста падпраўлены камень. Неандэртальцы вынайшлі новы спосаб вытворчасці двух-трох акуратных, сапраўды аднолькавых адшчэпаў ад аднаго каменю, ад якога раней атрымаўся бы толькі адзін скол [3, с. 57]. Гэтая тэхніка атрымала назву левалуа (фр. Levallois). Яна была вядома ў познім ашэле, але шырокае выкарыстанне знайшла менавіта ў эпоху мусцье. Гэта спосаб рашчаплення крэменю, які атрымаў назву ад Левалуа-Перрэ, прыгарада Парыжа, дзе былі знойдзены такія прылады. Спачатку з круглага каменю здымалі верхавіну, як зразаюць верхавіну ў зваранага яйка. Атрымоўвалася роўная паверхня ў форме дыска. Пасля майстар каменем наносіў удары ад краёў дыска ўніз, каб адкалоць некалькі адшчэпаў правільнай формы. Гэтыя адшчэпы далей пераўтвараліся ў нажы ці ручныя рубілы, да іх прымацоўвалі драўляныя дзяржанні. Астаткавае ядро (нуклеўс) мела чарапахападобную форму, адна паверхня плоская, другая – купалападобная [1, с. 136; 3, с. 57].

Спосабам скола, а не аббіўкі як раней, асобных адшчэпаў, утварыліся асноўныя тыпы мусцьерскіх прылад працы: востраканечнікі, скрэблы, скобелі, рубільца [2, с. 92]. Галоўнай прыладай з'яўляўся востраканечнік і скрэбла. Востраканечнік прызначаўся для палявання і рэзання, а скрэбла выкарыстоўвалася ў побыце для апрацоўкі скур. Набор інструментаў налічваў каля 60 тыпаў. З'яўляюцца грубыя наканечнікі коп'яў, што сведчыць пра з'яўленне складовых прылад. Аднак шырокае распаўсюджванне складовых прылад адносіцца да наступнай эпохі [2, с. 92].



Адзін са спосабаў працы адціскальнікам, замацаваным у драўляным стрыжні

З’явілася і ўдасканальвалася аджымная рэтуш. Рэтуш наносілі на выраб касцяным адціскальнікам (палкай ці косткай). З дапамогай адціскальніка ад прылады аддзялялі невялікую крамянёвую пласцінку. Звычайна рэтуш наносілі на край выраба, але часам рэтушавалі ўсю паверхню. Падчас апрацоўкі прадмет мог патрэскацца. Такія выбракаваныя прылады з’яўляюцца частай знаходкай на мусцьерскіх помніках. Яшчэ адным відам рэтушы з’яўляецца контрударная. Каб яе нанесці, трэба было пакласці крамянёвую прыладу на касцяную апору і моцна ўдарыць па ёй. У выніку ад прылады аддзялялася тонкая лустачка крэменю. Мусцьерскія прылады прызначаліся для рэзання, скаблення, стругання, свідравання, а таксама для апрацоўкі дрэва і скур [2, с. 92].

Вырабы з косці былі рэдкія, знойдзены толькі вастрыі і шылы. Неандэртальцы выкарыстоўвалі кісьцяні (пляцёнкі з пясчанікавым шарам на канцы) і боласы (доўгую вяроўку з пясчанікавымі шарамі на канцах). Боласы забрасывалі на жывёл і яны пад уласным цяжарам захвоствалі ногі, рогі ці шыю жывёлы [2, с. 93].

Метады палявання таксама ўдасканальваліся. Практыкаваўся буйнамаштабны загон дзічыны. Коні, маманты і іншыя буйныя млекакормячыя статкамі заганяліся ў багнавыя ўчасткі, дзе на іх бяспечна было нападаць з блізкай адлегласці. Такое паляванне прыносіла вельмі шмат мяса, што было недасягальнай марай для першых гамінідаў [3, с. 58]. Рэшткі мяса захоўвалі ў спецыяльных ямах, паколькі ў тагачаснай Еўропе на глыбіні паўметра знаходзілася вечная мерзлата.

У горнай мясцовасці (пячора Цешык-Таш) людзі заганялі горных казлоў у цясніны, адкуль яны не маглі выбрацца. Аб’ектам палявання з’яўляўся нават пячорны мядзведзь (сочынскае ўзбярэжжа) [2, с. 95]. Не змяншалася і роля збіральніцтва, доказам чаго з’яўляюцца знойдзеныя археолагамі каменныя таўкачы і ступкі.

Неандэртальскі чалавек пераважна жыў у пячорах, што было абумоўлена неспрыяльным халодным кліматам. Аднак вядомы і адкрытыя стаянкі. Апошнія прадстаўлялі сабой адкрытыя лагеры паляўнічых. На тэрыторыі Крыма археолагі знайшлі рэшткі жытлаў, зробленых з костак мамантаў і буйных млекакормячых і абцягнутых скурамі. Асобныя жытлы мелі па некалькі пакояў і прызначаліся для дваццаці чалавек. На стаянцы Малдова 1 жылая пабудова была падзелена на два памяшканні, да якіх дамыкалі дзве прыбудовы з летнім і надворным вогнішчам [2, с. 94].

У неандэртальцаў сустракаюцца пахаванні, што сведчыць пра існаванне ў іх рэлігійных вераванняў. Вучоныя вылучаюць у іх культы жывёл (пахаванні мядзвежых чарапоў у Швейцарыі і Францыі). У адной

з пячор на тэрыторыі Лівана знойдзена рытуальнае пахаванне аленя. У мястэчку Ля Ферасі (дэпартамент Дардонь) раскапана сямейнае пахаванне неандэртальцаў (мужчына, жанчына, двое немаўляці і хлопчык пяцігадовага ўзросту). Разам з мужчынай ляжалі крамянёвыя прылады, на галаве была пакладзена плоская каменная пласціна. Пад суседнімі камянямі таксама знаходзіліся дзіцячыя пахаванні. У пячоры Цешык-Таш (Узбекістан) знойдзена пахаванне хлопчыка, каля якога размешчаны косці горнага казла. У пячоры Шанідар (Паўночны Ірак) знойдзены шкілет неандэртальца, які памёр каля 45 тыс. гадоў таму. Ён вядомы як “стары з Шанідара”. Гэты чалавек быў інвалідам, але дажыў да састарэлага ўзросту (каля пяцідзесяці гадоў). За ім даглядалі члены групы, што сведчыць аб развітай сацыяльнай аргнаізацыі груп неандэртальцаў.

Тым не менш, нягледзячы на значныя тэхналагічныя дасягненні, неандэртальцы не стварылі мастацтва, ім былі невядомы спосабы апрацоўкі косці. Таксама неандэртальцы не займаліся доўгімі вандраваннямі: камяні, знойдзеныя на стаянках неандэртальцаў, паходзілі з бліжэйшых ваколіц [3, с. 60 – 61].

На мяжы 40 – 35 тыс. г. да н. ч. неандэртальцаў выцясняе чалавек двойчы разумны (homo sapiens sapiens). Пытанне пра генетычную сувязь двух відаў чалавека разумнага – неандэртальскага і двойчы разумнага, з’яўляецца дыскусійным.

**2.5. Верхні палеаліт.** Позні (верхні) палеаліт датуецца часам 40 (35) – 10 тыс. г. да н. ч. У гэты час чалавек разумны (homo sapiens sapiens) засяліў Еўропу, што прывяло да знікнення неандэртальцаў. Людзі верхняга палеаліту маюць назву неаантрапы, альбо краманьёнцы (ад назвы Cro-Magnon – скальны навес у Дардані, Францыя) [1, с. 125].

Клімат эпохі верхняга палеаліту быў халодны і характарызаваўся наступленнем апошняга ледавіка. У тэхніцы апрацоўкі каменю адбыліся новыя якасныя змены. Распаўсюдзілася тэхналогія вырабу прылад на пласцінах. Адбываецца спецыялізацыя працоўнай дзейнасці [1, с. 46 – 47].

У верхнім палеаліце людзі засялілі вялізарныя абшары планеты. Каля 100 тыс. гадоў таму першыя людзі сучаснага аблічча з’явіліся ў Паўднёвай Афрыцы (пячора Бордэр, вусце ракі Клейсіс), пасля праніклі на тэрыторыю Блізкага Усходу (пячора Эс-Схул Куэф, каля 80 тыс. г. таму). У Еўропу людзі сучаснага антрапалагічнага тыпу праніклі 45 тыс. гадоў таму, у Аўстралію, Усходні Кітай – каля 40 тыс. гадоў таму. Амерыка была заселена каля 15 тыс. гадоў таму (выключэннем з’яўляецца стаянка Пэдро Фурада ў Бразіліі).



Северный Ледовитый океан
СИБИРЬ
БЕРИНГИЯ
ЮКОН
пещера Голубой рыбы
АЛЯСКА
АЗИЯ
Дайюктай
ЕВРОПА
Джелс
Младек
ейвиленд
Кельстербах
Межирич
Долни Вестонице
Бахо Киро
Абри Пато
пещера Чжоукоудянь
Салавэйсу
Эс-Схул
Куэф
Дар-эс-Султан
ПУСТЫНЯ САХАРА
АФРИКА
пещера Льючианг
ФИЛИППИНЫ
Табон
СУНДАЛЕНД
Ниа
ОСТ-ИНДИЯ
НОВАЯ ГВИНЕЯ
Индийский океан
Тихий океан
Омо
Ваджьяк
Малакунанья
САХУЛЕНД
АВСТРАЛИЯ
пещера Бордер
устье реки Клейсис
Жилище Дьявола
озеро Мунго
Кейлор
ТАСМАНИЯ
пещера Бегин Лакк
100 000—71 000 лет назад
70 000—46 000 лет назад
45 000—26 000 лет назад
25 000—16 000 лет назад
15 000—8000 лет назад
СЕВЕРНАЯ АМЕРИКА
Мидоукрофт
Литтл-Солт-Спринг
ЮЖНАЯ АМЕРИКА
Педро Фурада
Монтеверде
пещера Фелл

Крамянёвая індустрыя ў Заходняй Еўропе прайшла тры стадыі развіцця.Першая – *арыньяк*, крамянёвая індустрыя Францыі, сустракаецца на Балканах, у Палестыне, Іране, Афганістане. Для ранняга арыньяка характэрны касцяныя наканечнікі з рашчэпленым аснаваннем, з’яўляецца пячорнае мастацтва. Датаванне культурнага пласта вызначана метадамі радыёвугляроднага аналіза (каля 42 – 31 тыс. г. да н. ч. – 19 тыс. г. да н. ч.) [1, с. 182].

*Салютрэ* – каменная індустрыя, якая папярэднічае мадлену ў некаторых частках Францыі і Іспаніі (ад назвы Салютрэ бліз Масона, дэпартамент Сона-і-Луара, Францыя). Датуецца па радыёвугляроду 19 – 18 тыс. г. да н. ч. – 15 тыс. г. да н. ч. Характарызуецца з’яўленнем вялікіх лістападобных наканечнікаў коп’яў і працягам развіцця аджымной рэтушы. У Паўднёва-Усходняй Іспаніі на фінальнай стадыі сустракаюцца нават наканечнікі стрэл, а значыць, прынцыпова новы тып зброі – лук і стрэлы – быў распаўсюджаны ўжо ў эпоху верхняга палеаліту [1, с. 228 – 229].



Арыньякскія прылады

*Мадлен* – фінальная культура палеаліту большай часткі Заходняй Еўропы (ад назвы стаянкі Ла-Мадлен у Дардані, Францыя). Датуецца 15 – 10 тыс. г. да н. ч. Цэнтр культуры размешчаны ў Паўднёва-Заходняй Францыі, Усходняй Іспаніі, аднак элементы культуры прысутнічаюць у Брытаніі, Паўднёва-Заходняй Германіі, Польшчы. Характарызуецца адаптацыяй да вельмі халоднага клімату апошняга вюрмскага ледавіка. Галоўнай крыніцай ежы з’яўляўся паўночны алень. Адбываецца росквіт пячорнага мастацтва (пячора Альтамір), а таксама мастацтвам малых форм, вырабаў з косці. Адна з характэрных прылад позняга мадлена – касцяны гарпун [1, с. 145 – 146].






Мадленскія касцяныя прылады: a, b – гарпуны; c – “жэзл начальніка”
Салютрэйскі крамянёвы інвентар



Рэканструкцыя жытлаў верхняга палеаліту (арэал бязлесых стэпаў Украіны і Беларусі у ледавік)

Ва ўмовах халоднага клімату людзі вымушаны былі будаваць трывалыя жытлы, аснова якіх была зроблена з костак буйных жывёл мамантавай фаўны. Жытлы дасягалі 5 м у дыяметры, іх каркас складаўся з костак маманта, якія сумарна важылі каля 21000 кг. З выгнутых іклаў рабілі ўваход. Буйныя элементы злучаліся больш дробнымі косткамі. Гэтае жытло пакрывалася зверху скурамі і дзёрнам, колькасць скур рэгламентавалася ўмовамі надвор'я [3, с. 69].

Адной з найбольш даследаваных стаянак верхняга палеаліту з'яўляецца Долні Вестоніцэ на поўдні Чэхіі (каля 25 тыс. г. да н. ч.). Тут раскапана чатыры жытла, самае вялікае з якіх ацяплялася вогнішчам. У якасці паліва выкарыстоўвалі косткі маманта, з костак гэтай жывёлы рабілі таксама і каркас жытла. Плошча вялікай пабудовы дасягала 92 кв. м. Тут размяшчалася пяць вогнішчаў. Каля гэтых вогнішчаў людзі ляпілі з гліны фігуркі ільвоў, насарогаў і іншых звяроў, якія сустракаліся ім ў ваколіцах. Фігуркі абпальвалі ў вогнішчы. Некаторыя фігуркі выразаліся з ікла маманта. Паляванне было загонным і сезонным. Падчас зімовай міграцыі мамантаў на поўдзень у даліну рэк Дуная, Маравы і Дые паляўнічыя чакалі мамантаў каля адной ямы. Паляўнічыя забіралі такую колькасць мяса, якую маглі несці, мяса захоўвалі ў вырытых ямах-лядоўнях ці высушвалі на сонцы.

Адзенне еўразійскіх паляўнічых-збіральнікаў нагадвала адзенне сучасных эскімосаў: доўгая накідка з капялюшам, сшытая з футра ці скуры невялікімі сцяжкамі для ўтрымання цяпла, штаны, якія лёгка запраўляліся ў абутак са скур. Ногі і рукі сагравалі футраныя шкарпэткі і рукавіцы [3, с. 71]. Адной з крыніц ежы жыхароў Долне Вестоніцэ з'яўлялася ласось, які мігравалі раз у год на нераст.



Рэканструкцыя жытлаў верхняга палеаліту (арэал бязлесых стэпаў Украіны і Беларусі у ледавік)

Жыхары Долне Вестоніцы карысталіся музычнымі інструментамі: працейшай флейтай, зробленай з полай птушынай косткі, ксілафонам са сцегнавай косткі маманта, барабанамі з лапатак ці чарапоў і трашчоткамі са сківіцы. Мастакі выраблялі рэчы з тэракоты. На стаянцы знойдзена першая вядомая печ для абпалу керамічных вырабаў. У керамічнае цеста дадавалі тоўчаную косць. Першыя скульптуры – гэта галовы жывёл: ліс, мядзведзяў і ільвоў, а таксама мініяцюрныя жаночыя фігуркі. Гэтыя скульптуры з’яўляліся не толькі творамі мастацтва, але і вялікім тэхналагічным дасягненнем: яны былі зроблены з ганчарнай гліны. Іх абпальвалі ў асобным, пятым жытле, якое было размешчана за парканам. У жытле была зроблена печ, сценкі якой былі акружаны зямлёй [3, с. 72].



Востраканечнік, зроблены неандэртальцам

Развіваліся рыбная лоўля. У верхнім палеаліце людзі вынайшлі першыя прататыпы рыбалоўных кручкоў. Гэта былі невялікія завостраныя стрыжні каля 5 см даўжыні з косці ці дрэва, якія мацаваліся да скуранога шнура ці жылы жывёлы. Калі рыба захоплівала нажыўку, завостраныя канцы ўтыкаліся ёй ў горла, што дазваляла рыбалову выцягнуць здабычу на бераг. У Паўднёвай Афрыцы ўпершыню зафіксаваны сляды выкарыстання сетак з валокнаў раслін ці рамянёў са скур. Да гэтых прылад прывешваліся каменныя грузікі цыліндырчнай формы. Такім чынам, марская і прэснаводная рыба ў верхнім палеаліце стала надзейнай крыніцай ежы [3, с. 70].

**2.6. Верхні палеаліт на Беларусі.** Верхні палеаліт Беларусі характарызуецца наступленнем апошняга паазерскага ледавіка, які спыніўся прыкладна на паўднёвай мяжы Віцебскай вобласці. Клімат быў суровы, у асноўным пераважалі тундравыя ландшафты. На Беларусі археолагамі адкрыты дзве стаянкі верхняга палеаліту – Бердыж (24 тыс. г. таму) і Юравічы (26 тыс. гадоў таму). Існаванне неандэртальцаў у сярэднім палеаліце на нашай тэрыторыі з’яўляецца верагодным, паколькі апошні ледавік знішчыў матэрыяльныя сляды іх прысутнасці [7, с. 11 – 30]. Археолагі знайшлі на Беларусі толькі тры прылады мусцьерскага тыпу: востраканечнік (каля в. Падлужжа Чачэр-




Першапачатковае засяленне Беларусі:
• месцазнаходжанні крамянёвых вырабаў неандэртальца;
▲ Юравіцкая і Бердыжская палеалітычныя стаянкі;
мяжа апошняга (Паазерскага) ледавіка;
шляхі пранікнення ў канцы палеаліту плямёнаў паляўнічых на паўночных аленяў

скага раёна), скрэбла і скрэбла-нож (каля в. Абідавічы Быхаўскага раёна, пас. Свяцілавічы Веткаўскага раёна). З-за надыходу ледавіка каля 20 тыс. гадоў таму клімат на тэрыторыі Беларусі стаў настолькі неспрыяльным, што выключаў магчымасць існавання чалавека. Новае засяленне тэрыторыі Беларусі пачалося ў эпоху фінальнага палеаліту.

**2.7. Мастацтва верхняга палеаліту.** Да пачатку эпохі верхняга палеаліту мастацкая дзейнасць чалавека зводзілася выключна да ўпрыгожвання свайго цела і практычна выкарыстоўваемых прадметаў. Аднак каля 30 тыс. гадоў таму сітуацыя прынцыпова змянілася. Ва ўсім свеце тагачаснай айкумены адбываецца ўздым творчай актыўнасці. Шматлікмі майстрамі вырабляюць шматлікія і разнастайныя гліняныя і каменныя фігуркі людзей і жывёл. Распаўсюджваюцца разнастайныя каралі, пацеркі і іншыя ўпрыгожванні, а таксама вялікія панарамныя карціны на сценах пячор. Дакладна не высветлена мэта, з якой рабіліся вялікія роспісы пячор (рэлігійная, адукацыйная, эстэтычная?). Мастакі наносілі роспіс пераважна правай рукой, так, у пячоры Гаргас у Францыі на сценах захаваліся 136 выяў левай рукі і 22 – правай. Адпаведна, выявы наносіліся вольнай рукой [3, с. 67].




Вобразы людзей і жывёл ў верхнепалеалітычным мастацтве Еўразіі: 1, 2 – гравіроўкі з Ла-Марш і пячоры Трох Братоў; 3 – статуэтка з Віліндорфа (Аўстрыя); 4, 5 – статуэткі з Бурэці і Мальты (Сібір)

Асаблівую ўвагу заслугоўваюць знаходкі статуэтак, якія перадаюць формы жаночага цела з пэўнай гіпербалізацыяй. Іх стваралі каля 35 – 8 тыс. гадоў таму ва ўсіх частках айкумены. Абагульняюць фігуркі абстрактная перадача галавы жанчыны, падкрэсленыя полавыя прыкметы. Гэта тлумачыць паважлівае стаўленне да жанчыны як асновы жыцця. Гэтыя фігуркі вышынёй ад 3,5 да 20 см названы “палеалітычнымі венерамі”. Дакладнае прызначэнне статуэтак у грамадскіх адносінах верхняга палеаліту застаецца дыскусій-

ным (Багіня-маці ці феціш для магічных практык) [3, с. 78]. Усяго вылучаюцца чатыры буйныя вобласці мастацтва: пірэнэйска-дардоньская, дунайска-мараўская, дзяснінска-донская і ангарская [4, с. 66].

Узоры першабытнага мастацтва былі адкрыты ў 1875 г. Марселіна дэ Саўтуолам, які пачаў раскопкі пячоры Альтаміра ў Іспаніі. Аналагічны роспіс пячор быў зафіксаваны вучонымі ў пячорах Ла-Мут, Цейяк (Дардонь) і інш. Сапраўднасць палеалітычнага мастацтва аспрэчвалася да 1901 г., калі былі адкрыты новыя серыі пячорных малюнкаў Камбарэль і Фон-дэ-Гом у Дардоні [6, с. 27].

Асобнай групай прадстаўлены выявы на плітках з косці і каменю. Графічныя выявы шматлікія і разнастайныя: ад абстрактных ліній да рэалістычных выяў людзей. На некаторых плітках адлюстраваны выявы каляндарных знакаў, лічбавыя каляндарна-астранамічныя табліцы [4, с. 66].

## Літаратура


1. Брей, У. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.
2. Гальперина, Г. А. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.
3. Заря человечества / пер. с англ. В. Федяниной. – М. : ТЕРРА–Книжный клуб, 1998.
4. Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов – М. : Высш. шк., 1996.
5. Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.
6. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век. / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.
7. Чарняўскі, М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд / М.М. Чарняўскі. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2003.


## Кантрольныя пытанні да тэмы 2

1. Назавіце перыядызацыю палеаліту.
2. Вызначце характэрныя асаблівасці алдувайскай эпохі.
3. Вызначце характэрныя рысы ашэльскай эпохі.
4. Ахарактарызуйце асноўныя прылады ашэльскай эпохі.
5. Ахарактарызуйце характэрныя рысы мусцьерскай эпохі.

6. Ахарактарызуйце асноўныя тэхнікі апрацоўкі каменю мусцьерскага часу.

7. Назавіце метады і прылады для палявання мусцьерскага часу.

8. Дайце характарыстыку жытла і пахавальных комплексаў мусцьерскага часу.

9. Назавіце перыядызацыю верхняга палеаліту.

10. Вызначце накірункі пашырэння айкумены ў верхнім палеаліце.

11. Вызначце характэрныя рысы культур арыньяк, салютрэ і мадлен.

12. Зрабіце характарыстыку жытлаў і адзення эпохі верхняга палеаліту.

13. Зрабіце харакатыстыку асноўных промыслаў верхняга палеаліту.

14. Назавіце характэрныя асаблівасці верхняга палеаліту Беларусі.

15. Ахарактарызуйце працэс зараджэння і асноўныя рысы мастацтва верхняга палеаліту.

# 3. МЕЗАЛІТ.

3.1. Агульная характарыстыка мезаліту.
3.2. Культуры мезаліту.
3.3. Мезалітычныя індустрыі.
3.4. Мастацтва мезаліту.

**3.1. Агульная характарыстыка мезаліту.** Мезаліт (грэч. mésos (сярэдні) + lithós (камень)) – гэта пераходны перыяд ад палеаліту да неаліту (IX – VI (V) тыс. да н. ч.). Каля 10000 гадоў да н. ч. ледавікі адступілі да Паўночнага і Паўднёвага палюсоў. Да VII тыс. да н. ч. насельніцтва Зямлі складала ад 5 да 10 млн. чалавек.

Пачатак мезаліту звязаны з геалагічнай эпохай – галацэнам (геалагічная сучаснасць) [3, с. 121]. Клімат мяняўся на працягу мезаліту некалькі разоў. У пачатку адступлення ледавіка (14 – 8,5 тыс. г. да н. ч.) ён быў субарктычным, халодным і мала чым адрозніваўся ад ледавіковага перыяду. Каля 8,5 – 5 тыс. г. да н. ч. ён стаў больш цёплы і сухі. Канчаткова вымірае мамантавая фаўна, жывёльны свет стаў падобны да сучаснага [6, с. 132]. Асноўны аб’ект палявання ў раннемезалітычны час – паўночны алень. Дзякуючы гэтай жывёле вялікія тундравыя абшары Еўропы зноў пачалі стала засяляцца людзьмі. У паляванні людзям дапамагаў сабака, які быў прыручаны менавіта ў эпоху мезаліту.

У мезаліце Еўропа паступова пакрылася лясамі з хваёвых і шыракалісцевых парод дрэў. Вялікія абшары лясной зоны Еўропы былі забалочаныя. Утварылася шмат дробных азёр. Гэта вымушала людзей да актыўнага рыбалоўства, якое стала займаць непараўнальна большае месца ў промыслах першабытнага насельніцтва. Рыбу здабывалі пры дапамозе гарпуноў, сецяў і рыбалоўных кручкоў [5, с. 70]. Таксама ў рацыёне людзей павялічвалася доля вадаплаваючых птушак, на якіх палявалі з дапамогай лука і стрэлаў. Лук і стрэлы становяцца асноўнай дыстанцыйнай зброяй. Шырока распаўсюджваюцца чоўны як сродак перамяшчэння па вадзе. Нярэдка яны былі зробленыя з цэльнага ствала дрэва (г. зв. монаксілы).



Тыпы мезалітычных жытлаў з жэрдак, кары і скур. Рэканструкцыя

Групы паляўнічых-збіральнікаў у колькасці 25 – 30 чалавек у эпоху адступлення ледавіка пачалі павялічвацца, што вымушала шукаць новыя спосабы сацыяльнай арганізацыі і здабычы ежы. Першымі выпрацавалі новую стратэгію адаптацыі паляўнічыя-збіральнікі Урадлівага Паўмесяца – паласы пагоркавай, але ўрадлівай зямлі, якая сярпом выгіналася на поўнач ад Персідскага заліва да прадгор'яў Малой Азіі і далей уздоўж рэк Тыгр і Ефрат у Месапатаміі [4, с. 95]. Тут упершыню людзі асвоілі селекцыю культурных раслін.



Спосабы замацавання мікралітаў у якасці наканечнікаў стрэл

Раннепершабытная абшчына мезаліту складалася з групы ці груп роднасных сем'яў, да якіх далучаліся сем'і сваякоў, сяброў. Калі такіх груп было некалькі, абшчына мае назву шматродавай ці дысперснародавай. Абшчына вяла гаспадарку ў межах асобнай тэрыторыі. Вар'іравалася кааперацыя працы і парадак размеркавання здабычы. Гэтая абшчына была вытворчым калектывам. Памеры першабытных абшчын на працягу верхняга палеаліту-мезаліту памяншаліся. Улада ў абшчыне належала сталым, паважаным людзям. Побач з “вялікімі мужчынамі” меліся і “вялікія жанчыны”, якія кіравалі жаночай часткай абшчыны. У абшчыне магло быць некалькі правадыроў, у залежнасці ад сезонных гаспадарчых груп. Размеркаванне ўлады залежыла ад асабістага аўтарытэту [1, с. 178 – 179].

Мезалітычныя індустрыі характарызуюцца пашырэннем мікралітычных тэхнік. Пераход ад верхняга палеаліту да неаліту быў непрацяглым на Блізкім Усходзе па прычыне ўстойлівага клімату. У Паўночнай Еўропе гэты працэс расцягнуўся на тысячагоддзі, што звязана з адступленнем ледавікоў [2, с. 155]. Гэты перыяд вывучаны адносна слаба, паколькі людзі большай часткай вандравалі і часта мянялі месцы стаянак. Па гэтай прычыне іх культурны пласт вельмі тонкі, утрымлівае невялікую колькасць рэшткаў. Па характары грамадскіх адносін гэтая пераходная эпоха стаіць бліжэй да палеаліту, таму археолагі часта называюць гэты перыяд эпіпалеалітам (грэчаскае слова “эпі” азначае “на”, “пасля”, “звыш”) [3, с. 119].

У мезаліце ўпершыню склаліся рынкі абмену, якія ахоплівалі вялізныя тэрыторыі. Напрыкад, абсідыян з Турцыі і з Армянскага нагор'я шляхам абмену распаўсюдзіўся на ўвесь Блізкі і Сярэдні Усход і пастаўляўся нават у Месапатамію і Індыю. На Паўднёвым Урале і іншых месцах з'яў-

ляюцца майстэрні па вытворчасці каменных прылад, з іх паходзяць шматлікія вырабы з яшмы, горнага крышталю і абсідыяну [6, с. 132].

Людзі ў эпоху мезаліту будавалі наземныя і паўзямлянкавыя жытлы плошчай 10 – 20 кв. м. Яны былі звычайна лёгкімі востраверхімі буданамі з невялікімі агнішчамі ў сярэдзіне для прыгатавання ежы і абагрэву.

Пры цёплым надвор'і вогнішча палілі па-за межамі жытла. Пад канец мезаліту, калі чалавечае жыццё стала больш аселым, а колькасць насельніцтва павялічвалася, стаянкі сталі гусцей пакрываць берагі рэк і азёр, а жытло будавалася больш надзейным [8, с. 24].



Касцяны кінжал з Пегана (Курганская вобласць, Расія). Бачна прорезь для ўкладышаў і адзін укладыш



Прылады культуры Маглемозэ

Стаянкі былі каротка- і доўгатэрміновымі.

Асноўныя метады датавання мезалітычных помнікаў: радыёкарбонны, метад пылковага аналізу і параўнальна-тыпалагічны для асобных груп знаходак.

**3.2. Культуры мезаліту.** Найбольш даследаванымі мезалітычнымі культурамі Заходняй Еўропы з'яўляюцца *азільская і тардэнуазская*. Азільцы, культура якіх вельмі блізкая да арыньякскай, жылі пераважна ў пячорах і ўяўлялі сабой дробныя, збольшага адасобленыя адна ад другой групы. Яркай асаблівасцю іх культуры з'яўляюцца размаляваныя ці гравіраваныя галькі. Гэтыя галькі выкарыстоўваліся для магічных мэтаў, і іх нярэдка параўноўваюць з аўстралійскімі чурынгамі.

*Культура тардэнуаз* (VIII (VII) – V (IV) тыс. да н. ч., рэгіён Іспанія, Францыя, Бельгія, Брытанія, ФРГ, Польшча, Чэхія і Славакія) характарызуецца наяўнасцю мікралітаў, якія маюць 1 – 2 см у папярочніку. У гэты час адбываецца павелічэнне колькасці насельніцтва. Стаянкі размяшчаюцца па берагах рэк і азёр. Людзі жылі ў нетрывалых хіжынах,

часам у гротах. Некаторыя пасяленні размяшчаліся на прыморскіх берагах і адзначаны вялікай колькасцю ракавін малюскаў. У Партугаліі на р. Тахо вядомы некалькі пагоркаў, якія зроблены з ракавін. Пагоркі маюць даўжыню 100 м, шырыню 60 м, вышыню 7 м. Акрамя ракавін у пагорках знойдзены косткі аленяў, дзікоў, быкоў, птушак, рыб, а таксама вуглі, зала, каменныя і іншыя прылады. Нярэдка ў ракавінных пагорках знаходзяць пахванні ў дзесяткі і нават сотні магіл [7, с. 179].



Культура азіль. Гарпуны з рагоў аленя і размаляваныя галькі

У Паўночнай Еўропе вядома *культура маглемозэ* (ад Усходняй Англіі да Прыбалтыкі (7000 – 4600 гг. да н. ч.). Сезонныя пасяленні размешчаны па берагах балот і азёр. Людзі культуры маглемозэ паступова пераходзяць да аселага ладу жыцця [7, с. 186 – 187]. Гэтую культуру поўначы Еўропы напрыканцы эпохі змяняе культура кёккенмеддзінгаў (кухонных рэшткаў) ці ракавінных куч. Пагоркі кухонных рэшткаў дасягалі даўжыні 140 м, шырыні 30 – 40 м і вышыні каля 1,5 м (Данія). Насельніцтва вырабляла керамічны посуд. Пабудоў не выяўлена, верагодна, людзі жылі ў шалашах ці чумах, ад якіх не захавалася слядоў. Зафіксаваны сляды канібалізму, які, магчыма, з'яўляўся рытуальным, ці быў звязаны з недахопам ежы [7, с. 18].

Першая земляробчая культура была адкрыта ў пячоры Эль-Вад у Палестыне. Яна атрымала назву *натуфійскай* (ад назвы горнага патока Вадзі-эн-Натуф, які размешчаны ў 30 км на паўночны-захад ад Ерусаліма [3, с. 124]). Тут, на тэрыторыі Леванта, у познім мезаліце пражывалі абшчыны, якія па-ранейшаму займаліся збіральніцтвам і паляваннем, але сярод іх ужо пачалі існаваць аселыя калектывы. З'яўляюцца сталыя пасяленні накшталт Эйнана, дзе раскапана каля 50 круглых дамоў. Найбольш вядомая стаянка каля тэля Іерыхона. Нашчадкі натуфійцаў пабудавалі першы неалітычны горад на гэтым помніку [2, с. 181].

**3.3. Мезалітычныя індустрыі.** Асноўная тэхніка апрацоўкі каменю ў эпоху мезаліту – мікралітычная. Мікраліты – гэта дробная прылада, выкананая на пласціне ці адшчэпе, памерам меньш за 2,5 см. Выкарыстоўваліся пераважна ў якасці наканечнікаў стрэл [2, с. 158]. Таксама мікраліты замацоўваліся ў рогавой ці касцяной аснове для атры-

мання новых складовых прылад працы, такіх як нажы і кінжалы [6, с. 142]. Вучоныя даказалі, што мікраліты ў 100 разоў больш вострыя за сучасныя хірургічныя ланцэты. Мікралітычнымі вырабамі раней галіліся, у наш час вырабы з каменю выкарыстоўваюцца ў мікрахірургіі як інструмент.

Акрамя мікралітаў выкарыстоўваліся іншыя прылады: разцы, скраб-кі, сякеры, скоблі, праколкі, нажы, выраблены з крэменю, дрэва, косці.

**3.4. Мастацтва мезаліту.** Мастацтва мезаліту прадстаўлена наскаль-нымі выявамі і малюнкамі на камені. Дробная пластыка на косці амаль не захавалася па той прычыне, што мезалітычныя пасяленні былі размешчаны на пясчаных пагорках, а ў пяску косць амаль не захоўваецца [3, с. 130]. Малюнкі эпохі мезаліту адкрыты на тэрыторыі Узбекістана (цясніна За-раўт-Сай і пячора Зараўт-Камар). Першабытныя мастакі выкарыстоўвалі розныя адценні чырвонай мінеральнай фарбы, а таксама чорную, зрэдку белую фарбу. На тэрыторыі Заходняй Еўропы наскальны жывапіс за-хаваўся ў прыбрэжных раёнах Усходняй Іспаніі ці Іспанскага Леванта. Цэнтральная фігура мезалітычнага мастацтва, у адрозненні ад палеа-літычнага, – чалавек. Акцэнт зроблены на руху.



Усходнеіспанскія наскальныя выявы. Жывапіс цясніны Вальторга (Іспанія)

Цэнтральны сюжэт наскальнага жывапісу – сцэны палявання. У Валторзе была адкрыта цэлая серыя галерэй, якая ўключала ў сябе 15 выяўленчых ансамбляў. Асобныя з іх прысвечаны сцэнам барацьбы і ваенных сутыкненняў. Выявы жанчын сустракаюцца вельмі рэдка. На многіх наскальных роспісах жанчыны намаляваны статычна, яны апрануты ў строі: доўгія звонападобныя спадніцы з адкрытай верхняй часткай цела. Такія ж выявы адкрыты ў старажытным мастацтве Крыта і Паўночнай Афрыкі, таму існуе думка пра сувязь жаночых выяў з агульнымі рэлігійнымі ўяўленнямі [3, с. 132].

Існуе чатыры тыпы выяў людзей, якія адпавядаюць чатыром стадыям мезаліту:

1) натуралістычныя выявы з правільнымі прапорцыямі;

2) чалавечая фігура занадта вузкая ў таліі, галава круглай формы, верхняя частка цела ўтварае трохвугольнік, рукі вельмі тонкія, а ногі магутныя і доўгія;

3) галава адлюстравана ў профіль, торс звужаны і ўкарочаны, ногі непрапарцыянальна вялікія;

4) уся фігура і канечнасці намаляваны тонкімі і аднастайнымі лініямі.

Жывёлы намаляваны рэалістычна [3, с. 134].

## Літаратура


1. Алексеев, В. П. История первобытного общества: учеб. по спец. «История» / В. П. Алексеев, А. И. Першиц. – М. : Высш. шк., 1999.
2. Брей, У. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.
3. Гальперина, Г. А. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.
4. Заря человечества / пер. с англ. В. Федяниной. – М. : ТЕРРА-Книжный клуб, 1998.
5. Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов – М. : Высш. шк., 1996.
6. Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.
7. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.
8. Чарняўскі, М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд / М.М. Чарняўскі. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2003.


## Кантрольныя пытанні да тэмы 3

1. Назавіце храналагічныя межы мезаліту.
2. Вызначце этапы кліматычных зменаў у эпоху мезаліту.
3. Назавіце сутнасць новай стратэгіі адаптацыі паляўнічых-збіральнікаў у эпоху мезаліту.
4. Дайце характарыстыку раннепершабытнай мезалітычнай абшчыны.
5. Вызначце сутнасць тэрміна “эпіпалеаліт”.
6. Ахарактарызуйце асноўныя рынкі абмену мезаліту.
7. Ахарактарызуйце асноўныя тыпы жытлаў і стаянак мезаліту.
8. Назавіце асноўныя рысы азільскай і тардэнуазскай культур.
9. Дайце вызначэнне культуры маглемозэ.
10. Дайце характрыстыку першых земляробчых культур мезаліту.
11. Дайце характарыстыку асноўных тэхнік апрацоўкі каменю эпохі мезаліту.
12. Вызначце асноўныя рысы мезалітычнага мастацтва.

# 4. НЕАЛІТ

4.1. Агульная характарыстыка неаліту.
4.2. Прылады, асноўныя катэгорыі рэчаў і рамёствы неалітычнай эпохі.
4.3. Жытлы і пасяленні неалітычнай эпохі.
4.4. Гаспадарка неаліту.
4.5. Асаблівасці неаліту Еўропы.
4.7. Асаблівасці пахавальных помнікаў неаліту.
4.8. Мастацтва неаліту.

**4.1. Агульная характарыстыка неаліту.** Неаліт (грэч. néos (новы) + lithos (камень)) – новы каменны век – ахоплівае цёплы і вільготны атлантычны кліматычны перыяд (5500 – 3000 гг. да н. ч.) і пачатак сухога і цёплага суббарэальнага перыяда (да 500 г. да н. ч.). У розных частках айкумены пачаўся ў розны час. Так, у Месапатаміі і Егіпце быў развіты бронзавы век і ўжо пачыналі складвацца першыя рабаўладальніцкія дзяржавы, у Паўночнай Еўропе адбываўся самы росквіт неаліту, а на Крайняй Поўначы і паўночным усходзе Азіі людзі існавалі на палеалітычнай стадыі развіцця.

Агульныя храналагічныя рамкі неаліту – VI – IV тыс. да н. ч. – III тыс. да н. ч. З'явіліся новыя формы вядзення гаспадаркі – земляробства і жывёлагадоўля, людзі вынайшлі і шырока выкарыстоўвалі штучныя матэрыялы – тэкстыль і кераміку [2, с. 134 – 135].

Тэрмін "неалітычная рэвалюцыя" упершыню уведзены ў 1950 г. англійскім археолагам Вірам Горданам Чайлдам (1892 – 1957) па аналогіі з "індустрыяльнай рэвалюцыяй" Карла Маркса. Гэты тэрмін у археалогіі суіснуе разам з тэрмінамі "аграрная рэвалюцыя", "станаўленне вытворчай гаспадаркі". Неалітычная рэвалюцыя – гэта пераход чалавецтва ад існавання за кошт збіральніцтва і палявання да вытворчай гаспадаркі (жывёлагадоўлі і земляробства) [6, с. 165].



Пасмяротная маска жыхара Ерыхона

Упершыню пераход да земляробства з высокаарганізаванага збіральніцтва адбыўся на Блізкім Усходзе, на тэрыторыі г. зв. Урадлівага Паўмесяца.

Першыя дзікарослыя расліны, на якія звярнуў увагу чалавек, – эмер (пшаніца двузярнянка), эйнкор (пшаніца адназярнянка) і ячмень – давалі шмат зерня. Кожны гектар дзікарослых злакаў даваў каля 800 кг прыдатнага да ежы зерня. У перыяд выспявання зерня адна сем'я за тры тыдні магла сабраць столькі злакаў, колькі ёй хапала на цэлы год. Пры гэтым людзі выкарыстоўвалі касцяныя сярпы з крамянёвымі ўкладышамі [3, с. 96].



Старажавая вежа Іерыхона

Раней для групы паляўнічых-збіральнікаў з 25 чалавек патрабаваўся ўчастак зямлі плошчай каля 650 кв. км, зараз для 150 земляробаў – усяго толькі 15 кв. км.

Першыя даместыкаваныя (ахатненыя) жывёлы былі авечкі (9 тыс. гадоў да н. ч., Шанідар, Ірак і Іерыхон, Ізраіль), козы (7 тыс. г. да н. ч., Алі-Кош, Іран і Іерыхон, Ізраіль), свінні (7 тыс. гадоў да н. ч., Чэйнюню, Турцыя), быкі і каровы (6,5 тыс. гадоў да н. ч., Аргос, Грэцыя і Чатал-Хююк, Турцыя) [3, с. 96 – 97].

Такім чынам, адрозненні развіцця неалітычных грамадстваў залежалі ад розных фактараў, у першую чаргу, прыродных. Там, дзе ўмовы жыцця былі спрыяльнымі, колькасць насельніцтва нязменна павялічвалася і людзі вымушаны былі пераходзіць да вытворчай гаспадаркі (краіны Урадлівага Паўмесяца, Паўночна-Ўсходні Егіпет, Паўднёва-Ўсходні Кітай). Уляснай

зоне Еўразіі і Амерыкі неалітычныя традыцыі засвойваліся часткова, а тэмпы пераходу да вытворчай гаспадаркі былі значна замаруджаны. Дынаміка распаўсюджвання вытворчай гаспадаркі першых цывілізацый выглядае наступным чынам:

- каля 9 – 8 тыс. гадоў да н. ч. у Месапатаміі былі даместыкаваныя авечкі;
- каля 8 – 7 тыс. гадоў да н. ч. у Мексіцы культывуюцца некаторыя расліны, пшаніца, ячмень і бабовыя вырошчваюцца людзьмі ў краінах Урадлівага Паўмесяца;
- каля 7 – 6 тыс. г. да н. ч. на Балканах, у Заходнім і Цэнтральным Міжземнамор'і развіваецца сельская гаспадарка, акультурваюцца збожжавыя, даместыкуюцца авечкі і козы, на тэрыторыі Перу пачынаецца культывацыя раслін. Пшаніца, ячмень і бабовыя з Анатоліі (сучасная Турцыя) трапляюць на тэрыторыю Пакістана, адамашваюцца свінні і быкі. У Анатоліі быў заснаваны Чатал-Хююк, першае сталае пасяленне;
- каля 6 – 5 тыс. гадоў да н. ч. сельская гаспадарка распаўсюджваецца на тэрыторыі Заходняй Еўропы да Нідэрландаў, былі адамашаны паўночна-афрыканскія быкі ў раёне Сахары, існуе першая вядомая ірыгацыйная сістэма ў Месапатаміі. Земляробчыя пасяленні ўзнікаюць на тэрыторыі Кітая. Тут вырошчваюць проса, разводзяць сабак і свіней. На ўсходнім узбярэжжы Кітая культывуецца рыс;
- каля 5 – 4 тыс. гадоў да н. ч. ў еўразійскіх стэпах былі даместыкаваны коні;
- каля 4 – 3 тыс. гадоў да н. ч. просты плуг выкарыстоўваўся ў некаторых абласцях Паўночнай і Заходняй Еўропы, адкрыты спосаб перамяшчэння на колах, на тэрыторыі Мексікі быў акультураны маіс, адамашаны гуанака і іншыя жывёлы з роду лам. На тэрыторыі Паўднёвай Месапатаміі ўзнікла першае ў свеце гарадская супольнасць. Вынайдзены ганчарны круг, узнікае пісьмовасць. На тэрыторыі Карэі пачынае вырошчвацца проса [3, с. 166 – 167].

Класічнымі помнікамі раннеземляробчай культуры з'яўляюцца пасяленні Хаджылар (паўднёвы-ўсход Малой Азіі), Чэйнюню-тэпэсі і Чатал-Хююк (Пярэдняя Азія) (7250 – 6750 гг. да н. ч.). Ранняя вытворчая гаспадарка зарадзілася і ў Заходнім Іране (культура тыпу Джармо, VII – VI тыс. да н. ч.) [5, с. 86 – 87].

З цягам часу былі адкрыты карысныя ўласцівасці тэхнічных культур: з насення ільну людзі здабывалі алей, а валакно раслін выкарыстоўвалі ў ткацтве. Жыхары Шумера і Месапатаміі вырошчвалі не менш васьмі відаў

зерня для атрымання соладу. У V тыс. да н. ч. вырошчваўся вінаград, вінаграднае віно з Паўднёвай Месапатаміі ўвозілі ў Егіпет каля 3 тыс. гадоў да н. ч. [3, с. 100].



Неалітычныя сярпы

Традыцыі збіральніцтва і палявання доўжыліся да тых часоў, пакуль дзейнасць чалавека не прыводзіла да знікнення пэўных відаў жывёл. Напрыклад, жыхары пасялення Абу Хурэйра (Паўночная Сірыя) прыстасаваліся да летніх міграцый газэляў. Для статкаў газэляў рабілі спецыяльныя пасткі з дзвюх каменных сцен, якія звужаліся на клін, замкнёны круглай тэрасай дыяметрам каля 150 м. Масавы забой газэляў прывёў да знікнення гэтага віду на Блізкім Усходзе каля 6300 гадоў да н. ч. [3, с. 100].

Відавочныя якасныя змены ў спосабах атрымання ежы абумовілі станаўленне протагарадоў. Адным з першых протагарадоў Урадлівага Паўмесяца з’яўляецца Іерыхон (VIII – VII тыс. да н. ч.), насельніцтва якога складала каля 3 тыс. чалавек. Гэтае пасяленне з’яўлялася не толькі цэнтрам земляробчай акругі, але і буйным менавым цэнтрам. Тут жыхары суседніх рэгіёнаў абменьвалі абсідыян, соль, паўкаштоўныя камяні і прадметы раскошы, напрыклад ракавіны каўры і зялёны малахіт [3, с. 99]. Першыя протагарадскія цэнтры Месапатаміі забудоўваліся дамамі з цэглы-сырца. Плошча такіх пасяленняў была каля 4 – 5 га. У кожным доме было вогнішча. Побач з дамамі знаходзіліся свіраны для зерня. Каля дамоў маглі размяшчацца майстэрні і вытворчыя комплексы. Адбылася спецыялізацыя працы: адны майстры рабілі касцяныя прылады (зашпількі, пацеркі, каралі і інш.), другія апрацоўвалі камень, іншыя спецыялізваліся на мясной справе. У IV тыс. да н. ч. з’явілася высокатэмпературная печ для абпалу керамікі. У Месапатаміі зарадзілася культавае дойлідства: прататыпам храма зіккурата сталі вялікія дамы, раскапаныя археолагамі ў пасяленні Эрыду паблізу Ура [3, с. 104].

Побач з першымі выгодамі цывілізацыі з’явіліся і праблемы. Многія людзі жылі ў протагарадах, дзе была высокая шчыльнасць насельніцтва. Эпідэміі сталі насіць масавы характар. Колькасць насельніцтва ад эпохі

мезаліту да неаліту павялічылася стократна, а сярэдняя шчыльнасць насельніцтва – з 0,04 на кв. км да 1 чалавека на кв. км. Адбываецца першы ў гісторыі чалавецтва “дэмаграфічны выбух” [7, с. 200].



Крэмнездабыўныя шахты

Рост колькасці насельніцтва прыводзіў да павелічэння відаў прылад працы і зброі. Дэфіцыт крэменю як асноўнай сыравіны для вытворчасці прылад працы абумовіў з’яўленне вялікай колькасці касцяных вырабаў. З другога боку, попыт на крэмень павялічыўся да такой ступені, што пачалася яго здабыча шахтавым спосабам у так званых крэйдавых радовішчах. Крэмнездабыўныя шахты вядомы ў Еўропе пад Сісбуры, Граймз-Грэйвз (Вялікабрытанія), Мюр-дэ-Барэ і Шампіньёль (Францыя), Кшэмёнках Апатоўскіх (Польшча) і інш. [4, с. 64]. Крэмнездабыўныя шахты на тэрыторыі Беларусі былі адкрыты на ўзбярэжжы ракі Рось і ў наваколлі пасёлка Краснасельскі Ваўкавыскага раёна на Гродзеншчыне. Для здабычы крэменю ў крэйдзе выкопваўся вертыкальны калодзеж – ствол будучай шахты. Шырыня яго – да палутара, глыбіня – два-тры і больш метраў. Шахта распрацоўвалася не толькі вертыкальна, але і гарызантальна – падбоямі. Падбоі нярэдка злучаліся штрэкамі, невялікімі адтулінамі. Шахта распрацоўвалася завостранымі каламі, а падбоі – гарняцкімі кіркамі з рагоў высакароднага аленя, ці капачамі з рогавых адросткаў. Час распрацоўкі крэмнездабыўных шахтаў датаваны па радыёвугляроду 3 – 2 тыс. да н. ч. [8, с. 68 – 69].



Рогавы капач і кірка

**4.2. Прылады, асноўныя катэгорыі рэчаў і рамёствы неалітычнай эпохі.** Новымі каменнымі прыладамі неаліту сталі макрасы – сякера, кірка, далато, стамеска і цёслы. З'явілася тэхніка шліфавання, свідравання і пілавання каменю. У першую чаргу гэта датычылася прылад, зробленых з нефрыта і яшмы. Паступова шліфаванне сталі выкарыстоўваць і для крамянёвых вырабаў. Спачатку шляхам аббіўкі атрымлівалі неабходныя нарыхтоўкі, якія пасля апрацоўвалі на плоскім камяні. У якасці шліфавальніка выкарыстоўвалі вільготны пясок. Акрамя таго, яго падсыпалі і пад канец полай трубачкі падчас свідравання каменю [2, с. 138 – 139].

З'яўленне новых прылад было абумоўлена аселым ладам жыцця, патрэбай асвойваць лясныя прасторы. Вучоныя эксперыментальным шляхам вызначылі, што неалітычная сякера стала высокапрадукцыйнай прыладай, з яе дапамогай сасна дыяметрам 25 см была зрублена за 15 хвілін [2, с. 138 – 139].

Аднак гэтыя спосабы апрацоўкі каменю былі надзвычай працаёмкімі і людзі па-ранейшаму карысталіся прыладамі, зробленымі з разнастайных парод каменю, але з перавагай крэменю. Старыя спосабы апрацоўкі каменю аббіўкай, сколваннем і аджымам па-ранейшаму пераважалі, а тэхніка адціскання дасягнула найвышэйшага росквіту [7, с. 196].

У лясной зоне Еўропы звычайнымі сталі зрубныя дамы-паўзямлянкі. Дах падтрымліваўся слупамі, перакрыцце даху рабілі са скур жывёл ці кары дрэў. У летні час людзі жылі каля адкрытых вогнішчаў [2, с. 139].



Печ для абпалу керамікі, Блізкі Ўсход

Неалітычныя сеці для лоўлі рыбы знойдзены на тэрыторыі Латвіі (Сарнцкі тарфянік). Сеці плялі з ніцяў, якія выраблялiся з лыка, дзікарослай каноплі ці крапівы. Для вязання сецяў выкарыстоўвалі спецыяльныя іглы. Археолагі знайшлі каменныя грузілы, вялікія і маленькія складовыя рыбалоўныя кручкі. Рыбу вудзілі вудамі і перамётамі [2, с. 140].

Асноўным спосабам вырабу керамічнага посуду з'яўляўся жгутавы налеп. З вільготнай гліны рабілі жгуты даўжынёй да 0,5 м і таўшчынёй 3 – 4 см, якія затым па спіралі накладвалі на форму будучага гаршчка. Пасля гэтага выраб загладжвалі, высушвалі на паветры і абпальвалі ў спецыяльных печах. Першыя гаршчкі былі вострадонныя, іх усталёўвалі ў неглыбокіх ямах, а вакол раскладвалі вогнішча [2, с. 140]. Наяўнасць керамікі стала характэрнай прыкметай неаліту да такой ступені, што археолагі часта называюць гэтую эпоху "керамічным стагоддзем" [7, с. 197]. Аднак ў асобных раёнах захоўваліся ўсе рысы неаліту, але кераміка не ўжывалася, таму ў археалогіі існуе тэрмін "бескерамічны неаліт" [7, с. 197].

Прадзенне і ткацтва – яшчэ адна прыкмета неаліту. Валокны для прадзення ніцяў спачатку выраблялі з крапівы, дзікай каноплі і з лыка дрэў. Пасля сталі прасці з поўсці авечкі і валакна дзікарослага ільну. Ткалі доўгі час без ткацкага станка, г. зн. фактычна плялі [7, с. 199]. Рэканструкцыя ткацкага станка зроблена па знойдзеных фрагментах тканін ці іх адбіткаў на кераміцы, а таксама грузаў ад ткацкага станка. Г. зв. гарызантальны ткацкі станок быў больш распаўсюджаны ў Егіпце, вертыкальны – у Сірыі і Месапатаміі. У Еўропе карысталіся вертыкальным ткацкім станком. Грузікі розных тыпаў часта сустракаюцца на пасяленнях, пачынаючы з позняга неаліту і асабліва ў бронзавым веку. У Амерыцы існаваў рамянны ткацкі станок [1, с. 246].



Неалітычны гаршчок з арнаментам дзэмон, Японія

**4.3. Жытлы і пасяленні неалітычнай эпохі.** У 1854 г. у Швейцарыі былі адкрыты пасяленні на па́лях. Дамы будаваліся ў прыбярэжнай зоне Цюрыхскага возера ў познім неаліце і бронзавым веку. Такія ж пасяленні былі адкрыты ў Паўночнай Італіі, Паўднёвай Германіі, Аўстрыі, Ірландыі, Вялікабрытаніі, Швецыі, Паўночнай Беларусі і Паўночнай Расіі. У дамах на палях з'явілася першая мэбля: сталы, крэслы і скрыні (пасяленне на Бодэнскім возеры каля вёскі Робенгаўзэн, Швейцарыя). Для перамяшчэння па вадзе людзі выкарыстоўвалі чоўны, зробленыя з цэльнага ствала дрэва [2, с. 143].

Жыхары выспавага пасялення Скара-Брэй (Шатландыя) жылі ў дамах, зробленых з каменю. Такія дамы ў III тыс. да н. ч. размяшчаліся ў вялізных сметніцах з раслінных рэчываў, ракавін і камянёў. Унутры насыпу рабілі жылыя памяшканні, якія злучаліся праходамі. З усіх бакоў сцены выкладваліся пакладзенымі без рошчыны камянямі.




План дамоў пасялення Скара-Брэй (Шатландыя)

Пасяленні эпохі неаліту павялічваюцца па плошчы. Тыпы жытлаў разнастайныя: ад Галандыі да Дуная вядомы доўгія дамы з мноствам вогнішчаў. Гэтыя дамы з’яўляліся месцам жыхарства адной вялікай сям’і. У Цэнтральнай Еўропе і на Балканах вядомы жытлы індывідуальнай аднапакаёвай структуры. Гэта былі прамавугольныя дамы (9,5 м у даўжыню і 5 м у шырыню) з астовамі з масіўных, замацаваных у зямлі слупоў. Сцены зроблены з лазняку ці рашчэпленых ствалоў дрэў і абмазаны глінай з гноем. Такія дамы часам былі падзелены на ганак (сені) і адзін пакой. Гаспадарка пасяленняў была абшчыннай. Магчыма, пераважаў матрыярхат [7, с. 199].

**4.4. Гаспадарка неаліту.** Гаспадарка ў неаліце з’яўлялася пераважна вытворчай. У Еўропе людзі вырошчвалі ячмень, пшаніцу, авёс, жыта, прычым апошняе з’яўлялася пустазеллем у пасевах пшаніцы і ячменю. Было вядома проса, бабовыя культуры: гарох, фасоль, віка,

чачавіца. На тэрыторыі Швейцарыі знойдзены сляды вырошчвання морквы, кмену, маку і лёну. Лён выкарыстоўваўся для атрымання алею, а пасля і для ткацтва. Вельмі старажытнымі з'яўляюцца фруктовыя дрэвы, яблыкі вядомы ў Швейцарыі і Англіі, інжыр і грушы вырошчвалі ў Грэцыі [7, с. 203].

Невядома аднак, ці ўзнікла жывёлагадоўля і земляробства ў адзіным комплексе "змешанай" гаспадаркі ці развіліся ў розных плямён як самастойныя віды вытворчасці [7, с. 202].

**4.5. Асаблівасці неаліту Еўропы.** У неаліце Заходняй Еўропы ўжо былі прадстаўлены ўсе сучасныя антрапалагічныя тыпы еўрапейцаў. Археалагічныя культуры неаліту вельмі разнастайныя. Частка з іх, пераважна культуры лясной зоны, па-ранейшаму займаліся збіральніцтвам і паляваннем. Развіццё гаспадаркі крочыла па шляху ўдасканальвання прылад палявання і рыбнай лоўлі. Наканечнікі стрэл з косці і каменю, каменныя сякеры і цёслы становяцца разнастайнымі па тыпах. Толькі напрыканцы неаліту некаторыя плямёны пераходзяць да жывёлагадоўлі. Позні этап неаліту ў некаторых гаспадарках Паўночнай Еўропы і Сібіры датуецца III – сярэдзінай II тыс. да н. ч. [5, с. 94].

Кераміка сустракаецца на помніках некаторых еўрапейскіх культур, якія захавалі мезалітычныя рысы матэрыяльнай культуры. Такая культура мае назву *кампінійская* (Францыя, Бельгія). Асноўны занятак насельніцтва – паляванне на аленяў, дзікіх коней і быкоў, а таксма рыбалоўства. Людзі вырошчвалі ячмень, аднак шырока гэтая культура не распаўсюдзілася. Адзінай хатняй жывёлай заставаўся сабака [7, с. 203 – 204]



Гаршчок з Чатал-Хююка

Жылі людзі ў невялікіх круглых (дыяметрам 5 – 6 м) паўзямлянках. Побыт насельніцтва быў паўаселым. Яны пераходзілі па сезонах на паляўнічыя ўгоддзі ці рыбалоўныя тоні [7, с. 204].

На тэрыторыі Грэцыі (Фесалія, Атыка) вядомы тэлі – штучныя пагоркі, утвораныя на месцы працяглага пражывання неалітычнага насельніцтва з дамамі, зробленымі з цэглы-сырца. Культурны пласт тэляў мае магутнасць 8,5 м, вядомы тэлі вышынёй 30,5 м і больш. Тэрмін "тэль" арабскага паходжання, сінанімічныя значэнні вядомы ў персідскай мове: "тэпе" і турэцкай: "хююк" [1, с. 241]. Жытлы грэчаскіх тэляў рабілі з

плятня, які абмазваўся глінай [7, с. 205]. Неалітычная культура Фесаліі і Атыкі была земляробчай і жывёлагадоўчай. Кераміка стала вядома ў сярэдзіне неаліту [7, с. 216].



Арнаментаваная частка амфары з пахавання шарападобнікаў каля в. Малыя Ёдкавічы



Амфара з пахавання каля Малых Ёдкавіч

Найбольш вывучана *культура лінейна-стужкавай керамікі* Заходняй і Цэнтральнай Еўропы (V тыс. да н. ч.). Яна распаўсюджана ад Белграда да Брусэля і ад Рэйна да Віслы і Днястра (Чэхія, Славакія, Германія, Паўднёвыя Нідэрланды, тэрыторыі паблізу Парыжа ў Францыі, Валахія, паўночны-ўсход Румыніі). Плямёны займаліся жывелагадоўляй і матыжным земляробствам. Людзі жылі ў лясной зоне на паселішчах плошчай да 30 тыс. кв. м (Кёльн-Ліндэнталь, Германія). Грунтовыя могільнікі прадстаўлены пахаваннямі людзей ў скручаным стане, на баку, радзей выцягнутымі на спіне касцякамі. У могілках знойдзены кераміка і каменныя прылады: матыкі – ў мужчынскіх і жаночых пахаваннях, зернацёркі – толькі ў жаночых. У познім неаліце з’яўляецца абрад крэмацыі. Спаленыя косткі хавалі ў гаршках, а пахаванні з трупаспаленнем – пад падлогай жытлаў [7, с. 224 – 231].

Неаліт Беларусі ў цэлым адпавядаў развіццю неалітычных гаспадарак лясной зоны Еўропы. Асноўнымі культурамі гэтага часу з’яўляюцца *верхнедняпроўская, днепра-данецкая, нарвенская, нёманская.* Важна тое, што ўсе гэтыя культуры ўваходзілі ў зону распаўсюджвання цэнтральна- і ўсходне-еўрапейскіх культур грабеньчата-накольчатай керамікі. Пахавальных помнікаў гэтага часу на Беларусі не выяўлена. Магчыма, памерлых хавалі не ў зямлі, а нейкім іншым спосабам.

Першыя земляробча-жывёлагадоўчыя культуры Беларусі – гэта супольнасці плямён *шарападобных амфар*. Яны рассяліліся на Беларусі з тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы ў другой палове III тыс. да н. ч. Новае насельніцтва разводзіла кароў, свінняў, авечак, коз, коней і сабак. Насельніцтва культуры шарападобных амфар пачало здабываць крэмень шахтавым спосабам. У адрозненні ад культур грабеньчата-накольчатай керамікі, тут вядомы пахаванні культуры шарападобных амфар (каля в. Малыя

Ёдкавічы Бераставіцкага раёна на Гродзеншчыне). Нябожчыкаў хавалі ў доўгіх ямах з каменнымі плітамі ці каменнай вокладкай. Дно ямы выбрукоўвалі, зверху перакрывалі каменнем ці дрэвам. Атрымлівалася памяшканне для памерлага, дзе прыбудоўвалі нават калідор-уваход. Нябожчыка хавалі ў скручаным стане. Тут жа змяшчалі гліняны посуд, упрыгожванні, некаторыя прылады працы, запасы мяса і інш. [8, с 47 – 48].

**4.6. Асаблівасці пахавальных помнікаў неаліту.** Статус пахаванага чалавека, акрамя ўласна інвентара, вызначала наяўнасць у пахаванні іншых асоб (жонак; магчыма, рабоў). Цэлыя шкілеты людзей сустракаюцца вельмі рэдка. Яшчэ да пахавання нябожчыка яго цела рассякалі на часткі, некаторыя косткі маюць сляды ўздзеяннню агню. Гэта можа сведчыць як пра існаванне культу агню, так і пра магчымае канібальства [8, с 47 – 48].

Самым вялікім адкрытым познепалеалітычным могільнікам на тэрыторыі Ўсходняй Еўропы з’яўляецца *аленевостраўскі*, адкрыты на адным з астраваў Анежскага возера. Прызначэнне крамянёвага інвентара сведчыць, што асноўным заняткам насельніцтва было паляванне і збіральніцтва. Быў распаўсюджаны культ жывёл, асабліва лася і мядзведзя [1, с. 181]. Другі найвялікшы могільнік эпохі неаліту знаходзіцца на тэрыторыі Белуджыстана (горны раён, які падзяляе бязлюдныя плато Афганістана і Ірана) на месцы тэля Наль. Абрад прадугледжваў расчляненне целаў памерлых, у могілках знаходзіліся часткі шкілетаў з керамікай [1, с. 169].



Разрэз неалітычнага дома Чатал-Хююка

Жыхары Чатал-Хююка хавалі памерлых пад падлогай дома. Шкілет загортвалі ў цыноўку і клалі пад месцам, дзе спала маці з дзецьмі. Калі хтонебудзь паміраў, жыхары Чатал-Хююка адносілі труп на ўзвышша каля пасялення, каб грыфы і насякомыя аб’елі цела да костак. Пасля шкілет забіралі і хавалі падчас веснавых свят, калі рамантаваліся сцены і дахі дамоў [3, с. 125].



Забудова Чатал-Хююка

**4.7. Мастацтва неаліту.** Мастацтва неаліту – гэта значная культурна-гістарычная з’ява. Неалітычнае мастацтва прадстаўлена арнаментам на керамічным посудзе, дробнай пластыкай (фігуркі жывёл, птушак і людзей) і наскальнымі выявамі. На звернутых да поўдня скалістых берагах рэк і азёр ствараліся цэлыя галерэі выяў – г. зв. петрогліфы, ці пісаніцы [7, с. 109].

Скалы з петрогліфамі, верагодна, з’яўляліся культавымі цэнтрамі неалітычных плямёнаў, свайго роду капішчамі. Асноўны матыў роспісу – сцэны палявання на жывёл, рыбная лоўля, паведамленні аб паходжанні рода і інш. Некаторыя выявы наносіліся цвёрдым каменным наканечнікам, ствараліся сапраўдныя рэльефы. Асаблівасць мастацкага стылю – плоскасныя профільныя выявы жывёл. Чалавечыя фігуры малявалі ў фас,

з павернутай у профіль галавой. Прапорцыі, як правіла, не захоўваліся [5, с. 112 – 113].



Малюнак на сцяне дома пасялення Чатал-Хююк з выявай пахвальнага рытуала



Наскальны жывапіс Сахары (X – V тыс. да н. ч.)

## Літаратура


1. Брей, У. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.
2. Гальперина, Г. А. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.
3. Заря человечества / пер. с англ. В. Федяниной. – М. : ТЕРРА-Книжный клуб, 1998.
4. Крывальцэвіч, М. Археалягічныя адкрыцьці сьвету / М. Крывальцэвіч. – Мінск : Atheneum, 2000.
5. Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов – М. : Высш. шк., 1996.
6. Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

7. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век. / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.
8. Чарняўскі, М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд / М.М. Чарняўскі. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2003.

**Кантрольныя пытанні да тэмы 4**

1. Вызначце агульныя храналагічныя рамкі неаліту.
2. Пералічыце асноўныя формы вытворчай гаспадаркі неаліту.
3. Дайце характарыстыку працэсу перахода да земляробства ў краінах Урадлівага Паўмесяца.
4. Назавіце першых адамашаных жывёл неалітычнай эпохі.
5. Назавіце асноўныя протагарады эпохі неаліту і першыя цэнтры вытворчай гаспадаркі.
6. Назавіце першыя культурныя расліны неаліту.
7. Дайце характарыстыку домабудаўніцтву Месапатаміі ў неаліце.
8. Дайце характарыстыку працэсу здабычы крэменю ў неаліце. Чым абумоўлена ўзрастанне попыту на крэмень?
9. Якія новыя каменныя прылады з’явіліся ў неаліце? Як адбывалася эвалюцыя спосабаў апрацоўкі каменю?
10. Дайце характарыстыку жытла лясной зоны Еўропы ў эпоху неаліту. Асаблівасці забудовы пасялення Скара-Брэй.
11. Назавіце прыёмы і спосабы рыбнай лоўлі ў неаліце.
12. Назавіце асноўныя спосабы вырабу керамічнага посуду ў неаліце.
13. Ахарактарызуйце першыя спосабы прадзеня і ткацтва.
14. Вызначце шляхі распаўсюджвання земляробства ў Еўропе.
15. Вызначце сутнасць тэрміна “неалітычная рэвалюцыя”.
16. Вызначце сутнасць кампінійскай культуры.
17. Вызначце тэлі, тэпі, хююкі.
18. Назавіце асноўныя рысы культур лінейна-стужкавай керамікі.
19. Дайце агульную характарыстыку неаліту Беларусі.
20. У чым спецыфіка пахавальнага абраду неалітычнай эпохі? Якія буйныя могільнікі гэтага часу вы ведаеце?
21. Дайце пашыраную характарыстыку мастацтва неаліту.

# 5. ЭНЕАЛІТ І БРОНЗАВЫ ВЕК

5.1. Агульная характарыстыка энеаліту і бронзавага веку.
5.2. Індаеўрапейская праблема. Першыя індаеўрапейскія культуры Еўразіі.
5.3. Каўказскі цэнтр бронзаліцейнай металургіі.
5.4. Культуры вытворчага энеаліту і бронзавага веку Еўропы.
5.5. Культуры бронзавага веку Сярэдняй Азіі і Закаўказзя.
5.6. Мастацтва бронзавага веку.

**5.1. Агульная характарыстыка энеаліту і бронзавага веку.** Бронзавы век – перыяд развіцця чалавецтва, калі шырока распаўсюдзіліся выраблены з бронзы прылады працы і зброя, якія выкарыстоўваліся побач з каменнымі ці замест іх. Бронза ўяўляе сабой сплаў медзі і волава, зрэдку сурмы, свінца, мыш'яка ці цынка ў розных прапорцыях. Лепшыя суадносіны – 90% медзі і 10% волава. Вынаходніцтву бронзы папярэднічала вынаходніцтва медзі, але медныя прылады атрымалі меншае распаўсюджванне, чым бронзавыя, таму што бронза плавіцца пры тэмпературы 700 – 900 С, тады як медзь – 1083 С [9, с. 2].

Пераход паміж неалітам і бронзавым векам археолагі называюць эпохай палеаметала ці энеаліту (медна-каменны век), другая назва – "халкаліт" (па-грэчаску азначае "медзь"). Энеаліт Сярэдняй Азіі характарызуецца тым, што у гэты час пашыраецца мяжа вытворчай гаспадаркі, утвараюцца буйныя зоны вытворчых цэнтраў. Пры гэтым перавагу мела жывёлагадоўля як форма вытворчай дзейнасці. Жывёлагадоўля давала больш хуткую вытворчасць прадуктаў харчавання пры больш нізкіх у параўнанні з земляробствам, асабліва ірыгацыйным, выдатках [6, с. 115].

У краінах субтрапічнай зоны адбываецца другі падзел працы паміж рамяством і сельскай гаспадаркай. Пачынаюць фарміравацца класы і ўтвараюцца першыя рабаўладальніцкія дзяржавы [2, с. 167]. Пачынаюць фарміравацца вялікія этнічныя супольнасці, якія абумовілі сучаснае этнічнае становішча свету. Адной з такіх вялікіх супольнасцей, якая пачала фарміравацца ў энеаліце, з'яўляецца індаеўрапейская. Вывучэнню яе паходжання прысвечаны шматлікія навуковыя працы.

Аднак ні медныя, ні бронзавыя прылады не выцяснілі каменныя. Прычыны гэтаму былі наступныя: 1) рабочыя ўласцівасці каменю часам пераўзыходзілі ўласцівасці бронзы; 2) камень, які выкарыстоўваўся для вытворчасці, знаходзіўся паўсюдна, а крыніцы здабычы медзі, а тым больш волава, былі вельмі абмежаваныя [9, с. 2].

Дакладных храналагічных рамак эпох энеаліту і бронзы не існуе. Найбольш раннія вырабы з бронзы вядомы ў сярэдзіне IV тыс. да н. ч. у

Паўднёвым Іране і Месапатаміі. На мяжы III і II тыс. да н. ч. бронзавая індустрыя распаўсюдзілася ў Малой Азіі, Сірыі, Палестыне, на Кіпры і Крыце, Каўказе і Сярэдняй Азіі, а ў II тыс. – па ўсёй Еўропе і Азіі. Канец бронзавага веку наступіў, калі бронзу ў вытворчасці прылад працы выцясняе жалеза. Такім чынам, для большасці краін Еўропы бронзавы век ахоплівае II тыс. да н. ч. Медныя руднікі адкрыты на шырокіх абшарах Еўропы, а здабыча волава – толькі на тэрыторыі Чэхіі, Англіі, на паўвыспе Брэтань, на паўночным-захадзе Пірэнейскай паўвыспы [6, с. 144; 9, с. 2].

Здабыча руды ажыццяўлялася спачатку з паверхні, а пасля шахтавым спосабам. Медныя капальні знойдзены ў Іберыі і Італіі, у раёне Зальцбурга і ў Цыролі. Горныя пароды награвалі агнём, распаленыя пласты палівалі вадой і яны расколваліся. У рашчэліны каменнымі малаткамі забівалі драўляныя кліны. Іх панамочвалі і натуральная сіла набухання адшчапляла кавалкі пароды, а затым і руды. Руду разбівалі вялізнымі каменнымі молатамі і падымалі на паверхню зямлі. На паверхні руду драбілі, расціралі ў парашок камянямі накшталт зернацёрак і прамывалі ў драўляных карытах, абпальвалі і, нарэшце, плавілі ў печах. Печы будавалі з камянёў і абмазвалі глінай [9, с. 3].

Некаторыя капальні дасягалі значнай глыбіні (Міттэрберга (Аўстрыя) – 100 м і болей). Агульная колькасць здабытай у Міттэрберзе руды за два-тры стагоддзі склада каля 14 тыс. тон. Вялікія капальні з’яўляліся крыніцай сыравіны для ўсёй Еўропы [9, с. 3].

Бронза ў злітках з’яўлялася аб’ектам міжплемяннога абмену і распаўсюджвалася далёка ад месцаў сваёй вытворчасці. Нізкая тэмпература плаўлення дазваляла выплаўляць бронзу на адкрытых вогнішчах практычна на кожным пасяленні [9, с. 3].

Першыя вырабы з металаў – гэта поўная імітацыя каменных прылад. Першыя медныя сякеры плоскія і доўгія, з кароткім лязом без правушыны. Паступова з’явіліся бронзавыя сякеры, долаты, молаты, кайла, матыкі, сярпы, нажы, кінжалы, мячы, сякеры, наканечнікі дзідаў, стрэл і т. п. [9, с. 4].

Для развітага бронзавага веку Заходняй Еўропы характэрны дзве формы сякер: пальштаб – сякера з закраінамі для мацавання на дзяржанні, кельт – з утулкай, размешчанай перпендыкулярна лязу.

У познім бронзавым веку адбываецца значны прагрэс ў тэхніцы апрацоўкі металу: пачынаецца адліўка вырабаў у форме, коўка і выраб тонкіх пласцін. З каштоўных металаў найбольш цанілася золата, цэнтры яго здабычы – Ірландыя і Трансільванія. Срэбра здабывалі на тэрыторыі Паўднёва-Ўсходняй Іспаніі і ў Эгейскай вобласці [9, с. 4].

Сельская гаспадарка ў Еўропе пераважна мела змешаны характар. У параўнанні з неалітам палепшыліся пароды хатніх жывёл. Верагодна, ў бронзавым веку развіваецца малочная жывёлагадоўля. Жывёл выкарыстоўвалі як цяглавую сілу. У сярэдзіне II тыс. да н. ч. коней выкарыстоўвалі як запражную жывёлу ў баявых калясніцах, для перавозкі людзей і грузаў.

Развіццё жывёлагадоўлі спрыяла пашырэнню земляробства. У эпоху ранняй бронзы ў Еўропе пераважала матыжнае земляробства, але ўжо з'явіўся драўляны плуг. Плугі знойдзены ў балотах умеранай зоны Еўропы (Швейцарыі, Даніі, Германіі). Выявы плугавай вупражы вядомы сярод наскальных малюнкаў Швецыі і Італіі. Уласна гэта быў яшчэ не плуг, а саха [9, с. 5].

У бронзавым веку зараджаецца грамадскі падзел працы. З'яўляюцца ў значнай колькасці скарбы, ці склады матэрыялаў і прадметаў, вырабленых бронзаліцейшчыкамі. Гэтыя скарбы знойдзены ўздоўж галоўных гандлёвых шляхоў. Пашырэнне абмену садзейнічала з'яўленню караблёў на вёслах і ветразях, колавых павозак [9, с. 5].

Вытворчы працэс станавіўся ўсё больш індывідуальным. Калектыўная гаспадарка і калектыўная ўласнасць родавых абшчын пераўтваралася ў прыватную гаспадарку асобных сем'яў. Гэта стварыла ўмовы для грамадскай няроўнасці паміж членамі рода. Адбываецца пераход ад родавых сувязей да тэрытарыяльных, пераўтварэнне родавай абшчыны ў суседскую. Спадарожнік гэтага працэсу – павелічэнне колькасці міжродавых сутыкненняў. З'яўляецца невядомая раней спецыялізаваная зброя (мячы, алебарды, кінжалы і інш.). Рэвалюцыйную ролю ў ваеннай справе адыграла калясніца, вядомая ў Еўропе з сярэдзіны II тыс. да н. ч. [9, с. 5].

У пачатку бронзавага веку ў Еўропе склаліся патрыярхальна-родавыя адносіны, дзе мужчына безумоўна дамінаваў у сям'і і родзе. Родавая знаць паступова акумулявала ў сваіх руках эканамічную магутнасць, багацце і ўладу [9, с. 5].

**5.2. Індаеўрапейская праблема. Першыя індаеўрапейскія культуры Еўразіі.** Індаеўрапейская праблема ўпершыню была агучана Вільямам Джонсам ў 1788 г. Вучоны звярнуў увагу на падабенства паміж санскрытам, грэчаскім, лацінскім, кельтскім і германскімі мовамі. Гэтае падабенства Джонс тлумачыў агульным паходжаннем вызначанай групы моў. З тых часоў узнікла пытанне аб прарадзіме народа, носьбіта індаеўрапейскай групы моў. Сёння мовазнаўцы прыйшлі да высновы, што адзінай індаеўрапейскай мовы не існавала, а была група падобных, звязаных паміж сабой дыялектаў, якія далі пачатак індаеўрапейскім мовам: грэчаскай, лацінскай, санскрыту і інш. Па праблеме паходжання індаеўрапейцаў

агульнай думкі сярод археолагаў таксама не існуе. Цвёрда можна сцвярджаць, што хеты, якія з’явіліся ў Анатоліі каля 2 тыс. гадоў да н. ч., былі ўжо індаеўрапейцамі, а індаеўрапейская моўная сям’я ўзнікла напрыканцы неаліту. Вучоныя вызначылі геаграфічны арэал, дзе магло адбыцца фарміраванне вялікай этнічнай супольнасці індаеўрапейскіх народаў. Гэта тэрыторыя, якая знаходзіцца на захад ад Урала, паўночней Чорнага мора і ад Карпат да Каўказа [8, с. 49 – 50].




Схема распаўсюджванне мікралітычных культур індаеўрапейцаў
(паводле Г.М. Мацюшына)

Дакладна вызначана, што індаеўрапейскія (арыйскія) мовы распаўсюдзіліся ў 2 тыс. да н. ч. у Еўропе, а таксама ў Іране, Індыі, Блізкім Усходзе [1, с. 92]. Першыя індаеўрапейскія культуры былі ў першую чаргу пастаральнымі, земляробства адыгрывала дапаможную ролю. Індаеўрапейскім культурам спадарожнічалі каменныя прылады – мікраліты, якія пастпова распаўсюджваюцца па ўсяму арэалу разам з міграцыяй іх носьбітаў. Падчас міграцый індаеўрапейцы выкарыстоўвалі колавы транспарт (павозкі). [7, с. 79]. У Еўропе індаеўрапейскія старажытнасці археолагі звязваюць з колам культур шнуравой керамікі ці баявых сякер.

Стэпавыя зоны субтропікаў першымі зазналі ўплыў пастаральнай гаспадаркі. Напрыканцы 1980-х гг. расійскімі археолагамі на Паўднёвым Урале была адкрыта культура “протагарадоў” XVIII – XVI стст. да н. ч. (пасяленні Аркаім, Сінташта, Вусце, Куйсак і інш.). Самым яркім помнікам гэтай культуры з’яўляецца Аркаім – яскравы прыклад старажытнага горада індаеўрапейцаў і індаарыяў. Плошча горада складае каля 20 тыс. кв. м. Горад быў акружаны крэпаснымі сценамі з дрэва і земляных сырцовых блокаў. Такія ж матэрыялы выкарыстоўвалі для будаўніцтва жытлаў. Будынкі ўзводзіліся па кругу, уздоўж валоў унутры кожнага колца. З паветра планаванне паселішча нагадвае гіганцкае кола са спіцамі. Жыхары пасялення займаліся пераважна жывёлагадоўляй і значна менш – земляробствам [5, с. 87 – 88].

Сярэдняя Азія становіцца месцам, адкуль адбываліся вялікія міграцыі старажытных індаеўрапейцаў, а пазней індаіранцаў. Стэпавыя ландшафты абумовілі спецыфіку развіцця еўразійскага энеаліту. На захадзе стэпавага рэгіёна, на тэрыторыі ад Урала да вусця Дняпра ў III тыс. да н. ч. склалася *старажытнаямная культурна-гістарычная агульнасць*. Гэтая культура ўключала ў сябе гісторыка-культурныя вобласці: Волжска-Уральскую, Перадкаўказскую, Данскую, Прыазоўскую, Крымскую, Ніжнедняпроўскую, Паўночна-Заходнюю і Паўднёва-Заходнюю [6, с. 135].



Рэчы старажытнаямнай культуры

Старажытнаямная культура вывучана па курганных могільніках. Гэты новы тып пахавальных помнікаў узнік у старажытнаямную эпоху. Пад насыпамі курганаў зроблены неглыбокія авальныя ямы, у якіх знойдзены шкілеты з падагнутымі нагамі, у скручаным стане на спіне, галавой на ўсход ці паўночны-ўсход. Раннія пахаванні шчыльна пасыпаны вохрай.



Старажытнаямнай пахаванне

Тыповымі для культуры з’яўляецца начынне, аздобленае ямкавым арнаментам ці

адбіткам шнура. Значная частка прылад выраблялася з каменю, але ўжо былі вядомы і вырабы з бронзы. Жывёлагадоўля, у першую чаргу авечкагадоўля, была асноўным заняткам. На пасяленнях адкрыты жылыя і гаспадарчыя пабудовы, складаныя абарончыя збудаванні. Меліся цяглавыя жывёлы і калёсныя павозкі, рэшткі якіх знойдзены ў Падняпроўі, Прыазоўі і Прыураллі [6, с. 136].

Значэнне гэтай культуры цяжка пераацаніць. Пашырэнне арэала старажытнаямнай культуры прывяло да распаўсюджвання вытворчай, найперш, пастаральнай гаспадаркі ў стэпавай зоне. Раней кліматычныя ўмовы рэгіёна перашкаджалі развіццю земляробства, а з пашырэннем жывёлагадоўлі гэта стала цалкам магчымым. Жывёлагадоўля ў стэпавай зоне аказалася найбольш эканамічна выгодным заняткам, і надоўга абумовіла спецыфіку гаспадаркі гэтай тэрыторыі. Перамяшчэне па стэпах было паскорана выкарыстаннем цяглавых жывёл і павозак. Роля водных транспартных сродкаў у стэпавай зоне другасная, што звязана з мерыдыянальным размяшчэннем рэк.

**5.3. Каўказскі цэнтр бронзаліцейнай металургіі.** Каўказскія горы былі адным з буйнейшых цэнтраў металургіі бронзавага веку. Класічнай культурай ранняй бронзы Паўночнага Каўказа з’яўляецца майкопская (сярэдзіна – другая палова III тыс. да н. ч.). Назва культуры паходзіць ад раскапанага напрыканцы XIX ст. на р. Белай Майкопскага кургана. Арэал культуры – Паўночна-Заходні Каўказ, Кабардына-Балкарыя, Чэчня і Інгушэція. Вялікая пахавальная камера пад дзесяціметровым насыпам кургана была падзелена драўлянай перагародкай на тры часткі. Галоўнае пахаванне знаходзілася ў паўднёвым адсеку, у двух іншых знаходзіліся пахаванні жанчын з гаспадарчым інвентаром. У пахаванні мужчыны знаходзіўся багаты інвентар (залатыя і срэбраныя вырабы). Верагодна ў гэтым кургане пахаваны родаплемянны правадыр [6, с. 145 – 146].

Курганы майкопскай культуры ўтрымліваюць багата металічных вырабаў з каляровых металаў. Для заходняй часткі Каўказа характэрны каменныя пахавальныя збудаванні тыпу дальменаў. Людзі жылі на ўмацаваных пасяленнях. Жытлы – каркасныя пабудовы, абмазаныя глінай і размешчаныя па кругу пляцоўкі пасялення. Знойдзены рэшткі сховішчаў для збожжавых і мясных прадуктаў. Асноўная колькасць прылад зроблена з каменю (зернацёркі, сякеры, долаты, адціскальнікі і інш.), вядомы і металічныя рэчы (бронзавыя шылы, бранзалеты, долаты, пранізкі, пласцінкі) [6, с. 146].

**5.4. Культуры вытворчага энеаліту і бронзавага веку Еўропы.** Найбольш вядомыя культуры вытворчага энеаліту Цэнтральнай Еўропы – гэта *трыпольская культура* (4200 – 2200 г. да н. ч.), *культуры лейкападобных кубкаў* (сярэдзіна IV – сярэдзіна III тыс. да н. ч.) і *шарападобных амфар* (III тыс. да н. ч.) [6, с. 120 – 125]. Гэтыя культуры пэўны час суіснавалі разам, асабліва на познім этапе. Аб'ядноўваюць культуры наступныя прыкметы: з'яўленне медных вырабаў, перавага матыжнага земляробства і хатняй жывёлагадоўлі, наяўнасць размаляванага керамічнага посуду, глінабітных дамоў, гліняных статуэтак і земляробчых культаў [6, с. 120].



Дом і рэчы культуры трыполле-кукутэні

*Трыпольская культура* (ці культура Трыполле-Кукутэні) вядома ў Трансільваніі, Малдове, Правабярэжнай Украіны, Карпата-Дунайскай зоны Румыніі і Балгарыі. Пасяленні размяшчаліся на ўрадлівых лёсавых глебах,

якія былі прыдатныя для апрацоўкі энеалітычнымі прыладамі. Найбольш даследаваным лічыцца пасяленне Каламійшчына паблізу Кіева і Уладзіміраўка. На пасяленні Каламійшчына адкрыта больш за 39 глінабітных дамоў. Дамы пакрываліся двусхільным дахам. Знойдзены гліняныя мадэлі трыпольскіх жытлаў. Гэта былі прамавугольныя ў плане дамы, які падзелены на два памяшканні, справа ад увахода ў куце зроблена гліняная печ, побач – ляжанка. У другім куце пакоя размешчана фігурка жанчыны, якая перацірае зерне на зерняцёрцы. Вядомы пакоі з ахвярнікамі. Дамы Уладзіміраўкі размешчаны пяццю кругамі (раскапана 200 дамоў), усе арыентаваны ўваходам да цэнтра круга. Прастора ўнутры круга з'яўлялася загонам для жывёл. Такое пасяленне акружалася сцяной [6, с. 122 – 123].

*Культура лейкападобных кубкаў* займала арэал пераважна Паўночнай Еўропы, ва Ўсходняй Еўропе распаўсюджана да Прыбалтыкі (Паўднёвая Скандынавія і Паўночнаеўрапейская раўніна) [6, с. 125]. Гэта была тыповая культура земляробаў і жывёлаводаў Паўночнай Еўропы. Акрамя традыцыйных заняткаў (земляробства, жывёлагадоўля, паляванне) насельніцтва займалася здабычай і апрацоўкай крэменю. Людзі жылі ў невялікіх вёсках, лепш за ўсё вывучаных ў Даніі. У асобных дамах было да 54 памяшканняў, дамы мелі прамавугольную форму і размяшчаліся паралельна адзін аднаму па краях замошчанай вуліцы [8, с. 273]. Культура атрымала назву ад спецыфічнай формы посуду – керамічных кубкаў з лейкападобнай шыйкай і акруглым ці плоскім дном. Пахаванні прадстаўлены адзінкавымі магілкамі ў курганных ці бескурганных пахаваннях. Знойдзены пахаванні на пасяленнях, у пакінутых зямлянках [8, с. 276].

*Культура шарападобных амфар* была распаўсюджана ад Балтыкі да Валыні і Падолля, на захадзе да р. Эльба, на ўсходзе – да басейна Нёмана і Дняпра. Назва культуры паходзіць ад тыповага начыння акруглай формы з цыліндрычнай ціканічнай шыйкай і з двумя, зрэдку чатырма, вушкамі для падвешвання. Шыйка і плечукі арнаментаваны штампаванымі ці разнымі ромбамі, трохвугольнікамі, зігзагамі ці другімі геаметрычнымі фігурамі альбо адбіткамі шнура. Пахаванні адбываліся пад курганом ў мегалітычных цыстах ці грунтовых магілах. Цысты зроблены з каменных пліт і нярэдка складаліся з двух памяшканняў. У асобных магілах знойдзены да 10 нябожчыкаў разам з косткамі жывёл. Сустракаюцца і рытуальныя пахаванні жывёл (кароў і коней) з керамікай і ўпрыгожваннямі [8, с. 278].

Людзі жылі на ўмацаваных пасяленнях на вяршынях пагоркаў. Дамы ўяўлялі сабой слупавыя пабудовы з абмазанай глінай сценкамі. Яны былі невялікія па памерах (4,5 х 3 м) і, як правіла, складаліся з двух пакояў: галоўнага і пярэдняй. Аднак сустракаюцца і доўгія шматпакаёвыя дамы [8,

с. 278]. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй. Слядоў выкарыстання плуга не выяўлена. Паляванне таксама займала важную ролю ў гаспадарчых занятках насельніцтва.

Магчымае паходжанне гэтай культуры ад культуры лейкападобных кубкаў. Гэтая культура ў шэрагу абласцей змянілася культурай шнуравой керамікі [8, с. 278 – 279].



Кераміка і сякеры культуры шнуравой керамікі (Швецыя, Данія, Нідэрланды)

*Культура шнуравой керамікі ці баявых сякер* выклікае вельмі вялікую цікавасць у многіх пакаленняў даследчыкаў. Вядома, што носьбіты

гэтай культуры з’яўляліся індаеўрапейцамі і з іх рассялення ў Еўропе пачынаўся працэс змены старажытнага этнаса новым. Тым не менш, пытанні аб фарміраванні культуры шнуравой керамікі і экспансіі яе носьбітаў напрыканцы III тыс. да н. ч. застаюцца невырашанымі. Сама агульнасць культур шнуравой керамікі мае шмат падобных рыс, а таксама шмат адрозненняў. Агульная прыкмета – наяўнасць начыння, арнаментаванага адбіткамі вяроўкі ці шнура, а таксама каменных глянцаваных і свідраваных ладдзявідных баявых (магчыма, культавых) сякер [8, с. 279].

Пасяленні культуры маладаследаваны. Найбольш вывучаны пахавальныя помнікі. Усе культуры займалі вялізную тэрыторыю ад Волгі да Рэйна, ад Фінляндыі да Швейцарыі. Для ўсіх культур характэрны курганныя плоскія могільнікі са скурчанымі трупапакладаннямі ці трупаспаленні, якія знойдзены разам з каменнымі прыладамі – баявымі прасвідраванымі і рабочымі клінападобнымі сякерамі, буйнымі крамянёвымі ножападобнымі пласцінамі, стрэламі. У магілках знойдзены каралі з прасвідраваных зубоў дзікіх жывёл, упрыгожванні з бурштыну і, зрэдку, з медзі. Знойдзена таксама керамічнае начынне са шнуравым ці штампаваным геаметрычным арнаментам [8, с. 280].



Баявыя сякеры культуры шнуравой керамікі

Насельніцтва займалася пастаральнай аседлай жывёлагадоўляй.

Да кола культур шнуравой керамікі адносяць *фацянаўскую, тшынецкую, сосніцкую* і інш.).

У пачатку II тыс. да н. ч. фарміруецца *фацянаўская культура,* якая ўваходзіла ў кола першых індаеўрапейскіх культур Усходняй Еўропы. Арэал ахоплівае басейн рэк Ака і Верхняй Волгі, падобныя помнікі адкрыты на памежных раёнах Беларусі і ў Прыбалтыцы. Культура прадстаўлена пераважна могільнікамі. Назва яе паходзіць ад могільніка каля сяла Фацянава паблізу Яраслаўля. Фацянаўскія плямёны засялялі практычна ўсю лясную частку сучаснай Расіі [2, с. 208].

Адкрыты пераважна грунтовыя могільнікі. У многіх з іх даследаваны зрубы. Памерлых клалі на бок ці спіну ў скурчаным стане. Асноўны інвен-

тар – каменны, але знойдзены таксма і металічныя коп'і, нажы, сякеры, шылы і ўпрыгожванні. Асноўным заняткам насельніцтва з'яўлялася стэпавая жывёлагадоўля [2, с. 209].

Уплывовай індаеўрапейскай культурай лясной зоны Усходняй Еўропы была *сярэднедняпроўская*. Арэал культуры шырокі: Верхняе і Сярэдняе Падняпроўе. Існавала культура ў другой палове III – сярэдзіне II тыс. да н. ч. Асноўны занятак насельніцтва – земляробства і жывёлагадоўля. Паселішчы размяшчаліся на пясчаных дзюнах, узвышэннях поймы, на краях тэрас каля вады. Знойдзены наземныя жытлы слупавой канструкцыі і паўзямлянкі. Унутры знаходзіліся вогнішчы адкрытага тыпу. Пахавальны абрад – трупапакладанне ў скручаным становішчы на баку з падсыпкай попелу і вохры. Выраблялі багата арнаментаваны керамічны посуд [4, с. 600].

Культурай развітога бронзавага веку з'яўляецца *тшынецкая культура*. Тшынецкая культура была распаўсюджана ў сярэдняй паласе Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, ад Варты на захадзе і Дняпра на ўсходзе. Названа па могільніку Тшынэце (Польшча). Людзі жылі на неўмацаваных пасяленнях, будавалі паўзямлянкавыя жытлы і невялікія наземныя пабудовы слупавой канструкцыі. Могільнкі двух відаў – курганныя і бескурганныя. Пераважаюць скурчаныя трупапакладанні. Трупаспаленні з'яўляюцца напрыканцы бронзавага веку і не выцясняюць трупапакладанні. Асновай гаспадаркі плямёнаў былі земляробства і жывёладоўля. Культура існавала з 1450 да 1100 гг. да н. ч. У далейшым на частцы займанай ёй тэрыторыі развіваецца лужыцкая культура [9, с. 63].

*Сосніцкая культура* (1,5 – 1 тыс. да н. ч.), распаўсюджаная ў басейнах Дзясны, Верхняга Дняпра і на Ніжняй Прыпяці, з'яўляецца лакальным варыянтам тшынецкай культуры. Насельніцтва пераважна займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, апрацоўкай медзі і бронзы, жыло на паселішчах, размешчаных на пясчаных поймах, узвышшах, краях тэрас і мысах. Жытлы – наземныя і паўзямлянкі слупавой канструкцыі, з 1 – 2 памяшканнямі (жылым і гаспадарчым), двусхільным дахам, адкрытым вогнішчам. Пахавальны абрад – трупаспаленне на грунтавых могільніках, радзей – трупапакладанне на баку ў скурчаным стане ў курганах і грунтовых магілах. Нябожчыкаў, рэшткі спалення і урны хавалі ў магільных ямах, перакрытых драўляным насцілам. Керамічны посуд багата арнаментаваны [3, с. 582].

Пераход да позняга бронзавага веку суправаджаўся шырокім распаўсюджваннем новага пахавальнага абраду – трупаспалення з захаваннем рэштках памерлага ў могільніках без курганнага насыпу, на так званых

“палях пахаванняў” ці “палях пахавальных урнаў”. Важнейшая група помнікаў гэтай культуры носіць назву *лужыцкай культуры* (XIII – VIII стст. да н. ч. – IV ст. да н. ч.) [9, с. 64, 342]. Арэал яе распаўсюджання – з захаду да ўсходу – ад Лейпцыга да басейна Прыпяці, з поўначы на поўдзень – ад Балтыйскага мора да Чэхіі, Маравіі і Славакіі. У адрозненні ад папярэдніх культур курганных пахаванняў, новае насельніцтва было пераважна земляробчым. Жывёлагадоўля мела дапаможную ролю. Адкрыта шмат пасяленняў і могільнікаў. Гэта сведчыць не толькі аб росце насельніцтва, але і аб яго аселасці. Менавіта за час існавання культур “палёў пахаванняў” шматлікія абшары лясной зоны Еўропы пераўтварыліся ў ворныя палі. Зямля паўсюль апрацоўвалася плугам, коні сталі адыгрываць гаспадарчае значэнне. Да ранейшых злакаў дадаліся авёс і жыта [9, с. 64].

Лужыцкая культура бедная на метал, яго амаль не знойдзена ў пахаваннях. Аднак у пахаваннях знойдзена вялікая колькасць керамічнага начыння, часам цэлыя серыі гаршкоў [9, с. 64].



Культавая павозка-кацёл X ст. да н. ч., вышыня павозкі 35,5 см.



Мячы бронзавага веку

Палі пахаванняў часам налічваюць вялікую колькасць магіл. Так, могільнік Ляска (Польшча) складаўся з 1800 пахаванняў; у чэшска-мараўскіх

помніках раскапана да 200 – 300 пахаванняў. Трупаспаленні рабіліся на аддаленні. Сабраныя рэшткі і попел памяшчалі ў урны ці проста ў ямы, а вакол усталёўвалі іншае начынне. Часам урны прыкрывалі камянямі. Сустракаюцца і пахаванні ў курганах, прычым апошнія выкарыстоўваліся для племяннной знаці.

Адметнасцю культуры з'яўляецца знаходжанне залатых скарбаў. Сярод бронзавых упрыгожванняў сустракаюцца скроневыя колцы, бранзалеты, пярсцёнкі, каралі з бронзавых трубачак і шкляных пацерак, розныя зашпількі, фібулы. Прылады з бронзы прадстаўлены сякерамі з закраінамі, нажамі, сярпамі. Зброя прадстаўлена бронзавымі наканечнікамі стрэл, дзід і мячамі. У позні час знойдзены цяснёныя з бронзы рэчы, начынне і арнаментаваныя гузікі [9, с. 67].

Найбольш даследаваным пасяленнем лужыцкай культуры з'яўляецца Біскупінскае гарадзішча (90 км на паўночны-захад ад Познані). Яно ўмацавана магутнай сцяной з драўляных канструкцый, якія былі запоўнены зямлёй і пяском. Даўжыня ўмацаванняў 463 м, плошча пасялення 20 тыс. кв. м. Да варот праз тарфянік вёў мост даўжынёй 120 м. На гарадзішчы была адна акружная вуліца і 11 папярэчных, якія складаліся з дамоў (10×8 м). Кожны дом меў па два памяшканні, адно – з вогнішчам. Сцены зроблены з вертыкальных слупоў, у якіх мацаваліся гарызантальныя бэлькі. На пасяленні адкрыта звыш 100 дамоў. Гарадзішча з'яўлялась племянным цэнтрам, на ім пражывала каля 1000 – 1200 чалавек [9, с. 346]. Сёння Біскупінскае гарадзішча з'яўляецца сусветна вядомым турыстычным цэнтрам, аднім з асяродкаў эксперыментальнай археалогіі жалезнага веку.

Этнічная прыналежнасць культуры выклікае працяглыя дыскусіі. Найбольш верагодна, што лужыцкая культура належыла да індаеўрапейскага насельніцтва, якое прыняло ўдзел у фарміраванні гістарычных славян, кельтаў, ілірыйцаў і іншых народаў [9, с. 346].

У позні перыяд культуры па ўсёй Цэнтральнай Еўропе з'яўляецца новая сімволіка культа сонца. Важнейшы яе элемент – выява птушак (пераважна вадаплаваючых) у спалучэнні з колам, кругам, павозкай. Вадаплаваючая птушка з'яўлялась сонечным сімвалам, яна звязвала нябесную і зямную сферы, таксама адлюстроўвала сімвал урадлівасці нароўні з кругамі, крыжамі, коламі, бычымі рогамі і інш. У познім перыядзе лужыцкай культуры існаваў звычай хаваць памерлых правадыроў у павозках, аздобленых выявамі птушак [9, с. 77].

На тэрыторыі Правабярэжнай Украіны, на захад ад Дняпра, гістарычнае развіццё плямён у II тыс. да н. ч. ішло іншым шляхам. Тут фарміраваўся позні перыяд *усатаўскай і гарадзецкай* (ад пас. Гарадок каля Жыто-

міра) культур. Гэтыя культуры захавалі рысы трыпольскай энеалітычнай і адчулі ўдзеянне суседніх катакомбнай і зрубнай культур [2, с. 203].



Пахаванне зрубнай культуры

На пасяленнях паслятпрыпольскага часу раскапаны рэшткі зямлянак. Узрастае колькасць керамікі, аздобленай шнуравым арнаментам. Павялічваецца колькасць металічных прадметаў, сярод якіх медныя сякеры, кінжалы трохвугольнай формы, шылы, колцы, разам з імі знойдзены каменныя шліфаваныя сякеры [2, с. 203].

Плямёны Правабярэжнай Украіны вялі земляробча-жывелагадоўчы лад жыцця. Пахавальныя збудаванні – курганы, у цэнтры якіх знаходзіліся багатыя пахаванні мужчын. Знойдзены шматлікія рэчы. Плямёны вялі разгалінаваны менавы гандаль, атрымлівалі сурму, метал, і розныя прадметы з такіх аддаленых раёнаў, як Балканы, Прыбалтыка, Малая Азія і выспы Крыт [2, с. 204].

На ўсход ад *катакомбнай культуры* (гл. ніжэй) склалася *андронаўская культурна-гістарычная супольнасць*. Яна ўтварылася на тэрыторыі Паўднёвага Зауралля і Заходняга Казахстана і да Енісея на ўсходзе ў II тыс. да н. ч. Андронаўская агульнасць – гэта некалькі тэрытарыяльна і храналагічна роднасных археалагічных культур на вялізнай тэрыторыі ўсходняй часткі стэпавага свету. Пахавальныя помнікі прадстаўлены пераважна каменнымі круглымі агароджамі, унутры якіх знойдзены грунтовыя ямы са скрынямі, зробленымі з вертыкальна пастаўленых каменных пліт. Зверху яны таксама перакрываліся каменнымі плітамі. У ямах пахаваны адзін-два памерлых, шкілеты пакладзены на левы бок, з сагнутымі нагамі. Асноўны інвентар – керамічны посуд. Знойдзена вялікая колькасць костак хатніх жывёл. Жывёлагадоўля мела аселы характар [6, с. 163].

На тэрыторыі лясной паласы Ўсходняй Еўропы бронзавы век меў сваю спецыфіку. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі была прычынай захавання тут на больш працяглы час каменных прылад працы, аднак апрацоўваліся яны лепш: шырока ўжывалася шліфаванне, свідраванне, пілаванне, апрацоўка крэменю струменістай рэтушшу. Выраблялiся крамянёвыя наканечнікі коп’яў, кінжалы, сярпы. Была наладжана мясцовая

вытворчасць бронзавых рэчаў з прывазной сыравіны ( з сярэдзіны 2 тыс. да н. ч.). Побач з традыцыйным збіральніцтвам, паляваннем і рыбалоўствам з’явіліся земляробства і жывёлагадоўля. Усюды пашыраўся пласкадонны посуд (гаршкі, міскі, кубкі, друшлякі і інш.). Важнай падзеяй стала распаўсюджванне ў лясной зоне першых індаеўрапейскіх культур [10, с. 97].

**5.5. Культуры бронзавага веку Сярэдняй Азіі і Закаўказзя.** У Сярэдняй Азіі і Закаўказзі працягвалі фарміравацца своеасаблівыя культуры жывёлаводаў і земляробаў, найбольш яскравыя з якіх маюць назву *катакомбная і зрубная*.

Помнікі *катакомбнай культуры* (2 тыс. да н. ч.) адкрыты ад Дняпра да Сярэдняй Волгі, на тэрыторыі Крыма, а таксама каля Курска і Яльца. Асноўная колькасць захаваных помнікаў – гэта могільнікі. Памерлых хавалі не проста ў грунтовай яме, але ў асаблівых нішах – катакомбах, якія зроблены ў сценках магільных ям. Уваход у катакомбу з ямы завальваўся камянямі, дно ямы высцілалася вохрай, вапнай ці чаротам. Шкілеты размешчаны ў скручаным стане, галавой на ўсход [2, с. 198].

Насельніцтва вяло аседлы лад жыцця. У паўднёвых раёнах жытлы прадстаўлялі сабой пабудовы, сплеценыя з чарота і абмазаныя звонку глінай. У паўночным арэале культуры адкрыты невялікія паўзямлянкі з драўляным дахам і вогнішчамі знутры. Інвентар катакомбнай культуры прадстаўлены бронзавымі, каменнымі і касцянымі вырабамі. Шмат знойдзена керамікі, яна разнастайная па форме і вельмі адрозніваецца ад прымітыўнага посуду папярэдняй старажытнаямнай культуры [2, с. 199].

Галоўным заняткам плямёнаў катакомбнай культуры з’яўлялася земляробства, жывёлагадоўля таксама была даволі развітай. У пахаванне з нябожчыкам клалі забітых авечак, кароў, коз, свіней і коней [2, с. 200].

У сярэдзіне II тыс. да. н. ч. адбываецца значнае перамяшчэнне насельніцтва. Плямёны з Заволжжа прайшлі на захад, да Сярэдняга Дона і Дняпра, часткова выцісніўшы катакомбнае насельніцтва на Паўночны Каўказ і ў лесастэпавыя раёны. У выніку асіміляцыі адбылося фарміраванне новай культурнай агульнасці – *зрубнай культуры* (існавала ў другой палове II тыс. да н. ч.). Гэтая культура сфармавана на вялікай прасторы ад Дняпра на захадзе да Урала на ўсходзе, ад берагоў Чорнага мора на поўдні да левабярэжжа Камы на поўначы [2, с. 200].

Назва культуры паходзіць ад спосабу будоўлі пахаванняў. Ямы створаны для пахавання нябожчыкаў і размешчаны пад насыпам курганаў, умацаваных драўляным зрубам, зверху перакрытым бярвеннямі. У некаторых курганах былі зроблены даволі складаныя збудаванні: бярвеннямі абкладаўся насып кургана, альбо над цэнтральным пахаваннем узводзіўся

двухсхільны дах. Курганы будаваліся для пахавання прадстаўнікоў вялікіх патрыярхальных сем'яў, памерлых хавалі ў скурчаным стане [2, с. 201]. Сярод прадметаў ў пахаваннях пераважае керамічны посуд, менш знойдзена бронзавых і каменных вырабаў.

Земляробства і жывёлагадоўля практычна цалкам выцясняюць паляванне, у насельніцтва зрубнай культуры была вельмі развіта бронзаліцейная справа. Асноўным тыпам пабудоў з'яўляліся зрубныя паўзямлянкі. Некаторыя паўзямлянкі мелі плошчу 200 – 300 кв. м і глыбінёй каля 1,5 м. На пасяленні жылі некалькі патрыярхальных сем'яў, аб'яднаных у род. Патрыярхальная сям'я валодала асабістай уласнасцю. У асобных курганах былі пахаваны племянныя правадыры [2, с. 202 – 203; 6, с. 170].



Пахаванне абашаўскай культуры

У шырокай лесастэпавай зоне Падоння, Паволжа і Прыуралля ў другой палове II тыс. да н. ч. жылі плямёны *абашаўскай культурнай агульнасці*. Раскпаданы пераважна могільнікі культуры. Памерлых хавалі ў авальных ці круглых курганах, у магільных ямах. Дно ям высцілалі бяростай, а сценкі ўмацоўвалі дрэвам. Пахавальны інвентар складаецца з керамічнага посуду, медных упрыгожванняў, нажоў, скрэблаў, рыбалоўных кручкоў. Знойдзены і косткі хатняй жывёлы [2, с. 209].

Асаблівасцю культуры з'яўляецца багата аздоблены жаночы касцюм. Насельніцтва ведала шматлікія бронзавыя вырабы (сякеры, нажы, упрыгожванні, у тым ліку бранзалеты і пярсцёнкі, разнастайныя дэталі галаўнога ўбору) [2, с. 209].

**5.6. Мастацтва бронзавага веку.** Мастацтва эпохі бронзы вельмі разнастайнае. Вылучаюцца два храналагічных пласты: мастацтва энеаліту і ранняй бронзы і мастацтва развітай і позняй бронзы. Мастацтва бронзавага веку было цесна звязана з рэлігійнымі ўяўленнямі насельніцтва. Характэрнай асаблівасцю мастацтва з'яўляецца яго касмалагічнасць, накіраванасць на працэс пазнання працэсаў будоўлі свету, крыніцы жыцця, ролі сонца і месца чалавека ў свеце. Уяўленні людзей былі адлюстраваны ў міфалагічнай форме. Адбывалася персаніфікацыя жывёльнай і антрапаморфнай істоты, сонечнага бажаства, салярнай сімволікі, магічных сімвалах (круг,

свастыка). Міфалагічныя ўласцівасці набыла таямнічасць кругазварота ў прыродзе, ідэя жыцця. Зерне набыло магічную ўласцівасць (таямніца прарастання). Сакральнай жывёлай з'яўляўся бык (крыніца ўрадлівасці). Атрымалі распаўсюджванне мегалітычныя збудаванні з простымі, рэалістычнымі і складанымі выявамі [6, с. 189].

Мегалітычныя культуры дасягнулі найвышэйшага росквіту на тэрыторыі Еўропы ў эпоху энеаліту і асабліва ў бронзавым веку. Гэтыя культуры – яскравы феномен бронзавага веку, адна з яго галоўных прыкмет. Прызначэнне мегалітычных збудаванняў не заўсёды вызначана. Напрыклад, алеі менгіраў у Брэтані (Карнак) налічваюць каля 3 тыс. Камянёў. Падчас раскопак каля менгіраў знаходзілі косткі жывёл, дробныя кавалкі начыння, вугальныя плямы. Па ўсёй верагоднасці, менгіры мелі культавае значэнне. У Францыі і на Пірэнэях менгіры прадстаўляюць сабой выявы частак чалавечага цела (галава, грудзі, рукі). Сусветна вядомым кромлехам з'яўляецца Стонхендж (Англія) – старажытны храм, які, магчыма, звязаны з культам сонца і які сімвалізуе нябеснае кола. Некаторыя кромлехі прызначаліся для пахавання [8, с. 259 – 260].



Стонхендж. Агульны выгляд

Дальмены з'яўляліся калектыўнымі пахавальнямі для членаў абшчыны, радзей – індывідуальнымі пахавальнямі. Найбольш знакамітыя пахаванні даследаваны ў Гаўр Ініс і Морбіган (Францыя), Нью-Грэндж (Ірландыя). Дальмены шырока распаўсюджаны ў свеце, у Еўропе яны адкрыты ў Скандынавіі, Германіі, Галандыі, Францыі, Іспаніі, Партугаліі, Італіі, Вялікабрытаніі, Ірландыі, Шатландыі, Балгарыі [8, с. 261]. Верагодныя мегалітычныя помнікі адкрыты і на тэрыторыі Беларусі (Янава возера, Полацкі раён Віцебскай вобласці).



Жаночае бажаства з Паўднёвай Францыі. III тыс. да н. ч.

Шырока распаўсюджаны петрогліфы з выявамі сонечнага бажаства. Знойдзены шматлікія статуэткі з выявай фігурак жанчын. Магчыма, яны з'яўляліся часткай алтарных кампазіцый. У бронзавым веку былі шырока распаўсюджаны вырабы дробнай мастацкай пластыкі з бронзы – гэта фігуркі жывёл, антрапаморфныя фігуры, каменныя і керамічныя фігуркі жывёл [6, с. 193].

## Літаратура

1. Брей, У. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

2. Гальперина, Г. А. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

3. Ісаенка, У. Ф. Сосніцкая культура / У. Ф. Ісаенка, І. Г. Калечыц // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 582

4. Калечыц, А. Г. Сярэднедняпроўская культура / А. Г. Калечыц // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 600.

5. Крывальцэвіч, М. Археалягічныя адкрыцьці сьвету / М. Крывальцэвіч. – Мінск : Atheneum, 2000.

6. Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов – М. : Высш. шк., 1996.

7. Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

8. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.

9. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 2: Бронзовый и железный века / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1974.

10. Чарняўскі, М. М. Бронзавы век / М. М. Чарняўскі, М. М. Крывальцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 97.

## Кантрольныя пытанні да тэмы 5

1. Назавіце асноўныя падыходы да вызначэння храналагічных межаў бронзавага веку.
2. Пералічыце асноўныя цэнтры па здабычы медных і алавяных руд бронзавага веку.
3. Дайце характарыстыку першых вырабаў з металу і тэхналогій апрацоўкі. Што такое пальштаб і кельт?
4. У чым заключаецца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі бронзавага веку?
5. Якія сродкі перамяшчэння з’явіліся ў бронзавм веку?
6. Якія змены адбыліся ў сацыяльнай арганізацыі плямёнаў бронзавага веку?

7. Растлумачце сутнасць энеаліту (халкаліту).

8. Дайце характарыстыку праблемы паходжання індаеўрапейцаў і протагарадскіх цывілізацый Сярэдняй Азіі.

9. Вызначце асаблівасці культуры шнуравой керамікі (баявых сякер).

10. Дайце характарыстыку старажытнаямнай культуры.

11. Дайце характарыстыку майкопскай культуры.

12. Дайце характарыстыку трыпольскай культуры.

13. Дайце характарыстыку культуры лейкападобных кубкаў.

14. Дайце характарыстыку культуры шарападобных амфар.

15. Дайце характарыстыку тшынецкай і сосніцкай культур.

16. Дайце характарыстыку культуры палёў пахаванняў, лужыцкай культуры.

17. Вызначце асаблівасці забудовы Біскупінскага гарадзішча.

18. Вызначце асаблівасці сімволікі і светаўспрымання бронзавага веку.

19. Дайце характарыстыку стэпавых культур: катакомбнай і зрубнай.

20. Дайце характарыстыку андронаўскай культурна-гістарычнай супольнасці.

21. Ахарактарызуйце спецыфіку бронзавага веку лясной зоны Ўсходняй Еўропы (сярэднедняпроўская і фаццянаўскія культуры).

22. Зрабіце характарыстыку абашаўскай культурнай агульнасці.

23. Вызначце своеасаблівыя рысы мастацтва бронзавага веку.

24. Дайце характарыстыку мегалітычных культур Еўропы.

# 6. ЖАЛЕЗНЫ ВЕК І СЯРЭДНЕВЯКОЎЕ

6.1. Агульная характарыстыка жалезнага веку.
6.2. Гальштат і латэн. Паморская і пшэворская культуры.
6.3. Культуры стэпаў Усходняй Еўропы.
6.4. Культуры балцкіх плямён.
6.5. Культуры фіна-уграў.
6.6. Заходнееўрапейскае сярэднявякоўе.
6.7. Славянскія культуры жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя.

**6.1. Агульная характарыстыка жалезнага веку.** Нягледзячы на тое, што жалеза з'яўляецца самым распаўсюджаным металам у свеце, яно было позна засвоена чалавекам. Жалеза амаль не сустракаецца ў прыродзе ў чыстым выглядзе, яго цяжка апрацоўваць і да адкрыцця спосабу абвугляроджвання жалеза было занадта мяккім для вытворчасці прылад.

Жалеза метэарытнага паходжання знойдзена ў егіпецкіх пахаваннях пачатку IV тыс. да н. ч. Спосаб атрымання жалеза з руды быў адкрыты толькі ў II тыс. да н. ч. на Ўсходзе, верагодна, у Пярэдняй Азіі. Існуе гіпотэза, што сырадутны працэс быў упершыню выкарыстаны хетамі і стаў шырока распаўсюджаны з XV ст. да н. ч. [16, с. 130].

Уласна плаўленне жалеза, г. зн. атрыманне яго ў вадкім стане, заўсёды было для старажытных металургаў недасягальным, паколькі дзеля гэтага неабходна была высокая тэмпература (1528 °С). Жалеза атрымоўвалі з дапамогай сырадутнага працэсу, які складаўся з аднаўлення жалезнай руды вугляродам пры тэмпературы 1110 – 1350 °С у спецыяльных печах з выдуваннем паветра кавальскімі мяхамі праз сопла. На дне печы ўтваралася крыца – кавалак порыстага жалеза вагой ад 1 да 8 кг. Крыцу неаднаразова пракоўвалі молатам для ўшчыльнення і частковага выціскання шлака. Крычнае жалеза было мяккім, але яшчэ ў глыбокай старажытнасці адкрыты спосаб закалкі жалезных вырабаў ці іх цэментацыі (абвугляроджвання). Лепшыя механічныя якасці жалеза, агульнадаступнасць жалезных руд і таннасць новага метала забяспечылі выцясненне ім бронзы, а таксама каменю, які заставаўся важным матэрыялам для вытворчасці прылад у бронзавым веку [16, с. 130].

Выкарыстанне жалеза выклікала тэхнічны пераварот. Жалезная сякера і рала з жалезным лемехам дазволілі значна павялічыць плошчы апрацоўваемых земляў. Палепшыліся арашальныя і меліяратыўныя збудаванні. Паскорылася развіццё рамёстваў, асабліва кавальскага і збройнага. З'явіліся універсальныя прылады: нажніцы, шчыпцы, абцугі, пілы і напільнікі. Палепшылася апрацоўка дрэва для домабудаўніцтва, вытворчасці сродкаў перамяшчэння (караблёў, калясніц і інш.). Усе рамеснікі – ад гарбароў да

рудакопаў – атрымалі больш якасныя прылады [16, с. 132]. Да пачатку новай эры з'явіліся ўсе асноўныя віды сучасных рамесных інструментаў і сельскіх ручных прылад, акрамя вінтоў і шарнірных нажніц. Будаваліся дарогі, паскорыўся абмен, распаўсюдзіўся асноўны плацёжны сродак – металічная манета. Наяўнасць магутных умацаваных пасяленняў – гарадзішчаў – стала адной з прыкмет жалезнага веку [16, с. 132].

Жалеза атрымала распаўсюджванне ў Еўропе напрыканцы II тыс. да н. ч. Аднак мясцовая вытворчасць чорная металургія пачалася каля 1000 г. да н. ч. у Грэцыі і на Эгейскіх выспах. Грэчаскія каланісты распаўсюдзілі вытворчасць жалеза ў Італіі каля 800 г. да н. ч. Ва умеранай зоне Еўропы і ва Усходніх Альпах жалеза выраблялі з 640 г. да н. ч. Аднак першыя некалькі стагоддзяў жалезныя рэчы мелі абмежаванае значэнне ў эканоміцы еўрапейскіх плямёнаў [16, с. 132].

**6.2. Гальштат і латэн. Паморская і пшэворская культуры.** Ранні жалезны век Заходняй Еўропы падзяляецца на два перыяды: гальштат (1100 – 500 г. да н. ч.) і латэн (500 г. да н. ч. – пачатак н. ч.). У гэты час у Еўропе вядомы першыя народы: германцы – на поўначы, славяне і ілірыйцы – на ўсходзе, фракійцы – на паўднёвым-ўсходзе, італікі – на поўдні, кельты – у Заходняй і Сярэдняй Еўропе [16, с. 132].

Гальштат падзяляецца на чатыры перыяды – гальштат A, B, C і D і характарызуецца распаўсюджваннем прылад позняга бронзавага веку (бронзавыя мячы, прадметы раскошы). Перыяд A і B характарызуецца існаваннем культур палей пахаванняў познебронзавага веку. Пачынаюць будавацца гарадзішчы, памерлых нярэдка хавалі ў чатырохколавай павозцы ў доміку памерлых пад курганом. Жалеза з'яўляецца толькі ў трэццім перыядзе гальштата – гальштаце C (VII ст. да н. ч.). Перыяд D (VI ст. да н. ч.) атрымаў найбольшае пашырэнне [1, с. 56; 13, с. 32].

Культура латэн – гэта культура кельтаў, найвышэйшы росквіт якой адбываецца на захадзе Цэнтральнай Еўропы, ад Рэйнскай вобласці да Марны. Існавала пэўная сувязь са скіфскай культурай. Латэн каранямі ўзыходзіць да культуры гальштат. Найбольш позна культура захавалася ў Ірландыі, якая не была закранута рымскай акупацыяй. Тут кельтскі стыль суісные з раннехрысціянскімі элементамі культуры [1, с. 134].

Адной з яскравейшых культур Заходняй Еўропы была *паморская*. Яна ўтварылася на аснове лужыцкай у IV ст. да н. ч. і займае арэал Вялікапольшчы, часткі Сілезіі, на ўсходзе – Куявію, Хелмінскую зямлю і прылеглыя раёны Мазовіі. Галоўнае адрозненне паморскай культуры ад лужыцкай заключаецца ў пахавальным абрадзе і асаблівай кераміцы ў пахаваннях. Культура існавала да 100 г. да н. ч. [16, с. 347].




Рэчы паморскай культуры

Пахавальны абрад – трупаспаленне на бескурганных могільніках, курганы вельмі рэдкія. Пахаванні зроблены ў каменных скрынях, складзеных з каменных пліт ці камянёў. Памеры скрынь ад 0,5 да 6 м у даўжыню і ад 0,5 да 1,5 м у шырыню. У адной скрыні знойдзены ад 2 да 30 пахавальных урн. У асобных урнах змешчаны рэшткі двух чалавек [16, с. 347].

Асаблівасць паморскай культуры: г. зв. тваравыя урны, зробленыя спецыяльна для пахавання. Гэта адметнае начынне, якое мае грушападобную форму і натуралістычную ці схематычную выяву жаночага ці мужчынскага твару [16, с. 349].

Як магчымае адгалінаванне паморскай культуры вучоныя называюць *культуру падклёшавых пахаванняў* (V – IV стст. да н. ч.). Арэал гэтай культуры ў латэнскі час у цэлым супадае з паморскім, на асобных могільніках падклёшавыя пахаванні суседнічаюць з паморскімі, аднак у адрозненні ад паморскага, арэал падклёшавых пахаванняў пашыраецца да тэрыторыі Палесся і Валыні [16, с. 351].




Рэчы культуры падклёшавых пахаванняў і спосаб пахаванняў

Пасяленні паморскай культуры вывучаны слаба. Вядома, што людзі жылі на неўмацаваных пасяленнях у будынках слупавой канструкцыі. Этнічная прыналежнасць культуры не высветлена. Існуе меркаванне аб прыналежнасці носьбітаў культуры да германцаў, славян, кельтаў [16, с. 350].

У II – I ст. да н. ч. на поўдні Польшчы склалася *пшэворская культура*. Гэтая культура звязваецца з венедамі, згаданымі антычнымі аўтарамі (Пліній Старэйшы, Тацыт, Пталемей). Магчыма, гэта былі славяне. Культура існавала да IV ст. н. э. [16, с. 353].

Даследаваны могільнікі культуры, зробленыя па абраду трупаспалення. Большасць пахаванняў ямныя і бязурнавыя, частка пахаванняў – урнавыя, пасыпаныя рэшткамі пахавальнага вогнішча. Пахавальны інвентар спальваўся разам з памерлым. Жалезныя прадметы, не пашкоджаныя агнём, зламаныя ці сагнутыя перад памяшчэннем у магілу [16, с. 356].

Культуру характарызуюць цесныя сувязі з Рымскай імперыяй, археолагамі знойдзена шмат рымскага імпарта. З’яўляюцца жалезныя мячы як

вядучая форма зброі. Высокага ўзроўню дасягнула вытворчасць і апрацоўка жалеза на мясцовых рудах. З’явіліся г. зв. “княжацкія” магілы, якія сведчаць аб накапленні багацця ў асобных прадстаўнікоў родавай арыстакратыі. У IV ст. н. э. у Закжуве раскапаны багатыя пахванні, якія налічваюць залатыя, срэбраныя рэчы, шкляны імпартаваны посуд і іншыя рэчы [16, с. 358].

Пасяленні вывучаны слаба. Жытлы прамавугольныя, слупавыя, невялікія па памерах, з сенямі. У Вулцы Ласецкай адкрыта пабудова памерам 8,5×16,2 м, яна выкарыстоўвалася як месца грамадскіх сходаў. Мяркуецца, што пшэворская культура адыгрывала значную ролю ў этнагенэзе славян [16, с. 358].

**6.3. Культуры стэпаў Усходняй Еўропы.** У стэпавай зоне Ўсходняй Еўропы ў жалезным веку сфармавалася скіфская этнічная агульнасць. Скіфская супольнасць склалася на аснове кімерыйскай культуры. Кімерыйцаў лічаць першым вядомым народам, які пражываў на тэрыторыі сучаснай Расіі. Кімерыйскія пасяленні існавалі яшчэ напрыканцы бронзавага веку. Кімерыйцы згаданы ў Бібліі і “Адысеі” Гамера. Яны ажыццяўлялі ваенныя паходы на вялікай тэрыторыі: ад Закаўказзя да заходніх раёнаў Малой Азіі. Яны нападалі на моцныя дзяржавы Урарту і Асірыі [5, с. 220].

Кімерыйцы насялялі стэпы Паўночнага Прычарнамор’я. Іх культура была сфармавана на аснове познезрубнай, кімерыйцы размаўлялі на іранскіх мовах. У VII ст. да н. ч. кімерыйцы былі заваяваны скіфамі.

Скіфскія плямёны падзяляюцца на дзве вялікія групы: царскія скіфы і стэпавыя скіфы. Царскія скіфы жылі на тэрыторыі стэпаў ад нізоўяў Дуная да берагоў Дона і ў Паўночным Прыазоўі. Скіфаў іншых тэрыторый яны лічылі рабамі [5, с. 223].

Паходжанне скіфаў не высветлена. Герадот сведчыць, што скіфы былі выдалены са сваіх уладанняў масагетамі, яны перайшлі раку Аракс (Волга ці Амудар’я) і занялі пасяленні кімерыйцаў. Магчыма, продкі скіфаў – гэта насельніцтва зрубнай культуры. Носьбіты гэтай культуры былі іранамоўнымі [5, с. 224].

Скіфы былі качавым народам. Сваі дамы яны перавозілі на чатырохкалёсных кібітках. Такія павозкі знойдзены падчас раскопак. Напрыканцы V ст. да н. ч. у скіфаў сталі з’яўляцца ўмацаваныя пасяленні. Самае буйнае скіфскае пасяленне – Каменскае гарадзішча (нізоўі Дняпра, недалёка ад сучаснага Нікопаля). Плошча гарадзішча 1200 га. Пасяленне мела акропаль, дзе ў каменных дамах пражывала скіфская знаць. Звычайныя жыхары жылі ў наземных дамах і паўзямлянках. Іншыя гарадзішчы раскапаны археолагамі ў дэльце Дона (Елізавецінскае), у Белазерскага лімана пад Херсанэсам, абодва датуюцца IV – III стст. да н. ч. [5, с. 224, 226].

Каменскае гарадзішча было асноўным цэнтрам скіфскай металургіі. Адсюль металічныя рэчы траплялі ў іншыя раёны Скіфіі. Таксама высокага развіцця дасягнулі касцярэзная, ганчарная і шавецкая вытворчасць [5, с. 226].



Жалезная зброя скіфаў

Асноўным заняткам скіфаў была пастаральная жывёлагадоўля. Статкі складаліся з авечак, коней, кароў. Паводле Герадота, існавалі яшчэ такія групы скіфаў, як скіфы-аратыя і скіфы-земляробы. Сучасныя даследчыкі сцвярджаюць, што скіфы-аратыя – гэта на самой справе скіфы-жывёлаводы. У адрозненні ад царскіх скіфаў, жывелаводы сяліліся толькі ў стэпавай зоне. Археалагічных даных пакуль што недастаткова для высвятлення мяжы пражывання скіфаў-аратых. Вучоныя мяркуюць, што гэтая катэгорыя насельніцтва не з'яўлялася ўласна скіфамі, яны захоўвала архаічную культуру і былі падуладныя царскім скіфам [5, с. 227].

Росквіт культуры стэпавых скіфаў прыходзіцца на IV ст. да н. ч. Культура даследавана пераважна па курганных пахаваннях. Пад курганамі знаходзіліся катакомбы і магільныя ямы, куды клалі памерлага. Разам з памерлым у пахаванне клалі прадметы побыту, зброю, розныя культавыя рэчы і ўпрыгожванні. Прылады працы ў пахаваннях рэдкія. Пасля смерці знатнага скіфа разам з ім у пахаванне суправаджалі яго рабоў і слуг. У асобных пахаваннях будавалі спецыяльныя камеры для рэчаў і забітых коней. Тут жа змяшчалі і скіфскія павозкі. У раёне Дняпроўскім парогаў былі выяўлены найбольш буйныя і багатыя царскія пахаванні. У іх знойдзена шмат залатога посуду, зброя і ўпрыгожванні, у тым ліку з золата. Большая частка царскіх курганаў была разрабавана іншымі знатнымі скіфамі яшчэ ў пачатку I тыс. г. н. ч. Найбольшую вядомасць набылі



Скіфскія ўпрыгожванні з золата і срэбра, выкананыя ў звярыным стылі

раскапаныя археолагамі Мельгуноўскі (каля г. Кіраваград) і Чартамлыкскі курганы (каля г. Нікопаль), а таксама курган каля сяла Ільінцы пад Мелітопалем і курган Таўстая Магіла (каля г. Арджанікідзэ) [5, с. 229 – 230].

Скіфы валодалі асаблівай манерай выканання ўпрыгожванняў, названых "звярыным стылем". Гэты стыль меў шырокае распаўсюджванне: ад Кубані да Сібіры і ў кожным раёне меў свае спецыфічныя рысы. Фігуркі жывёл былі звязаны з адлюстраваннем нейкай звышнатуральнай сілы. Папулярным сюжэтам скіфскіх майстроў з'яўляліся фігуркі аленяў [5, с. 233].



Рэканструкцыя жытлаў скіфаў позняга этапу (1), рэльеф з выявай скіфіскіх цароў Скілура і Палака (2), размалёўка склепа пахавання Неапаля (3), рэканструкцыя касцюма знатнай скіфянкі (4), пахаванне сармацкага воіна (5)

У II ст. да н. ч. пасяленні скіфаў былі захоплены сарматамі. Скіфы адстаялі толькі невялікія раёны Паўночнага Прычарнамор'я, у тым ліку нізоўі Дняпра і Нікопаль. Археолагамі даследавана пасяленне Неапаль-на-Салгіры (недалёка ад Сімферопаля). Гэтае гарадзішча стала новай сталіцай скіфаў. Неапаль меў вялікія вароты з двума вартаўнічымі вежамі і каменныя сцены. Раскапаны пабудовы гараджан, якія нагадвалі элінскія будынкі. За знешнім перыметрам сцен раскапана пахаванне скіфскага цара, зробленае ў склепе. Сцены склепа былі размаляваны. Цар быў пахаваны разам з 71 слугой [5, с. 239].

Плямёны саўраматаў (позняя назва – сарматы) пражывалі на тэрыторыі Заволжскіх і Прыуральскіх стэпаў. Паходжанне саўраматаў, як і скіфаў, звязваюць са зрубнай культурна-гістарычнай супольнасцю, а таксама андронаўскай культурай. Саўрамацкі этап культуры ахоплівае VII – IV стст. да н. ч., сармацкі этап – III ст. да н. ч. – II ст. н. ч. [12, с. 220].

Асноўныя помнікі сармацкага перыяда – гэта пахаванні. Вядомы групы да сотні і больш насыпаў, усе з'яўляліся родавымі ўсыпальніцамі. У саўраматаў быў распаўсюджаны культ агню. Як і ў скіфаў, у саўраматаў шмат знойдзена зброі. Саўраматы вялі пастаральную гаспадарку, разводзілі пераважна авечак і коней [12, с. 220].

У III – II ст. да н. ч. адбываецца міграцыя сармацкіх плямёнаў у еўрапейскія стэпы. Пасля заваёвы скіфаў, у сарматаў з'явілася аседлае акружэнне [5, с. 317]. У II ст. н. ч. фарміруецца познесармацкая культура, якая існуе да IV ст. н. ч. У гэты час пэўная колькасць сарматаў-аланаў была вынішчана нашэсцем гунаў, другая частка была аб'яднана з гунамі і рухалася далёка на захад. Асобныя рысы сармацкай культуры працягвалі існаваць да VIII ст. у культурах еўразійскіх качэўнікаў [5, с. 326].

У III ст. н. ч. на тэрыторыі Ніжняга і Сярэдняга Падняпроўя, Паўднёвым Бузе і Днястры да Чорнага мора, з'яўляецца новая культура – чарняхоўская. Асноўныя помнікі культуры – вялікія пасяленні адкрытага тыпу, якія нагадваюць сучасныя сёлы, і могільнікі, у якіх разам з палямі пахаванняў сустракаюцца і трупапакладанні. Розныя пахавальныя абрады сведчаць пра змешаны характар чарняхоўскай культуры [12, с. 348].

Пасяленні не мелі абарончых сцен. Людзі жылі ў дамах-мазанках. У насельніцтва чарняхоўскай культуры існавала сацыяльная няроўнасць. Культуру характарызуюць шырокія гандлёвыя сувязі, высокі ўзровень развіцця рамёстваў. Насельніцтва займалася ворным земляробствам. Культура спыніла сваё існаванне ў IV ст. н. ч. Яе знікненне звязана з уварваннем ордаў гунаў у 375 г., якія разбілі саюз готаў і знішчылі пасяленні Сярэдняга Падняпроўя [12, с. 348].

**6.4. Культуры балцкіх плямён.** Вялізарныя лясныя абшары Усходняй Еўропы ў жалезным веку насялялі балцкія плямёны. Яны ўтварылі вельмі ўстойлівую этна-культурную вобласць днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур, якая існавала больш чым тысячагоддзе і займала большую частку тэрыторыі Беларусі (цэнтральныя і паўночныя раёны сучаснай тэрыторыі). Насельніцтва гэтых культур засвоіла мясцовую вытворчасць жалеза адносна позна – на рубяжы старой і новай эры. На поўдзень ад гэтых культур на тэрыторыі Беларускага Палесся і лесастэпавай зоне Падняпроўя пражывалі плямёны *мілаградскай культуры*. Насельніцтва

мілаградскай культуры чорную металургію асвоіла ў VIII ст. да н. ч. З гэтага моманту пачынае кропку адліку жалезны век Паўднёвай Беларусі.

*Днепра-дзвінская культура* існавала ў VIII ст. да н. ч. – IV – V стст. н. ч. у вярхоўях р. Вялікая, на тэрыторыі Беларускага Падзвіння і на Смаленшчыне (басейн Верхняга Дняпра). Асноўным тыпам паселішчаў былі ўмацаваныя гарадзішчы, якія размяшчаліся на ледавіковых астанцах-узгорках і на мысах надпоймавай тэрасы. Асноўнымі пабудовамі былі дамы слупавой канструкцыі, якія размяшчаліся пераважна па краі пляцоўкі. Час існавання культуры падзяляецца на тры храналагічныя перыяды. У ранні перыяд (VIII – V стст. да н. ч.) насельніцтва будавала гарадзішчы на ўзвышаных месцах каля вады. Гарадзішчы былі слаба ўмацаваныя, па краі рабіліся драўляныя агароджы. Асноўным заняткам насельніцтва была жывёлагадоўля [21, с. 227].

У сярэдні перыяд (IV – I стст. да н. ч.) павялічваюцца памеры гарадзішчаў, ускладняюцца абарончыя збудаванні. Падоўжаныя дамы слупавой канструкцыі, падзеленыя на асобныя памяшканні з каменнымі вогнішчамі пасярэдзіне, размяшчаліся па перыметры пляцовак. З’явіліся прывазныя жалезныя вырабы.

Позні перыяд (I – IV – V стст. н. ч.) характарызуецца складанай і дасканалай сістэмай кальцавых валоў з драўлянымі сценамі і рвоў вакол схілаў ніжэй пляцоўкі гарадзішча. Жытлы апошняга этапа – гэта невялікія наземныя чатырохвугольныя пабудовы слупавой канструкцыі з каменнымі вогнішчамі пасярэдзіне. Жалезныя прылады атрымалі шырокае распаўсюджанне. Вядучай галіной гаспадаркі стала ляднае земляробства і жывёлагадоўля, а таксама разнастайныя заняткі, звязаныя з апрацоўкай косці, каменю і дрэва, прадзеннем, ткацтвам, пляценнем [21, с. 227].

*Культура штрыхаванай керамікі* існавала на тэрыторыі Сярэдняй Беларусі і Ўсходняй Літвы з канца II тыс. да н. ч. па IV – V стст. н. ч. Сёння археолагі вылучаюць дзве культуры штрыхаванай керамікі: раннюю (канец II тыс. да н. ч. – канец I тыс. да н. ч.) і познюю (I – IV – V стст. н. ч.).

У I тысячагоддзі да н. ч. у культуры ранняй штрыхаванай керамікі дамінавалі вырабы з косці і каменю. Чорная металургія ў носьбітаў культуры зарадзілася не раней мяжы старой і новай эры. У гэты час існавалі выключна пагоркавыя гарадзішчы са слабай сістэмай драўляна-земляных умацаванняў. Домабудаўніцтва прадстаўлена наземнымі шматкамернымі ці аднакамернымі дамамі, якія ацяпляліся глінабітнымі, радзей каменнымі агнішчамі. Аснову гаспадарчай дзейнасці складала жывёлагадоўля з перавагай вырошчвання свінняў. Падсечнае земляробства было абмежавана. Грамадскі лад характарызуецца развітым патрыярхатам.

Культура позняй штрыхаванай керамікі датуецца I ст. да н. ч. і існавала да V ст. н. ч. Гарадзішчы ўмацоўваюцца некалькімі лініямі валоў. Побач з наземнымі дамамі слупавой канструкцыі з'яўляюцца дамы-паўзямлянкі і наземныя дамы зрубнай канструкцыі. Касцяныя вырабы практычна цалкам замяняюца жалезнымі. На першы план выходзіць падсечнае земляробства. Галоўным становіцца вырошчванне буйной рагатай жывёлы. Актыўна развіваецца чорная металургія. Сацыяльны лад па-ранейшаму адпавядаў стадыі развітога патрыярхату [7, с. 118 – 119].

Класічным помнікам культуры штрыхаванай керамікі з'яўляецца гарадзішча Малышкі (Вілейскі раён). Гарадзішча з трох бакоў умацавана падковападобным валам. Выяўлены рэшткі шасці жытлаў, якія размяшчаліся ў два рады па тры жытлы ўздоўж стромкага берага р. Сэрвач. Жытлы мелі зрубную канструкцыю (памеры 14×8 м, 17,8×8,2 м), пазы паміж бярвёнамі абмазваліся глінай, сцены падтрымліваліся слупамі. Кожнае жытло мела чатыры жылых памяшкання і двусхільны дах. Унутры кожнага памяшкання размяшчалася адкрытае авальнае ці круглае агнішча з пласта пяску, абкладзенага глінай. Гарадзішча існавала на познім этапе культуры штрыхаванай керамікі [15, с. 393 – 394].

Аб'ядноўвае абедзве культуры адна характэрная асаблівасць: пахавальны абрад насельніцтва не вядомы. На сённяшні дзень археолагамі не адкрыты пахвальныя помнікі гэтых культур, магчыма, у насельніцтва існаваў спецыфічны абрад, ад якога не засталося матэрыяльных сведчанняў.

На поўдзень ад этнакультурнай вобласці днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур існавала *мілаградская культура* ранняга жалезнага веку (VII – III стст. да н. ч.). Арэал культуры ахоплівае басейн Дняпра ад сярэдняга цячэння Бярэзіны на поўначы да р. Рось на поўдні і ад Заходняга Буга на захадзе да р. Іпуць на ўсходзе (сучасныя Гомельская, Магілёўская вобласці і сумежныя тэрыторыі Украіны і Расіі). Існавалі два тыпы паселішчаў: умацаваныя гарадзішчы і адкрытыя селішчы. У Прыпяцкім Палессі гарадзішчы размяшчаліся пераважна ў забалочаных мясцінах, а таксама ў поймах рэк на невысокіх узвышшах і ўмацоўваліся валамі і равамі з усіх бакоў. Нярэдка гарадзішчы складаліся з двух пляцовак, аддзеленых адна ад адной валамі (Гарошкаў, Мілаград і інш.).

Асноўным тыпам жылля была зямлянка, наземныя альбо заглыбленыя ў зямлю жытлы плошчай 12 – 16 кв. м, разлічаныя на адну сям'ю. Жытлы мелі слупавую канструкцыю і выступ у адной са сцен, што з'яўляецца характэрнай асаблівасцю мілаградскіх жытлаў. Пасярэдзіне размяшчаўся слуп – апора даху. Для гаспадарчых мэт выкарыстоўвалі пабудовы накшталт хлявоў і ям-паграбоў [6, с. 427].

Пахавальныя помнікі – курганныя і бескурганныя могільнікі. Курганныя пахаванні належылі да ранняга этапу культуры. Пахавальны абрад – трупапакладанне на гарызонце, часам на спецыяльнай падсыпцы ці ў драўляных скрынях, а таксама ў неглыбокіх ямах. У магілу клалі адзін-два гаршчкі, радзей, зброю і ўпрыгожванні. Пахавальны абрад грунтовых могільнікаў – трупаспаленне. Пахавальны інвентар больш бедны, складаўся з некалькіх кавалкаў гліняных пасудзін і зубоў свойскіх жывёл [6, с. 427].

Асноўнымі формамі гаспадаркі носьбітаў мілаградскай культуры было земляробства і жывёлагадоўля. Паляванне і рыбалоўства мела дапаможны характар. Былі развіты хатнія рамёствы: здабыча і апрацоўка жалеза, бранзаліцейная вытворчасць, прадзенне, ткацтва і інш. Апрацоўка чорных металаў была вядома ў насельніцтва мілаградскай культуры з VIII ст. да. ч. Плямёны мілаградскай культуры знаходзіліся на стадыі развітога першабытнаабшчыннага ладу, не выключана існаванне патрыярхальнага рабства. У рэлігійных уяўленнях культ сонца займаў цэнтральнае месца, існавалі культы каня, каровы, мядзведзя, ваўка і інш. Этнічная прыналежнасць культуры не высветлена [6, с. 428]. Насельніцтва пражывала ў арэале балцкай гідраніміі, аднак асобныя вучоныя адносяць гэтую культуру да кола славянскіх старажытнасцяў.

*Зарубінецкая культура* з'яўляецца спадкаемцай традыцый насельніцтва мілаградскай культуры. Плямёны зарубінецкай культуры жылі на тэрыторыі Сярэдняга і Верхняга Падняпроўя, Прыпяцкага Палесся ў II ст. да н. ч. – II ст. н. ч. Асноўны занятак насельніцтва – земляробства, жывёлагадоўля і паляванне, а таксама розныя хатнія рамёствы. Людзі выкарыстоўвалі гарадзішчы, пабудаваныя мілаградскім насельніцтвам, але пераважна жылі на неўмацаваных паселішчах. Будавалі наземныя дамы слупавой канструкцыі. Яны былі аднакамерныя, прамавугольныя альбо квадратныя ў плане, плошчай 10 – 24 кв. м. Унутры дома размяшчалася каменнае агнішча на глінянай пляцоўцы, пазней – глінабітная печ. На селішчах асноўным тыпам жытла была паўзямлянка, што дае падставы вучоным разглядаць гэты элемент як рысу славянскай культуры. Разам з жытламі размяшчаліся ямы-склепы [17, с. 263].

Пахавальныя абрады – трупаспаленне, зрэдку трупапакладанне. Могільнікі не маюць знешніх прыкмет. У Верхнім Падняпроўі выяўлены ямныя трупаспаленні і кенатафы, у Прыпяцкім Палессі – ямныя і урнавыя пахаванні са спальваннем і пахаваннем чарапоў. У магілах трапляюцца прылады працы, посуд, упрыгожванні [17, с. 263]. Насельніцтва падтрымлівала сувязь са скіфскімі, сармацкімі, кельцкімі плямёнамі, гарадамі Паўночнага Прычарнамор'я. Класічным помнікам гэтай культуры з'яўляецца гарадзішча, селішча і могільнік Чаплін Лоеўскага раёна.

На гарадзішчы (памеры 85×73 м) даследавана больш 20 жытлаў, на селішчы – слупавыя жылыя пабудовы, гаспадарчыя ямы. Пахавальны абрад могільніка – трупаспаленні ў круглых і прадаўгаватых ямах на глыбіні 0,3 – 0,5 м. Знойдзена шмат керамічнага посуду, жалезных вырабаў, зброі, упрыгожванняў, у тым ліку 1164 грэчаскія шкляныя пацеркі, косці і зубы свойскай жывёлы. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, а таксама хатнімі промысламі [18, с. 641].

З VI ст. у Еўропе пачынаецца эпоха ранняга Сярэдневякоўя. На тэрыторыі Беларусі ў гэты час адбываліся працэсы, якія маюць шмат падабенства з агульнаеўрапейскімі. У прыватнасці, ідзе разлажэнне першабытнаабшчыннага ладу, насельніцтва знаходзіцца на такім узроўні развіцця грамадскіх адносін, які атрымаў назву ваеннай дэмакратыі. У гэты час, які можна назваць пераддзяржаўніцкім, на Беларусі пачынаюць фарміравацца саюзы плямён, якія на пэўным этапе мелі адзінаначальнае кіраўніцтва. Яскравым прыкладам існавання такой супольнасці з’яўляюцца плямёны *культуры тыпу Банцараўшчыны-Тушамля*.

Насельніцтва гэтай культуры ў VI – VIII стст. н. ч. насялялі тэрыторыі Верхняга Падняпроўя, Верхняга Панямоння, Верхняга і Сярэдняга Падзвіння. Асноўны занятак насельніцтва – земляробства, жывёлагадоўля; паляванне і рыбалоўства мелі дапаможны характар. Былі развіты здабыча і апрацоўка жалеза, бронзаліцейная вытворчасць. Ганчарства, апрацоўка дрэва і косці. Асноўны тып пасялення – селішчы, шмат селішчаў размяшчалася побач з умацаванымі гарадзішчамі-сховішчамі. Жытлы будавалі наземныя і паўзямлянкавыя. Паўзямлянкі былі пераважна зрубнай канструкцыі. Наземныя жытлы былі слупавой канструкцыі. Шматкамерная планіроўка асобных жытлаў сведчыць пра захаванне родавых адносін [14, с. 73].

Асноўнай формай пахавальнага абраду насельнітцва была крэмацыя на бескурганных ці курганных могільніках. Крэмацыя адбывалася за межамі могільніка, пасля чаго ачышчаныя ад попелу косці змяшчаліся ў гліняныя урны, або ссыпаліся на дно магільных ям. Даследаваны доўгія курганы банцараўскай культуры, якія ўтрымлівалі да дзевяці пахаваняў. Пахавальны інвентар вельмі бедны і, часцей за ўсё, складаецца з цэлых альбо фрагментаваных пасудзін. Доўгія курганы выяўлены на правабярэжжы Беларускага Падзвіння [14, с. 73].

Большасць даследчыкаў лічаць, што банцараўская культура належыла балтам, у асяроддзе якіх з тэрыторыі пражскай культуры адбываецца інфільтрацыя невялікіх славянскіх калектываў.

**6.5. Культуры фіна-ўграў.** Фіна-угорская археалогія абшырная па тэрыторыі і па колькасці археалагічных помнікаў. На ўсходзе фіна-угры

пражывалі на тэрыторыі Урала і Заходняй Сібіры, а таксама ў басейне Сярэдняй Волгі, Акі і Камы. Фарміраванне фіна-волжскай агульнасці адносіцца да ранняга жалезнага веку (дзякоўская ці культура тэкстыльнай керамікі). Фіна-угорскі арэал падзяляецца на заходні (продкі ліваў, паўночных эстаў, ямі) і ўсходні (паўднёвыя эсты, водзь, карэла, весь, чудзь завалочская). У другой палове I тыс. н. ч. з'яўляюцца пахавальныя помнікі: пясчаныя курганы-сопкі з трупаспаленнем, якія звязаны са славяна-фінскім сімбіёзам (Іжорскае плато). Сопкі ўяўлялі сабой высокія крутабокія насыпы шмат'яруснай будовы. Гэта былі вялікія калектыўныя магільныя склепы, якія ўтрымлівалі дзесяткі пахаванняў, і, відавочна, належылі вялікай патрыярхальнай сям'і [20, с. 570]. На тэрыторыі Паўночнай Беларусі ўплыў матэрыяльнай культуры фіна-ўграў прасочваецца на некаторых гарадзішчах жалезнага веку (Буракова, Загорцы, Гарадоцкі раён; Мямлі, Аршанскі раён і інш.), а таксама курганных пахаваннях трэцяй чвэрці I тыс. да н. ч. (Баркі, Янкавічы, Расонскі раён і інш.) [22, с. 630].

**6.6. Заходнееўрапейскае сярэдневякоўе.** Заходнееўрапейскае сярэдневякоўе пачалося з заняпаду антычнай культуры ў выніку варварскага нашэсця V – VI стст. н. ч. Найбольш яскрава гэты працэс ілюструе праўленне дынастыі Меравінгаў у Францыі (486 – 751 гг.). У Еўропе пачаўся перыяд аграрызацыі, парушэння эканамічных, палітычных і культурных сувязяў, пераход да натуральнай гаспадаркі. Толькі ў некаторых рэгіёнах у VI ст. працягвалі будаваць двух-, трохпавярховыя дамы з плінфы (Італія, Паўднёвая Галія, Іспанія). Зямля апрацоўвалася двухполлем, якое паступова замянялася трохполлем. Толькі напрыканцы IX ст. паўсюдна распаўсюдзіліся плугі: малы лёгкі плуг, фактычна саха, для апрацоўкі камяністых ці каранёвых глебаў, які толькі разразаў зямлю на доўгія барозны, і цяжкі калёсны плуг з жалезным лемехам, які пры ворыве не толькі рэзаў, але і перагортаваў зямлю. Барана выкарыстоўвалася пераважна пры апрацоўцы агародаў. Баранаванне палёў рабілася пры дапамозе цяжкога драўлянага бервяна, якое цягнулі па ўзаранаму полю, такім чынам разбівалі кавалкі зямлі. У гаспадарцы выкарыстоўвалі таксама косы, сярпы, двузубыя вілы і граблі [2, с. 155].

У XI ст. у Заходняй Еўропе распаўсюдзіліся вадзяныя млыны, а ў XII ст. – ветракі. Да сярэдзіны XIV ст. жалеза атрымлівалі шляхам награвання змяшанай з палівам руды ў нізкашахтавых печах ці горнах у т. зв. печах-домніцах. У XV ст. доменныя печы, якія працавалі на драўляным вугалі, меліся ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Зарадзілася чыгуналіцейная вытворчасць (адліўка званоў, гармат, ядраў). У рамесных майстэрнях выраблялі халодную і вогнястрэльную зброю. Сталі выкарыстоўвацца зварка,

коўка метала, загартоўка сталі. У XIII ст. была вынайдзены ручны калаўрот для прадзення, у XV ст. – механізаваны калаўрот [11, с. 133 – 134].

У горнай справе дамінавала Германія, якая давала прыкладна палову еўрапейскай здабычы металічных руд. У горадзе Гослары актыўна здабывалі серабро. Сарэбраныя копі вядомы былі і на тэрыторыі Чэхіі. Каля Зальцбурга сканцэнтравалася здабыча солі, якая вялася тут з бронзавага веку. На тэрыторыі Славакіі засяродзілася здабыча золата, у Крэмніцы здабывалася золата і чаканіліся залатыя дукаты. Польшча спецыялізавалася на здабычы солі, Швецыя – жалезных і медных руд, Англія – волава, жалезнай руды, каменнага вугалю), Іспанія – жалеза, медзі, золата, срэбра, ртуці. Склаліся галоўныя цэнтры па вытворчасці зброі: Мілан, Кардова, Таледо, Золінген, Нюрнберг, Аўгсбург. Фландрыя з’яўлялася буйнейшым цэнтрам бронзавага ліцця, тут квітнела людвісарская справа і адліўка званоў. Самай значнай верфю па будаўніцтву караблёў з’яўляўся венецыянскі Арсенал. Ваўнаткацкая і суконная вытворчасць квітнела ў Англіі, Паўднёвай Германіі, Францыі, у Таскане (Фларэнцыя) і Фландрыі (Бругге). У XIV – XV стст. З’явілася шоўкаткацкая справа ў Фларэнцыі і Ліоне [11, с. 135].

З ІІІ тыс. да н. ч. людзі карысталіся сонечным гадзіннікам. Механічны вежавы гадзіннік упершыню з’явіўся ў Мілане ў 1335 г. У 1657 г. галандзец Хрысціян Гюйгенс (1629 – 1695) стварыў прататып сучасных маятнікавых гадзіннікаў [19, с. 59].

Компас быў упершыню сканструяваны ў Кітаі каля 2 тыс. гадоў таму. У Сярэдневякоўі ён быў удасканалены і атрымаў шырокае распаўсюджванне. Магнітная стрэлка мацавалася на кавалку корка, які плаваў у вадзе, пасля каснтрукцыя рабілася ўсё больш дасканалай і прыстасаванай да карабельнага хістання [19, с. 59]. Многія тэхнічныя вынаходніцтвы былі створаны ў Кітаі, але найбольшае распаўсюджанне атрымалі ў краінах Захаду. Так, папера была адкрыта Чай Лунем ў Кітаі ў ІІ ст. У пачатку н. ч. там жа было зроблена рэчыва, якое па складу падобнае на порах. Да вынаходніцтва паперы асноўным матэрыялам для пісьма з’яўляўся пергамент. Дагэтуль кнігі ўяўляліся сабой папірусныя світкі. Пергамент – гэта асаблівым чынам апрацаваная цялячая ці авечая скура. Для вырабу адной Бібліі патрабавалася каля 300 авечых скур, а на перапіску кнігі – 2-3 гады. Напрыканцы XV ст. у Еўропе было надрукавана на паперы звыш 40 тыс. кніг [9, с. 522].

Першыя летапісы, дзе згадваецца порах, у Кітаі датуюцца XIII ст., а ў Еўропе – XIV ст. [19, с. 68]. У VII ст. адраджаецца ў пасляЛатэнскі час прымяненне ганчарнага круга, грэкі ў VI – VIII стст. рабілі катапульты, асадныя вежы і запальнае рэчыва (“грэчаскі агонь”). Ювелірныя вырабы

для знаці адрозніваліся раскошай і вытанчанасцю. У VI – VII стст. пачынаюць адраджацца рымскія дарогі па Рэйну і ў Англіі. У паўночнай частцы Еўропы ў гэты час дамінавала матыжнае земляробства і грубая ляпная кераміка. Аднак у VIII – IX стст. пачынаюць развівацца гарады, будуюцца каменныя масты, у будаўніцтве выкарыстоўваецца цэгла. Хутка развіваюцца кавальскае і зброевае рамёствы. Шпоры, падковы і страмёны з'яўляюцца шырока распаўсюджанымі, у VIII ст. фарміруецца рыцарскае войска, з'яўляецца цяжкі меч, кальчуга і цэльнаклёпаны металічны даспех. У X ст. з'явілася цвёрдае сядло з трывалым крапяжом [9, с. 518].

Імклівае развіццё навукі і тэхнікі прывяло да ўзнікнення ў XIV – XV стст. крывашыпных механізмаў, зубчатых перадач, свідравальных станкоў, колавага дамкрата, пад'ёмных кранаў, землярыйных машын і інш. У керамічнай вытворчасці адбылося вынаходніцтва тонкай керамікі – папярэдніцы фарфора (Карра, XV ст.) [9, с. 522].

У XII ст. агнястрэльная зброя была ўпершыню выкарыстана арабамі і ў XIV ст. яна распаўсюдзілася ў Еўропе. У пачатку XIV ст. пушкі масава былі выкарыстаны пры аблозе касцільцамі арабскага Гібралтара (1308 г.) [9, с. 523].

Каралінгская эпоха (751 – 843 гг.) знаменавала сабой пачатак г. зв. "каралінгскага адраджэння", якое пачалося пры Карле Вялікім напрыканцы VIII – пачатку IX стст. і датычылася перш за ўсё духоўнай культуры. У IX ст. узрастае колькасць царкоўных кніг – кодэксаў, агульны лік якіх перавышае 7000. У X – першай палове ХШ стст. назіраецца заняпад "каралінгскага адраджэння" падчас кіравання дынастыі Капетынгаў у Францыі (987 – 1328 гг.).

**6.7. Славянскія культуры жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя.** Славянскія народы побач з раманскімі і германскімі – адны з самых буйных этнічных утварэнняў Еўропы. Фарміраванне славянскай культуры прайшло праз некалькі этапаў. Праславянскі этап ахоплівае перыяд другой паловы II – I тыс. да н. ч. У той час у Еўропе існавала некалькі роднасных культур, якія мелі протаславянскія элементы (лужыцкая, тшынецкая, пшэворская, зарубінецкая). Гэта ўласна яшчэ не былі славяне, але яны аказалі значны ўплыў на развіццё будучых этнічных супольнасцей германцаў, славян, балтаў і іншых народаў.

Другі этап – старажытнаславянскі. У першай палове I тыс. н. ч. Можна вылучыць археалагічную культуру старажытных славян (пражскую). Іх агульная культура ў эпоху Вялікага перасялення народаў паступова трансфармавалася ў культуры ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян. Трэці перыяд ахоплівае час фарміравання ў славян дзяржаўных утварэнняў [12, с. 340 – 350].

Першая бясспрэчна славянская культура – *пражская*. Яна існавала ў V – VII стст. н. ч. Гэтая культура займала вялізны арэал Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (тэрыторыі сучасных Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Аўстрыі, часткова Ўсходняй Германіі, Славеніі). Самы ранні этап гэтай культуры існаваў на тэрыторыі Беларускага Палесся ў IV ст. н. ч. (гарадзішча Петрыкаў-2 на ўскраіне г. Петрыкава на р. Прыпяць, даследаванні беларускага археолага Валянціны Сяргееўны Вяргей) [3, с. 151, 158].

Людзі жылі ў паўзямлянках з печамі-каменкамі, складзенымі з камянёў і гліны, хавалі памерлых у бескурганных могільніках па абраду трупапаспалення. На познім этапе з’яўляюцца курганныя пахаванні. Асноўны археалагічны матэрыял – гэта керамічны посуд г. зв. пражскага тыпу. На тэрыторыі Паўднёвай Беларусі і Паўночна-Заходняй Украіны існаваў варыянт пражскай культуры – *карчакскі* (ад пасялення Корчак паблізу Жытоміра). У VII ст. на помніках тыпу Корчак з’яўляюцца невялікія круглыя ў плане гарадзішчы, умацаваныя невысокім валам (Хатомель, Бабка, Хільчыцы) [12, с. 350].

Плямёны культуры Корчак археолагі звязваюць з племянным саюзам дулебаў, з якога паходзяць гістарычна вядомыя валыняне, драўляне, дрыгавічы і паляне [12, с. 350].

Напрыканцы VIII ст. на левабярэжжы Дняпра і ў міжрэччы сярэдняга цячэння Дняпра і Верхняга Дона склалася *раменска-боршаўская культура*. Помнік гэтай культуры – цалкам раскапанае Новатроіцкае гарадзішча (Сумская вобл. Украіны). Пасяленні былі размешчаны на высокіх мысах, умацаваны валам і рвом. Людзі жылі ў паўзямлянках з бярвеністымі сценамі. Унутры жытлаў былі ўсталяваны глінабітныя печы. Побач з жытлом знаходзіліся ямы для захоўвання зерня. Жыхары вырошчвалі пшаніцу, ячмень, жыта, проса. Земляробства было ворыўным: на пасяленні знойдзены плужныя нажы і лемехі. Хлеб убіралі жалезнымі сярпамі, зерне размалывалі ручнымі жорнамі. Насельніцтва гадавала кароў, коней і свінняў. Былі развіты гандлёвыя сувязі з Сярэдняй Азіяй і Балтыкай [12, с. 354].

Асаблівасцю культуры з’яўляюцца, па-першае, наяўнасць умацаваных гарадзішчаў (на астатняй частцы славянскага арэала пасяленні былі неўмацаваныя); па-другое, раменскі керамічны посуд аздоблены па плечыку геаметрычны арнаментам у выглядзе грабенчатага штампа ці плеценай вяроўкі. Многія элементы раменска-боршаўскай культуры маюць прамыя аналогіі ў культурах усходніх славян.

У VIII ст. на правабярэжжы Дняпра, на Жытоміршчыне, складваецца *лука-райкавецкая культура*, якая з’ўляецца пераемніцай пражскай. Для яе характэрны неўмацаваныя пасяленні, якія размешчаны на невялікіх узвыш-

шах. Жытлы прадстаўлены паўзямлянкамі, унутры якіх знаходзіліся печы-каменкі [12, с. 355].

Хатомельскае гарадзішча (каля в. Хатомель Столінскага раёна) мае памеры 40×30 м, было ўмацавана валам і ровам. З'яўляецца класічным помнікам культур тыпу Корчак і Лукі Райкавецкай і выкарыстоўваецца як эталон для датавання іншых археалагічных аб'ектаў. Гарадзішча не было заселена, з'яўлялася сховішчам, пазней – грамадскім цэнтрам, месцам сходаў. Каля гарадзішча размешчана селішча. На селішчы раскапаны прамавугольныя паўзямлянкі, плошчай 12 – 30 кв. м. Паўзямлянкі мелі земляную падлогу, сцены з двайнога плятня, абмазанага глінай. Абаграваліся дамы круглымі глінабітнымі печамі на драўляным каркасе, размешчаным у куце альбо каля сцяны. Некаторыя печы пабудаваны на месцы агнішчаў. У жытлах выяўлены гаспадарчыя ямы, слупавыя прыбудовы. Бескурганны могільнік знаходзіўся на адлегласці 200 м ад гарадзішча. Знойдзены перавернуты гліняны гаршчок з кальцыніраванымі касцямі, абкладзены камянямі [4, с. 350].

Класічнымі пахавальнымі помнікамі ранніх славян культур тыпу Прага-Корчак і Лукі Райкавецкай з'яўляюцца паўсферычныя курганы з трупаспаленнем. Інвентар курганоў, як і пасяленняў, у цэлым даволі бедны на знаходкі. Крэмацыя адбывалася заўсёды па-за межамі пахаванняў.



Саха з перакладной паліцай

Напрыканцы IX – X стст. назіраецца значны пералом развіцця вытворчых сіл і культуры ўсходніх славян. У гэты час узрастае роля рамёстваў, адбываецца яго аддзяленне ад сельскай гаспадаркі, з'яўляецца маёмасная няроўнасць. Аднак гэтыя працэсы развіваліся не аднолькава ў стэпавай і лесастэпавай зоне Ўсходняй Еўропы і лясной зоне. У Сярэднім Падняпроўі ворыўнае земляробства было вядома яшчэ ў I ст. н. ч., тады як падсечнае земляробства было асноўным у лясной зоне да VIII ст. Тут асноўнай земляробчай прыладай заставалася матыка. Саха з'яўляецца позна, прынцыповае адрозенне сахі і плуга заключаецца ў тым, што саха рыхліць зямлю, а плуг падразае і перагортвае пласт [12, с. 355]. Славянскі плуг – гэта фактычна яшчэ рала з металічным наральнікам і чарэслам, якія падразалі верхні пласт зямлі (знойдзены на селішчах каля вв. Хатомель, Столінскага і Дворыцкая слабада, Мінскага раёнаў). У X – XI стст. з'яўляюцца двухзубая драўляная саха з металічнымі сашнікамі. Сашнікі знойдзены падчас раскопак многіх беларускіх гарадоў [10, с. 274].

Такім чынам, працэс развіцця гаспадаркі і разбурэння першабытна-абшчынных адносін найбольш інтэнсіўна праходзіў на поўдні ўсходнеславянскіх земляў. У вынку гістарычнага развіцця карчакскіх, лука-райкавецкіх і раменска-боршаўскіх плямён сфарміраваліся культуры ўсходніх славян [12, с. 355].

Паганскія вераванні славян адлюстроўваюць шырокі пласт традыцыйнай культуры. Паганства як пануючая форма светаўспрымання было шырока распаўсюджана на беларускіх землях да XI ст. у гарадах і да XII ст. у сельскай акрузе. Сутнасць паганскага светаўспрымання фіксуецца з дапамогай этнаграфічных даных, а таксама археалагічных знаходак (рэшткаў капішчаў, падвесак-абярэгаў, каменных стодаў і інш.). Свяцілішча зарубінецкай культуры вядома па раскопках селішча Грудок (Бранская вобл.). Гэта круглая ў плане пабудова дыяметрам 5 м. У цэнтры свяцілішча быў глінабітны ахвярнік-агнішча. Каля яго стаялі тры драўляныя стоды. У цэнтры канічнага даху шырокая дымавая адтуліна. Побач з круглай знойдзена другая пабудова, дзе быў посуд з магічнымі знакамі, прысвечанымі аграрнаму культу. На гарадзішчы-сховішчы Тушамля (Смаленская вобласць) у другой чвэрці I тыс. н. ч. мелася свяцілішча ў выглядзе круглай пляцоўкі дыяметрам 6 м, абкружанае слупамі. У цэнтры агароджы стаяў драўляны стод [8, с. 560].

Пашырэнне хрысціянства адбывалася паступова і вельмі марудна, што па археалагічным даным адпавядае стадыі распаўсюджвання курганоў з трупапакладаннем замест трупаспалення, а ў гарадах – з'яўленне ў культурных адкладах рэчаў хрысціянскага культа (крыжы-цельнікі, царкоўнае начынне, дэталі кніг і інш.). Спачатку гэта былі прывазныя з Візантыі і Кіеўскай зямлі рэчы, пасля з'яўляюцца творы мясцовых ювелірных школ.

У IX – XI стст. з'яўляюцца г. зв. дружынныя курганы на Смаленшчыне, Чарнігаўшчыне, каля Яраслаўля і Кіева. У гэтых язычніцкіх курганах пахаваныя не толькі дружыннікі – прадстаўнікі новага феадальнага класа, які пачынае фармавацца ў гэты час, але і гандляры. Курганныя могільнікі размешчаны на гадлёвых шляхах, у т. зв. волаках (пратокі паміж буйнымі рэкамі).

Найбольш вядомы Гнёздаўскі курганны могільнік каля Смаленска. Гнёздаўскі некропаль (налічваў не менш 3 тыс. насыпаў) узнік на р. Днепр на месцы волака, які злучаў рэкі Днепр і Ловаць. Непадалёк знаходзілася Заходняя Дзвіна. У Гнёздаве існавала пасяленне на волаку, дзе жылі плотнікі, рамеснікі, земляробы і гандляры. Могільнік налічвае каля трох тысяч курганоў. Большасць курганоў невялікія, вышынёй каля 1 м. Адзін з

іх мае вышыню каля 10 м. Пад яго насыпам адкрыты рэшткі вогнішча, на якім быў спалены князь і некалькі жанчын. Побач у асобым кургане быў пахаваны конь. У 700 раскапаных гнёздаўскіх курганах быў зафіксаваны адзін і той жа абрад пахавання – трупаспаленне. Вялікая група кургаНоў не ўтрымлівала ніякіх рэчаў і слядоў пахавання. Яны насыпаліся у гонар памерлых далёка ад дома [12, с. 357].

Агульнымі рысамі славянскай культуры з'яўляюцца: па-першае, наяўнасць адметнага тыпу жытла – паўзямлянак зрубнай канструкцыі з печамі-каменкамі; па-другое, звычай ўпрыгожваць галаву жанчыны скроневымі колцамі і шыйнымі грыўнямі разнастайных форм у залежнасці ад племяннай прыналежнасці; па-трэцяе, адметнай формы керамікі г. зв. пражскага тыпу (высокі гаршчок з усечана-канічным тулавам, злёгку звужаным горлам і кароткім венцам); па-чацвёртае, наяўнасць вызначанага асартыменту земляробчых прылад (сярпы, зернацёркі), у тым ліку славянскага плуга. Нарэшце, адметнасцю славянскай культуры з'яўляецца вырошчванне жыта, якое называюць “славянскім хлебам”.

Развіццё заходнеславянскай цывілізацыі ў VI – X стст. адбывалася на тэрыторыі ўсходнееўрапейскай раўніны, якая з поўначы была абмежавана Балтыйскім морам, з поўдня мяжой былі Карпаты. Заходнімі суседзямі польскіх славян былі палаба-прыбалтыйскія славяне, паўднёвымі – чэхі, маравы і славакі. У VI – X стст. польская група заходніх славян дасягнула адносна высокага ўзроўню развіцця вытворчых сіл. Асновай гаспадаркі з'яўлялася ворыўнае земляробства. У сярэдзіне X ст. у Польшчы ўжо было трохполле. Асноўная колькасць сельскага насельніцтва жыла на селішчах. Гроды – добра ўмацаваныя пасяленні – з'яўляліся гарадзішчамі-сховішчамі. Гроды былі ваенна-адміністратыўнымі пунктамі і цэнтрамі рэлігійнага культа. Па меры ўсталявання феадальных адносін, гроды пераўтвараліся ў замкі князёў і знаці, а таксама моцныя рамесныя і гандлёвыя цэнтры. Вакол іх узнікалі пасады з гандлёва-рамесным насельніцтвам. Такімі цэнтрамі ў X – XI стст. былі Познань, Гнезна, Вроцлаў, Кракаў, Гданьск, Калабжэг [2 , с. 236]. У палабскіх славян першымі гарадамі сталі Бранібор, Рэтра, Мікелін (Макленбург).

Вядомым рэлігійным цэнтрам балтыйскіх славян была Аркона. Аркона (Arkona) – гэта горад і рэлігійны цэнтр балтыйскіх славян X – XI стст. на в. Руген (Германія). Быў разбураны датчанамі ў 1169 годзе. Тут даследаваны рэшткі свяцілішча бога Святавіда, грамадскія і жылыя пабудовы. Насельніцтва займалася марскім гандлем. Горад быў добра вядомы датскаму сярэдневяковаму аўтару Саксону Граматыку (“Gesta Danorum”). Святавід пачытаўся як бог вайны, рог Святавіда садзейнічаў урадлівасці. Аркон-

скі храм з’яўляўся галоўным рэлігійным цэнтрам славянскага Памор’я да часоў анэксіі земляў люцічаў і абадрытаў Германіяй.

Ручны ганчарны круг быў вядомы польскім славянам у VII ст. У X ст. ў некаторых паўднёвых абласцях атрымаў распаўсюджванне нажны ганчарны круг (для параўнання: на тэрыторыі Беларусі аналагічныя прылады з’явіліся адпаведна напрыканцы X ст. і ў XV ст.). Шырока развівалася прадзенне, ткацтва, плотніцтва, кавальскае рамяство, збройніцтва і іншыя рамёствы. Ювелірныя вырабы зроблены галоўным чынам са срэбра і ўпрыгожваліся філігранню і зерню. Гэтыя рамёствы развіваліся пад уплывам усходнеславянскага рамяства [2, с. 236].

Продкі чэхаў былі аседлымі земляробамі яшчэ да пачатку н. ч. У VI ст. на тэрыторыі Чэхіі вырошчваліся ўсе віды хлебных культур, асабліва проса, ячмень і пшаніца. Разводзілася хатняя жывёла. У старажытнамараўскіх пахаваннях VI – VII стст. шырока прадстаўлены сохі, сярпы, матыкі і інш. Здабыча жалезнай руды рэзка павялічылася ў эпоху станаўлення дзяржаўных цэнтраў. Шмат печаў для плаўлення руды знойдзена на тэрыторыі Маравіі. Воіны Чэха-Маравіі спецыялізаваліся на аблозе гарадоў і карысталіся пікамі, шчытамі, стрэламі, сякерамі і мячамі, у тым ліку і двухбакававострымі мясцовай вытворчасці. У VI – X стст. з’яўляецца ганчарны круг. Буйнейшым горадам Чэхіі X ст. была Прага, якая па сведчанню Ібрахіма ібн Якуба “была адбудавана з каменю і вапны”; у Празе квітнелі шматлікія рамёствы [2, с. 233].

У выніку барацьбы з Усходняй Рымскай імперыяй славяне да VII ст. засялілі вялікую частку Балканскага паўвострава і значныя землі на поўнач ад ніжняга цячэння Дуная. Земляробства з’яўлялася асноўнай формай гаспадаркі, паступова усё большае значэнне атрымала садаводства і вінаградарства, а на поўдні – развядзенне аліўкавых дрэў. Жывёлагадоўля пераважала ў горных раёнах паўднёваславянскага арэала (Боснія, Старая Сербія, поўнач Македоніі). Найбольш развітымі рамёствамі былі: гарбарнае, ганчарнае і інш. Гаспадарка вялася вялікімі патрыярхальнымі сем’ямі (задругамі) ці індывідуальнымі сем’ямі. Некалькі сем’яў, якія пражывалі ў адной весі, утваралі сельскую (тэрытарыяльную) абшчыну. Узаемаадносіны ў такой абшчыне складваліся не на kроўна-роднаснай аснове, а па гаспадарчаму прынцыпу [2, с. 224].

Працэс утварэння дзяржавы ў паўднёвых славян адбываўся напрыканцы VI – пачатку VII стст. У гэты час племянныя правадыры – жупаны – пераўтвараліся ў князёў, прадстаўнікоў земляробчай улады. Першымі гарадамі Балгарыі сталі Ахрыд, Малая Прэслава, Скопле, Варна і інш. [2, с. 228].

## Літаратура


1. Брей, У. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.
2. Всемирная история. В 10 томах / гл. ред. Е.М. Жуков. Т. 3. – М. : Государственное издание политической литературы, 1957.
3. Вяргей, В. Раннеславянскае паселішча Петрыкаў-2 на р. Прыпяць / В. Вяргей, В. Трымер // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2003. – № 18. – С. 151 – 187.
4. Вяргей, В. С. Хатомель / В. С. Вяргей // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 632 – 633.
5. Гальперина, Г. А. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.
6. Егарэйчанка, А. А. Мілаградская культура / А. А. Егарэйчанка // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 427 – 428.
7. Егорейченко, А. А. Культуры штрихованной керамики / А. А. Егорейченко. – Минск : БГУ, 2006. – 207 с.: ил.
8. Зайкоўскі, Э.М. Свяцілішчы / Э. М. Зайкоўскі, Л. У. Дучыц, Э. А. Ляўко // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 560 – 561.
9. История средних веков: В 2 т. Учебник / под ред. С. П. Карпова. – Т. 1. – 2-е изд. – М. : Изд-во МГУ; ИНФРА-М, 2001.
10. Ісаенка, У.Ф. Земляробства / У. Ф. Ісаенка, Т. М. Каробушкіна // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 274 – 275.
11. Максаковский, В. П. Историческая география мира: учебное пособие для вузов / В. П. Максаковский. – М. : Экопрос, 1997.
12. Мартынов, А.И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.
13. Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.
14. Мітрафанаў, А. Р. Банцараўская культура / А. Р. Мітрафанаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 72 – 73.
15. Мітрафанаў, А. Р. Малышкі / А. Р. Мітрафанаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 393 – 394.

16. Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 2: Бронзовый и железный века / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1974.

17. Побаль, Л. Д. Зарубінецкая культура / Л. Д. Побаль // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 263 – 264.

18. Побаль, Л. Д. Чаплін / Л. Д. Побаль // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 641.

19. Кириллин, В. А. Страницы истории науки и техники / В.А. Кириллин. – М. : Наука, 1989.

20. Сядоў, В. В. Славяне / В. В. Сядоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 567 – 574.

21. Шадыра, В. І. Днепра-дзвінская культура / В. І. Шадыра // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 227.

22. Шадыра, В. І. Фіна-ўгры / В. І. Шадыра // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 630.

## Кантрольныя пытанні да тэмы 3

1. Калі ўпершыню чалавецтва пазнаёмілася з жалезам?
2. У чым сутнасць працэсу сырадутнага атрымання жалеза?
3. Што прынесла чалавецтву масавае распаўсюджванне жалезных вырабаў?
4. Вызначце храналагічныя рамкі жалезнага веку Еўропы.
5. Вызначце сутнасць культуры гальштат.
6. Вызначце сутнасць культуры латэн.
7. Назавіце своеасаблівыя рысы паморскай культуры.
8. Вызначце істотныя рысы пшэворскай культуры.
9. Дайце характарыстыку культур кімерыйцаў, скіфаў і сарматаў.
10. Вызначце асноўныя рысы днепра-дзвінскай культуры і культуры штрыхаванай керамікі.
11. Дайце характарыстыку мілаградскай і зарубінецкай культур.
12. Вызначце істотныя рысы культуры Банцараўшчына-Тушамля.
13. Дайце характарыстыку асноўных рыс фіна-угорскіх культур.
14. Дайце характарыстыку развіцця аграрных адносін у Заходняй Еўропе ў VI – XV стст.

15.Якія значныя тэхнічныя вынаходніцтвы з’явіліся ў Еўропе ў Сярэдневякоўі?

16.Пералічыце асноўныя металургічныя цэнтры сярэдневяковай Еўропы.

17.Якія асноўныя этапы прайшло фарміраванне славянскай культуры?

18.Дайце характарыстыку першых славянскіх культур (Прага-Корчак, раменска-боршаўскай, лукі-райкавецкай).

19.Якія змены адбыліся ў развіцці сельскай гаспадаркі славян у VI – XI стст.?

20.Як археалагічныя помнікі адлюстроўваюць вераванні старажытных славян?

21.Калі і якім чынам адбываецца пашырэнне хрысціянства на землях усходніх славян?

22. Якія агульныя рысы славянскай культуры VI – VIII стст. Вы можыце назваць?

23.Які абрад пахавання быў распаўсюджаны ва ўсходніх славян у VI – VIII стст.?

24.Назавіце асноўныя рысы развіцця матэрыяльнай культуры заходніх славян у VI – XI стст.

25.У чым спецыфіка развіцця матэрыяльнай культуры паўднёвых славян у VI – XI стст.?

# 7. СТАРАЖЫТНАЯ РУСЬ

7.1. Узнікненне Русі.
7.2. Усходнеславянская вёска.
7.3. Гандлёвыя сувязі.
7.4. Дружынныя курганы на Русі.
7.5. Распаўсюджванне пісьменства.
7.6. Феадальна-ўласніцкія замкі.
7.7. Гарады ўсходніх славян.

**7.1. Узнікненне Русі.** Узнікненне Русі цесна звязана з працэсам станаўлення гарадоў на землях усходніх славян. Першыя "грады" ўзніклі ў IX ст., паводле летапісаў гэта былі Кіеў, Смаленск, Ноўгарад, Полацк, Ізборск, Ладага, Белавозера, Растоў, Мурам і Любеч. Развіццё дзяржаўнасці ва ўсходніх славян звязана з працэсам феадалізацыі. Узнікненне "градаў" датуецца IX – X стст., аднак станаўленне гарадоў, як пасяленняў, што выконваюць пэўныя сацыяльна-эканамічныя функцыі, адбылося не раней XI – XII стст. Кожны горад меў тры галоўныя часткі – умацаваны "дзяцінец" (крэмль), гандлёва-рамеснае пасяленне каля яго – "пасад" і рынкавую плошчу – "торг". Рынкавая плошча, як правіла, была і месцам вечавых сходаў.

Працэс станаўлення Русі акадэмік Б. А. Рыбакоў падзяляе на два перыяды: 1) VI ст., калі ў Сярэднім Падняпроўі склаўся саюз славянскіх плямён; 2) VIII – IX стст., калі адбылося аб'яднанне земляў-княстваў Русі пад уладай Кіева.

У розных раёнах Русі ўзровень развіцця плямёнаў быў не аднолькавы. У славян, якія насялялі прасторы лесастэпавай і стэпавай зоны існавала ворыўнае земляробства. У славян лясной зоны пераважала працаёмкае падсечнае (ляднае) земляробства.

На думку большасці даследчыкаў, пачатковае ядро Русі, ці ўсходнеславянскай дзяржаўнасці, размяшчалася ў прытоках Дняпра – Росі і Цясміну: ад Трубчэўска на паўночным-усходзе да вусця Сулы на поўдні. На той час (IX ст.) існавалі два буйных цэнтры, якія сфармаваліся незалежна адзін ад аднаго. Паўночна-заходнія раёны былі падуладныя Ноўгараду, цэнтрам Паўднёвай Русі з'яўляўся Кіеў. Вядучая сацыяльна-эканамічная роля паўднёвых земляў абумовіла станаўленне дзяржавы Рурыкавічаў з цэнтрам у Кіеве. Яе этнічным ядром сталі землі палян – тэрыторыі найбольш развітой комплекснай гаспадаркі [2, с. 494; 5, с. 90 – 92].

У пісьмовых крыніцах тэрмін "Руская зямля" выкарыстоўваўся ў некалькіх значэннях: 1) этнічная агульнасць; 2) сукупнасць уладанняў Рурыкавічаў; 3) войска, але ў большасці выпадкаў гэты тэрмін вызначаў менавіта зямлю, вызначаную прастору, тэрытарыяльная ядро пачатковай Русі [5, с. 92].

**7.2. Усходнеславянская вёска.** Да X ст. ва ўсходнеславянскай вёсцы налічвалася ў сярэднім да дзесяці двароў. Аднак індывідуалізацыя сельскай гаспадаркі садзейнічала памяньшэнню памераў земляробчых пасяленняў [2, с. 493]. Вёскі размяшчаліся на невысокіх берагах невялікіх рэк, побач з ворыўнымі палямі. Вялікую ролю ў размяшчэнні вёсак гралі такія фактары як рыбная лоўля і знаходжанне поплаваў для выпасу жывёлы, а таксама ўрадлівая алювіяльная глеба рачных далін. Вёска складалася з аднаго-двух двароў, нярэдка сустракаліся і большыя па памерах вёскі. У X ст. адбываецца разлажэнне сельскай абшчыны на больш дробныя індывідуальныя і памеры вёсак скарачаюцца. У паўночных раёнах Русі пераважала падсечнае (ляднае) земляробства, у паўднёвых – ворыўнае [1, с. 251 – 252].




Старажытнарускі сельскагаспадарчы інвентар:
1 – рала; 2 – наральнік; 3 – саха; 4 – плуг; 5 – рыдлёўка; 6 – матыга;
7 – косы (паўночны і паўднёвы тып); 8 – серп

Асноўнай сельскай прыладай было рала. На Русі сеялі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, проса, гарох, бабы, чачавіцу, лён, каноплю, капусту і шэраг агародных культур [1, с. 252]. Пры гэтым жыта, якое ў свеце называлі "славянскім хлебам" як спецыфічнуя рысу славянскай культуры, упершыню археалагічна зафіксавана ў культурным пласце IX ст. гарадзішча Свіла-1 Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Зямлю апрацоўвалі ралам з жалезным наральнікам. Да X ст. даўжыня наральніка не перавышала 20 см, з XII ст. яна павялічваецца. Знойдзена вялікая колькасць жалезных кос-гарбуш, сярпоў, сякер. Важнай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці была жывёлагадоўля. На пасяленнях X – XII стст. знойдзены косткі каня, каровы, дробнай рагатай жывёлы, свінняў, сабакі, ката, курыцы, качкі, гуся [1, с. 252]. Развіццё сельскай гаспадаркі садзейнічала станаўленню гарадоў, якія ў XI – XII стст. сталі буйнымі адміністрацыйнымі і сацыяльна-культурнымі цэнтрамі [2, с. 493].



Інтэр'ер ізбы XII ст.

Курганных пахаванняў знойдзена больш, чым пасяленняў. Гэта тлумачыцца вельмі нязначным па магутнасці культурным пластом асобных земляробчых пасяленняў. Звычайна ў курганных некропалях старажытнарускага часу налічваецца ад 25 да 50 насыпаў, хаця вядомы некропалі да 300 і больш курганаў. Характэрнай асаблівасцю курганаў з'яўляецца ад-

сутнасць падкурганных ям. Гэта звязана з працэсам хрысціянізацыі. У X – XI стст. крэмацыя паступова змяняецца новым абрадам пахавання – інгумацыяй. Царква забараняла не толькі крэмацыю, але і насыпанне курганаў, аднак курганная традыцыя пахаванняў захоўвалася пераважна да пачатку XIV ст. У вёсцы таксама назіралася маёмасная дыферэнцыяцыя, што абумовіла з'яўленне асобных курганаў з заможным інвентаром [2, с. 494].



Селянін і гараджанін XII – XIII стст.

У большасці, сельскія пахаванні прэзентуюць устойлівы набор прадметаў, сярод якіх у мужчынскіх пахаваннях знойдзены нажы, спражкі, гаршчкі, у жаночых пахаваннях сустракаюцца ўпрыгожванні з серабра і бронзы. Зрэдку сустракаюцца сярпы [1, с. 253].

Найбольш устойлівая этнічная прыкмета ўсходнеславянскіх плямёнаў – гэта скроневыя колцы. У крывічоў гэта былі дротавыя з завязанымі канцамі, у радзімічаў сяміпрамянёвыя, у дрыгавічоў яны падобныя на замацаваныя на дроце зярнёныя пацеркі.

Сельскія кавалі большасць вырабаў выраблялі самастойна. Кавалі не рабілі прадметаў з высокаякаснай сталі.

У горадзе насельніцтва актыўна займалася агародніцтвам, гараджане мелі зямельныя надзелы як у межах горада, так і каля яго.

**7.3. Гандлёвыя сувязі.** Унутраны гандаль развіваўся паміж двума галоўнымі рэгіёнамі – паўночнымі княствамі (Наўгародскае, Полацкае, Смаленскае) і Кіеўскай зямлёй. Упершыню шлях "з варагаў у грэкі" быў асвоены паходамі Аскольда і Дзіра ў 862 – 865 гг. і Алега ў 882 г. Шлях "з варагаў у грэкі" склаўся не раней за X ст., з гэтага часу ён актыўна выкарыстоўваўся гандлярамі, дзяржаўнымі асобамі і вандроўнікамі. Эксперыментальная археалогія сведчыць, што шлях актыўна выкарыстоўваўся падчас веснавога павадка, калі караблі маглі прайсці з Балтыкі праз вусце Дзвіны альбо Волхава да Вярхоўяў Дняпра і праз сістэму волакаў з гэтых рэк па Дняпру трапіць да Чорнага мора. Адваротны шлях адбываўся ўзімку па лёдзе. Пры гэтым лакальна паміж асобнымі гарадамі існавалі штогадовыя гандлёвыя зносіны менавіта па асобных адрэзках водных і сухапутных шляхоў.

У гандлёвым абарачэнні выкарыстоўваліся не толькі вялікія рэкі, але і маленькія прытокі, якія злучалі басейны Чорнага і Балтыйскага мораў. Галоўны волак (месцы перавозу караблёў з грузамі) размяшчаўся каля Смаленска ў Гнёздаве, гэты волак злучаў Дняпро з рэкамі Заходняя Дзвіна і Ловаць. Накірункі гандлёвых шляхоў добра фіксуюцца па скарбах сярэбраных манет – куфіцкіх дырхамаў, іх найбольшае пашырэнне прыходзіцца на X ст. Знакаміты скарб куфіцкіх дырхамаў знойдзены каля в. Каз’янкі каля Полацка. Тут сабрана 7588 куфіцкіх дырхамаў агульнай вагой каля 20 кг.

Пра развіццё гандлю сведчаць таксама шматлікія гіркі-разнавагі, якія знойдзены ў культурных напластаваннях усходнеславянскіх гарадоў. Спачатку ў IX ст. рабіліся гіркі ў форме 14-гранніка, у далейшым выкарыстоўвалі дзежкападобныя разнавесы. Гандляры перавозілі гіркі разам з вагамі. Усё гэта захоўвалі ў спецыяльных скураных багата арнаментаваных скрынях [2, с. 502 – 503].

Найбольш вядомыя гандлёва-рамесныя пасяленні Русі – гэта Гнёздава на Дняпры, Цімірова і Пятроўскае на Волзе, Шаставіца на Дзясне. Гнёздава, Шаставіца і Цімірова размяшчаліся непадалёк ад буйных гарадоў і ўяўлялі з сябе добра ўмацаваныя заставы, якімі кіравалі кіеўскія князі. Тут збіраліся мытныя пошліны. У XI ст. смаленскія князі асвоілі больш выгодны шлях з Дняпра на Дзвіну і з гэтага часу значэнне Гнёздава стала згасаць [2, с. 496].

**7.4. Дружынныя курганы на Русі.** Непадалёк ад раннегарадскіх пасяленняў археолагі адкрылі могільнікі, якія атрымалі назву “дружынных курганаў”. Тут пахаваны не толькі прадстаўнікі класа прафесійных воінаў (дружыннікаў), але і гандляры. Гэтыя курганы адлюстроўваюць працэс фарміравання раннефеадальнай знаці, у якой дружыннікі адыгрывалі значную ролю [2, 496]. Самыя буйныя дружыныя курганы даследаваны каля Смаленска (Гнёздава) – 3000 насыпаў, Чарнігава, пад Яраслаўлем і Кіевам.

Нарманісты выкарыстоўваюць факт распаўсюджвання дружынных курганаў як доказ прызвання варагаў у IX ст. Аднак большасць рэчаў скандынаўскага паходжання фіксуецца менавіта з X ст. У курганах гэтага часу археолагі знаходзяць мячы, якія дасягалі ў даўжыню 1 м. Гэтыя мячы маюць назву “каралінгскія”, таму што былі зроблены ў Рэйнскай вобласці. Асноўная колькасць каралінгскіх мячоў была знойдзена ў Скандынавіі, Францыі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі і на землях усходніх славян. Ёсць адзінкавыя прыклады вырабу мячоў каралінгскага тыпу на Русі [2, с. 498].

Акрамя мячоў у дружынных курганах археолагі фіксуюць наканечнікі коп’яў ланцэтападобнай формы, наканечнікі стрэл, тыпова рускія шлемы-шышакі, якія маюць сфераканічную форму. У X ст. з’явілася кальчуга,

якая прадстаўляла сабой сплеценую са шматлікіх жалезных колцаў кашулю да кален з кароткімі рукавамі і засцежкай спераду. Грознай зброяй з’яўляліся сякеры з шырокім, сіметрычна разыходзячымся лязом [2, с. 499 – 500].



Воіны XII ст.



Баярын XII ст. са зброяносцам

Адрозненні паміж славянскім і скандынаўскім тыпамі зброі відавочныя. Апошні сустракаецца значна радзей. Такім чынам, станаўленне сярэднявечнай Русі стала чыннікам развіцця самой славянскай культуры. Пры гэтым адрозненні асобных этнасаў старажытных славян добра фіксуюцца па этнавызначальных знаходках, сярод якіх у першую чаргу варта назваць жаночыя ўпрыгожванні – скроневыя кольцы.



Воіны XIII ст.

У адным з гнёздаўскіх курганоў было знойдзена тарнае начынне – карчага, якая па форме нагадвала амфару. На паверхні начыння было прадрапана слова – "горушна" ("гарчыца"). Карчага датуецца X ст. Надпіс з'яўляецца надзейным сведчаннем існавання кірылічнага пісьменства ў славян у X ст. [2, с. 504].

**7.5. Распаўсюджванне пісьменства.** Пісьменства было шырока распаўсюджана на землях усходніх славян. Кірыліца, старажытная славянская азбука, узнікла ў IX ст. на аснове грэка-візантыйскага ўстаўнага пісьма. Стваральнікамі славянскай азбукі з'яўляюцца браты Кірыла (каля 827 – 869) і Мяфодзій (815 – 885). Найбольш старажытныя помнікі кірылічнага пісьменства – гэта надпісы на сценах і плітах IX – X стст. у Праславе (Балгарыя). Пра распаўсюджванне пісьменства на тэрыторыі Русі з X ст. сведчаць шматлікія знаходкі вырабаў з літарамі і надпісамі кірылічнага алфавіту. Падчас працы наўгародскай археалагічнай экспедыцыі з 1951 г. было знойдзена 953 берасцяныя граматы, у гарадах наўгародскай зямлі – яшчэ 59 [8, с. 16]. Берасцяныя граматы з'яўляюцца важным сведчаннем шырокага распаўсюджвання пісьменства сярод рамесна-гандлёвага люду, паколькі тэксты гэтых дакументаў прадстаўляюць сабой запісы пераважна пабытова-гаспадарчага характару. Акадэмік А. А. Залізняк зрабіў выснову, што чым больш старажытны тэкст грамат, тым больш у іх мясцовых дыялектных асаблівасцяў. Так, у наўгародскіх тэкстах XI – XII стст. выяўлена каля 30 адрозненняў ад паўднёварускага дыялекта, якія раней лічыўся адзінай старажытнарускай мовай [8, с. 16].



Цэра з Вялікага Ноўгарада. Раскопкі 2000 г.

Сенсацыйным з'яўляецца адкрыццё ў 2000 г. кнігі (цэры), якая была напісана на трох ліпавых навошчаных таблічках памерам 190×150×10 мм. Гэта своеасаблівая кніга была выяўлена ў Ноўгарадзе ў пласце першай чвэрці XI ст. Кніга з'яўляецца наўгародскім псалтырам, утрымлівае чатыры старонкі тэкста. На сённяшні дзень гэта самая старажытная славянская кніга (яе радыёкарбонная дата 860 – 1010 гг.). Да яе знаходкі самым старажытным лічылася Астрамірава евангелле 1054 – 1057 гг. [8, с. 20].

На тэрыторыі Беларусі знойдзены дзве берасцяныя граматы – у Віцебску і Мсціслаўлі. Відавочна, што на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўваўся іншы, акрамя бяросты, матэрыял для пісьма, магчыма, навошчаныя дошчачкі – цэры, ці нейкі іншы. У гарадах Беларусі XI – XIII стст. знойдзена вялікая колькасць вырабаў, якія ўтрымліваюць надпісы ці асобныя літары (пацеркі, кавалкі керамічнага посуду, касцяныя вырабы). Шмат надпісаў-графіці XII – XVI стст. захавалася на сценах Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст. у г. Полацку.

**7.6. Феадальна-ўласніцкія замкі.** На тэрыторыі Беларусі найбольш вывучанай катэгорыяй умацаваных паселішчаў негарадскога тыпу з'яўляюцца гарадзішчы – рэшткі феадальна-ўласніцкіх замкаў. Сярод іх вылучаецца Вішчынскае гарадзішча (замак). Вішчынскі замак (Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці) існаваў з сярэдзіны XII ст. да сярэдзіны XIII ст. Тут знойдзены шмат зброі, ювелірных вырабаў, у тым ліку знакаміты вішчынскі грашова-рэчавы скарб. Не выключана, што на замку была арганізавана мясцовая вытворчасць перагародкавых эмаляў – найскладанейшай ювелірнай тэхналогіі. Замак быў цесна звязаны з сельскагаспадарчай акругай, аб чым сведчыць шырокі спектр адпаведных вырабаў. Гарадзішча было добра ўмацавана. Па краю пляцоўкі (плошча 0,63 га) даследаваны рэшткі згарэлай сцяны, пабудаванай з гарызантальна пакладзеных бярвён, умацаваных кароткімі папярочнымі сценкамі. Тыльны бок сцяны абмазаны глінай [3, с. 126].

На базе ўмацаваных сельскіх паселішчаў (асабліва замкавага тыпу) узніклі шмат якія сярэдневяковыя гарады Беларусі (Ваўкавыск, Копысь, Лукомль, Рагачоў, Стрэшын і інш.). Аднак пераважная большасць такіх паселішчаў стала не гарадамі, а вёскамі [3, с. 133].



Інтэр’ер дома гараджаніна XVI ст.

**7.7. Гарады ўсходніх славян.** Усходнеславянскія гарады ўзнікалі ў найбольш эканамічна развітых рэгіёнах. Паводле П. П. Талочкі, вылучаюцца тры шляхі станаўлення гарадоў: 1) гандлёва-рамесны (спалучэнне гандлёвых і рамесных функцый горада як асноўнага чынніка яго станаўлення); 2) абшчынна-феадальны (утварэнне горада на аснове старажытнага абшчыннага цэнтра); 3) феадальны (дзяржаўны) (узнікненне гарадоў у выніку цэнтралізатарскай палітыкі князёў асобных земляў-княстваў, напрыклад, Полацкага, Наўгародскага, Кіеўскага і інш.). Да канца XII ст. на Русі існавала не менш 200 гарадоў. Забудова гарадоў даволі разнастайная. Як правіла, гарады мелі прывязку да сутокаў рэк, ад назвы якіх многія атрымалі свае назвы. Забудова ўсходнеславянскага горада пераважна драўляная. Дамы адрозніваліся па памерах і плошчы. Так, дамы знаці і заможных рамеснікаў мелі назву “харомы” і былі двухпавярховымі, з

акружнымі галерэямі, сенямі. Вуліцы масціліся дрэвам, мелі разгалінаваную дрэнажную сістэму. Сядзібы былі агароджаны драўлянымі платамі, падвор'і нярэдка масціліся дрэвам. Плошча сядзіб была рознай: ад 160 кв. м да 1600 кв. м. Горад быў акружаны развітой сістэмай гарадскіх умацаванняў. Добра ўмацаванай часткай быў дзяцінец, нярэдка – пасады. Муранымі ў сярэднявечным горадзе былі пераважна храмы і княжацкія церамы. У акрузе існавалі феадальныя сядзібы баяр, якія мелі сваі церамы і добра ўмацоўваліся. Нярэдка такія сядзібы пераўтвараліся ў замкі, а пазней – у гарады. У гарадах размяшчаліся двары князя, яго родзічаў і баяр, тут жа пражывала княжацкая дружына. Асноўную частку насельніцтва горада складалі рамеснікі. У XI – XII ст. на Русі існавала каля шасцідзесяці розных прафесій. Аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі найбольш поўна ілюструе ганчарства: у сярэдзіне X ст. адбываецца развіццё ганчарнай вытворчасці, з'яўляецца ганчарны круг, які паступова выцясняе ляпную вытворчасць посуду.



Заможны дом (харомы) XII – XIII стст.

Самым старажытным горадам Белрусі з’яўляецца Полацк (862 г.). Полацк быў заснаваны на першапачатковым гарадзішчы, якое знаходзіцца на аддаленні 800 м ад вусця Палаты. Гарадзішча было актыўна асвоена насельніцтвам днепра-дзвінскай культуры ў VII ст. да н. ч. – III ст. н. ч. Паводле летапісаў, у IX ст. на гарадзішчы быў заснаваны “град крывічоў”. У X ст. вакол гарадзішча склалася сістэма паселішчаў, якія ў XI ст. пераўтварыліся ў пасады. Першыя гістарычныя пасады Полацка – гэта Вялікі і Запалоцкі. Гарадзішча застаецца рэзідэнцыяй князя да пачатку XIV ст. У XI ст. пасады былі акружаны драўлянымі сценамі, у гэты час пры вусці Палаты ўзводзіцца Верхні замак, на якім будуецца Сафійскі сабор (каля 1044 – 1066 гг.). У XI ст. Сафійскі сабор, верагодна, з’яўляўся пяцікупальным, у XII ст. – сямікупальным. Верхні замак выконваў адміністрацыйна-цэрыманіяльныя мэты.



Воіны Полацкай зямлі X ст.

З канца XIII ст. развіццё гарадской тэрыторыі перайшло ад экстэнсіўнага (павелічэнне плошчы) да інтэнсіўнага (гаспадарчае добраўпарадкаванне ўжо асвоеных тэрыторый). Плошча Полацка складала каля 200 га. У Полацку квітнелі рамёствы, самымі значнымі з якіх былі кавальскае і ювелірнае. У горадзе пераважала драўляная грамадзянская забудова. У XII ст. адбываецца станаўленне і росквіт полацкай школы дойлідства. У гэты час

у розных частках горада ўзводзяцца не менш 10 мураваных храмаў, а таксама княжацкі церам на Верхнім замку.

Самым буйным усходнеславянскім горадам IX – XII стст. з'яўляўся Кіеў. Ядро старажытнага Кіева ўтварыла пасяленне VIII – X стст. на Андрэеўскай гары. Яно прадстаўляла сабой невялікі ўмацаваны замак з язычніцкім капішчам у выглядзе вялікага круглага, складзенага з неапрацаваных камянёў ахвярніка. Магчыма, ў цэнтры пляцоўкі размяшчаўся драўляны стод.

Старажытная крапасная сцяна вакол Андрэеўскай гары была зроблена з дрэва. Яраслаў Мудры пабудаваў новую гарадскую сцяну. Горад Яраслава ў некалькі разоў пераўзыходзіў горад Уладзіміра. Сцяна была зроблена з дубовых зрубаў, якія прымыкалі адзін да аднаго. Абарончыя валы Яраславава горада дасягалі ў шырыню 20 м. У X ст. на княжацкім двары была пабудавана грыдніца, якая прызначалася для княжацкіх прыёмаў і вялікіх сходаў [4, с. 387].



Святочны строй княжны ці баярыні



Цырыманіяльны княжацкі строй XII – XIII стст.

Першая на Русі цагляная Дзесяцінная царква была ўзведзена ў 989 – 996 гг. Найбольш яскравым помнікам архітэктуры Кіева з'яўляўся трынаццацікупальны Сафійскі сабор (1037). У часы княжання Яраслава ў Кіеве

былі зроблены вялікія каменныя вароты, якія па аналогіі з візантыйскімі атрымалі назву "Залатыя вароты". Жытлы гараджан у большасці выпадкаў прадстаўлялі сабой паўзямлянкі з глінабітнай печчу ў адным з кутоў. Кіеў быў цэнтрам шматлікіх рамёстваў, самыя вядомыя з якіх – кавальскае, керамічнае, дрэваапрацоўчае і ювелірнае [4, с. 388]. У 1240 г. Кіеў разбураны мангола-татарамі.



Жаночы касцюм і ўпрыгожванне X ст.

Ноўгарад з'яўляецца найбольш вывучаным ў археалагічным плане горадам. Наўгародская глеба спрыяе захаванню шматлікіх вырабаў з дрэва, скуры. Гэта тлумачыцца тым, што Ноўгарад размешчаны ў нізіне і глеба пад ім вельмі вільготная. Культурныя пласты надзейна датаваны метадам дэндрахраналогіі. Ноўгарад утварыўся шляхам зліцця асобных пасяленняў ("канцоў") на правым і левым берагах Волхава. У XI – XII стст. Ноўгарад становіцца адным з буйнейшых гарадоў сярэдневяковай Еўропы [4, с. 389].

Адметнасцю наўгародскіх грамадзянскіх пабудоў з'яўляецца адсутнасць паўзямлянак, якія шырока распаўсюджаны ў іншых гарадах. Людзі жылі ў наземных драўляных ізбах. Падлога высцілалася тоўстымі абцясанымі плахамі. Над ніжнім паверхам узводзіўся верхні паверх, які па плошчы пераўзыходзіў ніжні і часткова абапіраўся на вертыкальныя слупы. Дамы ацяпляліся цаглянымі печамі. Жылым з'яўлялася верхняе памяшканне, а ніжняе выкарыстоўвалася для гаспадарчых мэт. Там захоўвалі

ежу, інвентар, дробную рагатую жывёлу і птушак. Дамы былі багата аздоблены разьбой па дрэве [4, с. 389].

Драўляныя маставыя Ноўгарада будаваліся з Х ст. У горадзе вывучана каля 30 пластоў маставых Х – ХV стст. Найбольш яскравай каменнай пабудовай Ноўгарада з’яўляецца пяцікупальны Сафійскі сабор з вежай і дадатковым купалам над ёй (1045 – 1050 гг.). У цэнтры горада ўзведзены каменны крэмль, які ўключаў у сябе Сафійскі сабор і шэраг іншых каменных пабудоў. Каля крамля размяшчаўся торг, Яраслававa дворышча, вечавая плошча і дамы іншаземных і заможных наўгародскіх купцоў. З поўначы і поўдня горад акружалі манастыры: Юр’еў і Антоніеў [4, с. 390].



Адзенне князя і мітрапаліта
ХІІ – ХІІІ стст.

У вярхоўях Пцічы на рэчцы Менцы (за 16 км на паўднёвы-захад ад гістарычнага цэнтра сучаснага Мінска) размяшчаўся пачатковы Менск. Ён быў добра ўмацаваны і складаўся з вялікага і малога гарадзішча. Вялікае

гарадзішча выконвала ролю вакольнага горада памерамі 110×80 м. Гэты першы славянскі прагарадскі этап датуецца X – XI стст. Менск на Менцы выконваў функцыю адміністрацыйнага цэнтра воласці і магчыма менавіта гэтае пасяленне з'яўлялася летапісным Меньскам [7, с. 184 – 192].

Менск на Свіслачы быў перанесены з гарадзішча на Менцы дзесці ў сярэдзіне XI ст. і займаў плошчу каля 3 га. Дзяцінец Менска пабудаваны на невялікім узвышшы, што ўтваралася пры таянні дняпроўскага ледавіка. Па краю пляцоўкі быў пабудаваны абарончы вал шырынёй 15 м. Яго ўмацоўвала ў ніжняй частцы драўляная канструкцыя [7, с. 196].

Побач з дзяцінцам размяшчаўся пасад на правым і левым берагах Свіслачы. Агульная плошча пасада магла займаць 16 – 18 га.

Гарады Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі не былі закрануты мангола-татарскім нашэсцем, аднак ад мангола-татар пацярпелі многія буйнейшыя гарады Усходняй Еўропы, у тым ліку беларускія Гомель і Берасце. Археолагамі вывучаны сляды жудасных разбурэнняў мангола-татараў у Кіеве. У розных канцах горада былі знойдзены брацкія магілы, адна з якіх змяшчала каля 2 тыс. шкілетаў і з'яўляецца сведчаннем знішчэння мясцовых жыхароў мангола-татарамі. У 1240 г. у Кіеве былі спалены дамы, майстэрні і храмы, і паўсюль археолагі знаходзяць целы забітых людзей. Пад Дзесяціннай царквой быў знойдзены тайнік з целамі чатырох гараджан. З больш чым 40 манументальных пабудоў Кіева пасля 1240 г. захаваўся толькі 5 – 6, з 8 тыс. двароў – 200, і тыя адбудаваны паміж 1240 – 1246 гг. Аналагічная карціна разбурэнняў зафіксавана падчас раскопак Вышгарада, Белагарада, гарадзішч па рэкам Цецярэў, Случ, Гарынь, Паўднёвы Буг і інш. [6, с. 214 – 215].

## Літаратура

1. Авдусин, Д. А. Основы археологии: учеб. для вузов по спец. «История» / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

2. Гальперина, Г. А. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

3. Звяруга, Я. Г. Сельскія паселішчы // Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.) / Я. Г. Звяруга, Т. М. Каробушкіна, П. Ф. Лысенка, Г. В. Штыхаў; Навук. рэд. П. Ф. Лысенка. – Мінск : "Беларуская навука", 2000. – С. 110 – 132.

4. Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

5. Рафальский, О. Русь изначальная / О. Рафальский // Родина. 2007. № 6. – С. 90 – 92.

6. Толочко, П. П. Киев и Киевская земля в эпоху феодальной раздробленности XII – XIII вв. / П. П. Толочко. – Киев : «Наукова думка», 1980.

7. Штыхаў, Г. В. Гарады Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.) / Я. Г. Звяруга, Т. М. Каробушкіна, П. Ф. Лысенка, Г. В. Штыхаў; Навук. рэд. П. Ф. Лысенка. – Мн.: “Беларуская навука”, 2000. – С. 171–228.

8. Янин, В. Дары новгородской почвы / В. Янин // Родина. 2006. № 4. – С. 16 – 20.

## Кантрольныя пытанні

1. Пералічыце першыя гарады на тэрыторыі Русі паводле летапісу.
2. Дайце характарыстыку працэсу станаўлення пачатковага ядра Старажытнай Русі.
3. Дайце характарыстыку працэсу змянення планіровачнай структуры вёскі ў IX – XII стст.
4. Якія агракультуры вырошчваліся на Русі? Зрабіце характарыстыку жывёлагадоўлі.
5. Якія прылады апрацоўкі глебы былі пашыраны ў Старажытнай Русі?
6. Дайце характарыстыку курганных пахаванняў Русі.
7. Дайце характарыстыку гандлёвых сувязяў старажытнай Русі.
8. Растлумачце сутнасць тэрміну “дружынныя курганы”.
9. Вызначце этапы распаўсюджвання пісьменства на Русі.
10. Якую функцыю выконвалі феадальна-ўласніцкія замкі?
11. Назавіце асноўныя прыкметы ўсходнеславянскага горада.
12. Пералічыце тры шляхі станаўлення ўсходнеславянскага горада.
13. Дайце характарыстыку тапаграфічнай структуры Полацка.
14. Дайце характарыстыку тапаграфічнай структуры Кіева.
15. Дайце характарыстыку тапаграфічнай структуры Ноўгарада.
16. Дайце характарыстыку тапаграфічнай структуры Менска на Менцы і Менска на Свіслачы.
17. Якія гарады Беларусі найбольш пацярпелі ад нашэсця мангола-татараў?

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
## па выкананню заданняў на семінарскіх занятках

Семінар – гэта асаблівая форма групавых заняткаў па вучэбнай дысцыпліне, асноўнай характарыстыкай якой з'яўляецца абмеркаванне праблемных пытанняў курса пры самым актыўным удзеле студэнтаў. На семінары кожны студэнт павінен найбольш глыбока засяродзіцца на вывучэнні абмяркоўваемай праблемы, пазначыць галоўныя пытанні і знайсці на іх правільныя, навукова аргументаваныя і пацверджаныя гістарычнымі крыніцамі адказы.

Семінарскія заняткі прадстаўляюць студэнтам магчымасць праявіць свае веды па найбольш складаных тэмах вучэбнага курса.

Належная падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў – гэта шлях да паспяховага авалодання ведамі па курсу "Археалогія". Менавіта падчас правядзення семінараў студэнты набываюць навыкі публічных выступленняў перад аўдыторыяй, вядзення дыскусіі, доказу сваіх поглядаў па шэрагу гістарычных праблем.

Падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў прадугледжвае не толькі паглыбленае вывучэнне навуковых артыкулаў, манаграфій і калектыўных прац, але і знаёмства пры дапамозе выкладчыка з першакрыніцамі – помнікамі археалогіі: рухомымі і нерухомымі артэфактамі, якія захаваліся да нашых дзён і ў якіх адлюстраваны ступень развіцця і культура грамадства на пэўным этапе яго існавання.

Падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў неабходна пачынаць з работы над вучэбным і лекцыйным матэрыялам па дадзенай праблеме, пасля чаго перайсці да вывучэння навуковых артыкулаў, манаграфій і першакрыніц. Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў рэкамендуецца весці кароткі канспект па найбольш важных пытаннях тэмы; гэты план-канспект можна выкарыстоўваць падчас выступлення і дыскусіі ў аўдыторыі.

Важнай формай работы з'яўляецца анатаванне манаграфій. Гэтая форма індывідуальных заняткаў прадугледжвае самакантроль ступені засваення гістарычнай інфармацыі. Веды, уменні і навыкі, атрыманыя падчас занатавання навуковых манаграфій, будуць садзейнічаць напісанню курсавых і дыпломных работ па шэрагу актуальных праблем гісторыі Беларусі. Абавязковай формай кантроля падчас гэтай працы з'яўляецца прадстаўленне і абарона самастойна распрацаванага пашыранага плана-канспекта той ці іншай навуковай манаграфіі.

# ПРАКТЫКУМ

## ТЭМА 1. ПРАДМЕТ АРХЕАЛОГІІ
## (2 гадзіны)

**Пытанні**

1. Вызначэнне археалогіі і яе месца сярод гістарычных навук.
2. Культурны пласт і захаванасць археалагічных помнікаў.
3. Стратыграфія. Паняцце адкрытага і закрытага комплексаў.
4. Заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў.

**Літаратура**

Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. “История” / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Грыцкевіч, В. Крыніцы гістарычныя / В. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Мінск : БелЭн, 1997. – С. 277 – 288.

Ісаенка, У. Ф. Стратыграфія / У. Ф. Ісаенка // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 590.

Калядзінскі, Л. У. Культурны пласт / Л. У. Калядзінскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 356.

Левко, О. Н. Практическая археология: учеб. пособие / О. Н. Левко. – Могилёв : МГУ им А.А. Кулешова, 2006.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Мартынов, А. И. Методы археологического исследования: учеб. Пособие / А. И. Мартынов, Я. А. Шер. – М. : Высш. шк., 2002.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.

Побаль, Л. Д. Археалагіная разведка / Л. Д. Побаль // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 49.

Фэйган, Б. Уводзіны ў археалогію / пер. з англ. В. Міранчык, А. Сташкевіч; Пад навук. рэд. С. Тарасава. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 272 с.

**Тэмы рэфератаў**

1. Вядомыя археолагі: Генрых Шліман і яго адкрыцці.
2. Вядомыя археолагі: Артур Эванс і яго адкрыцці.
3. Старажытныя Геркуланум і Пампей: гісторыя археалагічнага вывучэння.
4. Знакамітыя археалагічныя адкрыцці XX – XXI стст.

## ТЭМА 2. МЕТАДЫ АРХЕАЛОГІІ
## (2 гадзіны)

**Пытанні**

1. Археалагічныя разведкі.
2. Археалагічныя раскопкі стаянак каменнага веку.
3. Раскопкі пасяленняў бронзавага веку.
4. Раскопкі паселішчаў і гарадзішчаў жалезнага веку.
5. Археалагічныя раскопкі сярэдневяковага горада.
6. Метады археалагічных раскопак могільнікаў.

**Літаратура**

Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. “История” / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Ісаенка, У. Ф. Раскопкі археалагічныя / У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 535 – 536.

Керам, К. Боги. Гробницы. Учёные: пер. с нем. / К. Керам. – СПб, Нижний Новгород : изд-во “КЭМ”, 1994.

Левко, О. Н. Практическая археология: учеб. пособие / О. Н. Левко. – Могилёв : МГУ им А.А. Кулешова, 2006.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Мартынов, А. И. Методы археологического исследования: учеб. Пособие / А. И. Мартынов, Я. А. Шер. – М. : Высш. шк., 2002.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

Молони, Н. Археология / Н. Молони. – М., 1996.

Побаль, Л.Д. Археалагічная разведка / Л. Д. Побаль // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 49.

Фэйган, Б. Уводзіны ў археалогію / пер. з англ. В. Міронсчык, А. Сташкевіч; Пад навук. рэд. С. Тарасава. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 272 с.

## ТЭМА 3. КАМЕННЫ ВЕК
## (4 гадзіны)

**Пытанні**

1. Тыпы прылад працы каменнага веку. Галечныя прылады. Ручное рубіла і калун. Тэхніка левалуа.
2. Тыпы мусцьерскіх прылад. Нуклеусы. Аджымная і контрударная рэтуш. Першая складовая прылада. Касцяныя прылады.
3. З’яўленне мікралітаў у складовых прыладах. Шліфаванне, свідраванне, пілаванне каменя.
4. З’яўленне керамікі. Тэхніка ручной лепкі керамічнага посуду. Арнаментацыя посуду.
5. З’яўленне ткацтва. Рэканструяванне кроснаў.
6. Мастацтва каменнага веку.

**Літаратура:**

Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. “История” / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Алексеев, В. П., Першиц А. И. История первобытного общества: учеб. по спец. «История» / В. П. Алексеев, А. И. Першиц. – М. : Высш. шк., 1999.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Гальперина, Г. А., Доброва Е.В. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

Заря человечества / пер. с англ. В. Федяниной. – М. : ТЕРРА-Книжный клуб, 1998. – (Энциклопедия «Всеобщая иллюстрированная история»).

Красковский, В. И. Древнее орудия труда. Замысел и воплощение / науч. ред. В. Ф. Исаенко. – Минск : Университетское, 1989.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.

Чарняўскі, М. М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд / М.М. Чарняўскі. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2003.

Фэйган, Б. Уводзіны ў археалогію / пер. з англ. В. Міронча, А. Сташкевіч; Пад навук. рэд. С. Тарасава. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 272 с.

**Тэмы рэфератаў**

1. Эвалюцыя каменных прылад у эпоху ашэль.
2. Эвалюцыя каменных і касцяных прылад мусцьерскай эпохі.
3. Эвалюцыя каменных і касцяных прылад верхняга палеаліта.
4. З'яўленне і шляхі распаўсюджвання мікралітычных тэхнік.
5. Керамічная вытворчасць у каменным веку: генезіс і эвалюцыя.
6. Мастацтва каменнага веку.
7. Рэканструкцыя тыпаў адзення і тэхналогій ткацтва каменнага веку.

## ТЭМА 4. БРОНЗАВЫ ВЕК
## (4 гадзіны)

**Пытанні**

1. Этапы развіцця каляровай металургіі. Тэхніка бронзаліцейнай справы і найстаражытнейшыя вырабы з металу.
2. Паняцце энеаліта.
3. Гаспадарка бронзавага веку.
4. Пытанне аб індаеурапейскай прарадзігме. Міграцыі індаеўрапейцаў па археалагічных даных.
5. Агульныя і адметныя рысы археалагічных культур Закаўказзя, Сярэдняй Азіі, лясной зоны Еўропы.
6. Крыта-мінойская цывілізацыя.
7. Мастацтва бронзавага веку.

**Літаратура**

Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. "История" / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Гальперина, Г. А., Доброва Е.В. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

Керам, К. Боги. Гробницы. Учёные / К. Керам. – М. : «Наука», 1986.

Крывальцэвіч, М. Археалягічныя адкрыцьці сьвету / М. Крывальцэвіч. – Мінск : Atheneum, 2000.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 1: Каменный век / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1973.

Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 2: Бронзовый и железный века / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1974.

Чарняўскі, М. М. Бронзавы век / М. М.Чарняўскі, М. М. Крывальцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 97.

**Тэмы рэфератаў**

1. Праблема паходжання індаеўрапейцаў.
2. Асноўныя цэнтры металургічнай вытворчасці бронзавага веку.
3. Мастацтва бронзавага веку.
4. Бронзавы век лясной зоны і паўднёва-еўрапейскага рэгіёну: параўнаўчая характарыстыка.

## ТЭМА 5. ЖАЛЕЗНЫ ВЕК
## (2 гадзіны)

**Пытанні**

1. Сырадутны працэс атрымання жалеза. Уплыў адкрыцця жалеза на працэс грамадскага развіцця. Распаўсюджанне гарадзішчаў.

2. Адкрыцці Г. Шлімана. Археалогія гамэраўскай эпохі.

3. Асноўныя прыкметы кімерыйцаў па археалагічных даных.

4. Асноўныя прыкметы скіфаў па археалагічных даных.

5. Асноўныя прыкметы сарматаў па археалагічных даных.

**Літаратура**


Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. “История” / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 2: Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А. А. Егарэйчанка і інш.; пад рэд. В. І. Шадыры, В. С. Вяргей. – Мінск : “Беларуская навука”, 1999.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Всемирная история. В 10 томах / гл. ред. Е. М. Жуков. Т. 2. – М. : Государственное издание политической литературы, 1957.

Гальперина, Г. А., Доброва Е.В. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

Граков, Б. Н. Ранний железный век (культуры Западной и Юго-Восточной Европы) / Б. Граков. – М. : Изд-во Московского университета, 1977.

Керам, К. Боги. Гробницы. Учёные / К. Керам. – М. : «Наука», 1986.

Максаковский, В. П. Историческая география мира: учебное пособие для вузов / В. П. Максаковский. – М. : Экопрос, 1997.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 2: Бронзовый и железный века / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1974.


**Тэмы рэфератаў**

1. Археалогія скіфаў.
2. Археалагічныя культуры лясной зоны Еўропы ў жалезным веку.
3. Археалагічныя культуры стэпавай зоны Еўропы ў жалезным веку.
4. Археалогія Старажытнага Рыма.
5. Шляхі зносін і міжнародны абмен у эпоху жалезнага веку.

## ТЭМА 6. ПАХОДЖАННЕ СЛАВЯН
## (2 гадзіны)

### Пытанні

1. Праблема месцазнаходжання прарадзімы славян.
2. Характэрныя рысы першых славянскіх культур. Пражская культура.
3. Этнавызначальныя рысы славянскай керамікі. Шляхі рассялення славян па археалагічных даных.

### Літаратура

Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. “История” / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 2: Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А. А. Егарэйчанка і інш.; пад рэд. В. І. Шадыры, В. С. Вяргей. – Мінск : “Беларуская навука”, 1999.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Вяргей, В. Раннеславянскае паселішча Петрыкаў-2 на р. Прыпяць / В. Вяргей, В. Трымер // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2003. – № 18. – С. 151 – 187.

Гальперина, Г. А., Доброва Е.В. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.

Монгайт, А. Л. Археология Западной Европы. Ч. 2: Бронзовый и железный века / А. Л. Монгайт. – М. : Наука, 1974.

Сядоў, В. В. Славяне / В. В. Сядоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 567 – 574.

### Тэмы рэфератаў

1. Праблема месцазнаходжання прарадзімы славян.
2. Матэрыяльная культура ранніх славян (VI–VIII стст.).

## ТЭМА 7. АРХЕАЛОГІЯ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ
## (2 гадзіны)

### Пытанні

1. Планіроўка і забудова сярэднявечных гарадоў Русі. Фартыфікацыйныя збудаванні.
2. Матэрыяльная культура старажытнарускага горада. Рамёствы.
3. Вікінгі, нарманы, варагі на Русі.
4. Гнёздаўскі археалагічны комплекс.

### Літаратура


Авдусин, Д. А. Основы археологии. Учеб. для вузов по спец. “История” / Д. А. Авдусин. – М. : Высш. шк., 1989.

Брей, У., Трамп Д. Археологический словарь: пер. с англ. / У. Брей, Д. Трамп. – М. : Прогресс, 1990.

Гальперина, Г. А., Доброва Е.В. Популярная история археологии / Г. А. Гальперина, Е. В. Доброва. – М. : Вече, 2002.

Мартынов, А. И. Археология: учебник / А. И. Мартынов. – М. : Высш. шк., 1996.

Матюшин, Г. Н. Археологический словарь / Г. Н. Матюшин. – М. : Просвещение: АО «Учеб. лит.», 1996.


### Тэмы рэфератаў

1. Сярэднявечны Ноўгарад паводле археалагічных даных.
2. Сярэднявечны Кіеў паводле археалагічных даных.
3. Вікінгі, нарманы, варагі на Русі.
4. Рамёствы ўсходнеславянскага горада XI – XIII стст.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

### А

***Абсідыян*** – вулканічнае шкло, горная парода пераважна чорнага, чырвонага, карычневага і шэрага колераў.

***Айкумена*** (ад гр. *oikeo* – насяляю) – заселеная чалавекам частка зямнога шара.

***Амфара*** – керамічнае начынне для захоўвання запасаў ежы, звычайна вялікага памеру, з шырокім тулавам і вузкім рыльцам.

***Анамастыка*** – раздзел мовазнаўства, які займаецца вывучэннем асабістых імёнаў.

***Ангоб*** – тонкі пласт высокаякаснай гліны на кераміцы.

***Антрапаген*** – апошні перыяд геалагічнай гісторыі, час існавання чалавека.

***Антрапаморфны*** (ад гр. *anthropos* – чалавек і *morphe* – форма) – чалавекападобны.

***Артэфакт*** (ад лац. *artefactum* – штучна зроблены) – кожны прадмет не прыроднага, а штучнага паходжання.

***Архантрап*** (ад гр. *archaios* – старажытны і *anthropos* – чалавек) – старажытнейшы чалавек.

***Археалогія*** – вывучэнне мінулага на падставе матэрыяльных рэшткаў жыццядзейнасці чалавека.

***Архітэктура*** – мастацтва праектаваць і узводзіць будынкі, збудаванні і іх комплексы.

***Арыйцы*** – плямёны, якія трапілі ў Іран і Індыю напрыканцы ІІ тыс. да н. ч. і размаўлялі на мове, якая з’яўлялася ранняй формай санскрыта, самай усходняй індаеўрапейскай мовы.

***Аўтахтон*** (ад грэч. Autochthon) – мясцовы, карэнны, супрацьпастаўленне аллахтону.

***Аўстралапітэкі*** (ад лац. *australis* – паўднёвы *і* гр. *pithekos* – малпа) – падсям’я сям’і чалавечых (*гамінід* – (гл.)), старажытнейшы і найбольш прымітыўны від чалавека.

### Б

***Балты –*** народнасць, якая ўпершыню апісана ў VI ст. гоцкім гісторыкам Іарданам.

***Броўка*** – паласа некранутай зямлі паміж квадратамі ці больш значнымі часткамі раскопа, пакінутая для таго, каб больш дакладна вызначыць стратыграфію раскопа.

## Г

***Галацэн*** – апошні этап геалагічнага мінулага, сучасная геалагічная эпоха.

***Галечныя прылады*** – старажытнейшыя прылады чалавека, зробленыя з галькі, з’явіліся каля 2,6 млн. г.

***Гамініды*** (ад лац. *homo* – чалавек) – падсям’я ці, па другой класіфікацыі, сям’я людзей.

***Гарпун*** – у археалогіі наканечнікі з косці ці рога, якія прывязваюцца да драўлянага дзяржання.

***Глінабітны*** – збудаванні, пабудаваныя з гліны і гразі, шырока распаўсюджаныя на Блізкім Усходзе ў неаліце.

***Гомо сапіенс неандартальскі*** (лац. *homo sapiens neandartalensis*) – чалавек разумны неандартальскі.

***Гомо сапіенс сапіенс*** (лац. *homo sapiens sapiens*) – чалавек двойчы разумны, у археалогіі – краманьёнец.

***Гомо хабіліс*** (лац. *homo habilis*) – чалавек умелы.

***Гомо эрэктус*** (лац. *homo erectus* ) – чалавек выпрамлены, прамаходзячы.

## Д

***Даместыкацыя*** (ад лац. *domesticus* – дамашні) – адамашненне раслін і жывёл.

***Дыфузія*** – рспаўсюджванне культурных прыкмет за межы цэнтра яго ўзнікнення за кошт міграцый ці абмену.

## Ж

***Жвір*** – рэшткавая парода, якая складаецца з кавалкаў каменю меней 1 см у дыяметры.

## З

***Зачыстка*** – зразанне вострымі рыдлёўкамі ці нажамі тонкіх пластоў зямлі для высвятлення зменаў колеру пласта і выяўлення рэшткаў жытлаў, ям, магілак, вогнішчаў і г. д.

***Земляробства*** – апрацоўка зямлі з мэтай атрымання прадуктаў харчавання.

***Зернацёрка*** – камень для расцірання зерня.

***Зруб*** – ў драўляным дойлідстве канструкцыя з бярвенняў, пакладзеных гарызантальна і шчыльна дапасаваных адно з другім пры дапамозе сякеры і пілы.

## І

***Ідэаграфія*** (ад гр. *idea* – ідэя і *grapho* – пішу) – пісьменнасць, знакі якой (ідэаграмы, ці *іерогліфы* – (гл.) перадаюць цэлыя словы-паняцці. Сінонім – лагаграфія.

***Іерогліфы*** (ад гр. *hieros* – свяшчэнны і *glipho* – вырэзваю, г. зн. выразаны на камені свяшчэнны знак) – назва, якую грэкі далі егіпецкай *ідэаграфіі* (гл.).

***Інгумацыя*** – пахаванне нябожчыка у супрацьвагу крэмацыі і пакідання цела на паверхні зямлі.

***Індустрыя*** – у археалогіі сукупнасць звязаных тыпаў артэфактаў, якія выкананы з аднаго матэрыяла ці з аднаго рэчыва.

## К

***Канібалізм*** – людаедства, якое магло выкарыстоўвацца ў магічных мэтах і дзеля харчавання.

***Кап'еметалка*** – прыстасаванне для кідання кап'я, якое складаецца з дошчачкі ці палкі з крукам на канцы, якое павялічвае даўжыню рычага пры кіданні кап'я.

***Катакомба*** – падземныя могілкі, зробленыя ў скальнай пародзе ці цвёрдай глебе.

***Кераміка*** – абпалены гліняны выраб, звычайна посуд.

***Крыца*** – шлакападобны прадукт плаўлення жалезнай руды, пасля коўкі становіцца паўнавартасным жалезам.

***Крэмацыя*** – трупаспаленне.

***Крэмень*** – кварц з асобай мікраструктурай, цвёрды камень, які лёгка расшчапляецца на кавалкі пласцін ці адшчэпаў.

## Л

***Летапіс*** – запіс важнейшых падзей па гадах.

## М

***Малахіт*** – карбанат медзі зялёнага колеру, у старажытнасці выкарыстоўваўся як камень для упрыгожвання ці матэрыял для атрымання

***Мамант*** – вымершае млекакормячае сямейства сланоў, пражываў на тэрыторыі Еўропы, Паўночнай Азіі і Паўночнай Амерыкі ў ледавіковы перыяд.

***Мамантавая фаўна*** – мамант, аўцэбык, пячорны мядзведзь, алень, шарсцісты насарог і іншыя жывёлы, якія жылі ў эпоху позняга зледзянення (плейстацэна).

***Матрыярхат*** (ад лац. *mater* – маці і гр. *arche* – улада) – панаванне жанчыны ў сям'і і грамадстве, тое ж, што і гінекакратыя ці мацярынскае права.

***Мацярык*** – у археалогіі пласт зямлі і іншых парод, які залягае пад культурным пластом.

***Міграцыі*** – перамяшчэнне груп насельніцтва на вялікія адлегласці.

***Музей*** – установа, якая займаецца збіраннем, захоўваннем і экспанаваннем рэчаў.

## Н

***Неаантрап*** (ад гр. *neos* – новы і *anthropos* – чалавек) – чалавек сучаснага віду.

***Ніверліраванне*** – фіксацыя глыбіны залягання знаходак на раскопках ад умоўнага нуля з дапамогай прыстасаванняў нівеліра ці тэадаліта.

## П

***Паганства*** – агульная назва рэлігійных вераванняў і рэлігій дамонатэістычнага характара, тое ж што і язычніцтва.

***Палеаантрап*** (ад гр. *palaios* – старажытны і *anthropos* – чалавек) – старажытны чалавек.

***Патрыярхат*** (ад лац. *pater* – бацька і гр. *arche* – улада) – панаванне мужчыны ў сям'і і грамадстве, тое ж, што і бацькоўскае права.

***Пахаванне*** – размяшчэнне цела нябожчыка ці яго рэшткаў у зямлю.

***Петрогліф*** (ад гр. *petra* – камень, скала і *glyphe* – вырэзваю) – высечанае на скале слаба ўглубленае адлюстраванне.

**Піктаграфія** (ад лац. *pictus* – намаляваны і гр. *grapho* – пішу) – прымітыўнае маляванае пісьмо, прызначанае галоўным чынам для запамінання.

***Плейстацэн*** – эпоха зледзяненняў, якая папярэднічае сучаснай геалагічнай эпосе галацэну.

***Помнік археалагічны*** – асобнае спалучэнне артэфактаў ці збудаванняў з адкладамі.

***Прагісторыя*** (ад лац. *prae* – да і гр. *historia* – гісторыя) – дагісторыя, прынятае ў заходніх аўтараў абазначэнне гісторыі першабытнага грамадства, часта ў адрозненне ад *протагісторыі* (гл.).

***Праселка*** – круглы махавік з гліны, косці ці каменю для прадзення, замацоўваўся на верацяне.

***Протагісторыя*** (ад гр. *protos* – прасцейшы, першы і *historia* – гісторыя) перадгісторыя, прынятае ў заходніх аўтараў абазначэнне тых першабытных грамадстваў, якія могуць даследавацца па пісьменных помніках суседніх цывілізацый.

## Р

***Рэтуш*** – падпраўка рабочага краю ці ўсёй паверхні каменных прылад шляхам аддзялення дробных лустак ад паверхні каменю пры дапамозе націскання ці лёгкіх удараў па нарыхтоўцы прылады.

## С

***Свастыка*** – крыж, прамяні якога сагнуты пад прамым вуглом у адным накірунку, адзін з найбольш распаўсюджаных сімвалаў сонца (агню).

## Т

***Тапаніміка*** (ад гр. *topos* – месца і *onoma* – імя) – раздзел *анамастыкі* (гл.), які вывучае геаграфічныя назвы.

***Тэрасы рачныя*** – ступені рэльефа ўздоўж берагоў рэк, пакінутыя даўнім руслам ракі.

***Тэль*** – штучны пагорак, утвораны на месцы працяглага пражывання неалітычнага насельніцтва з дамамі, зробленых з цэглы-сырца. Тэрмін “тэль” мае арабскае паходжанне, сінанімічныя значэнні вядомы ў персідскай і турэцкай мовах: “тэпе” і “хююк”.

Дадатак 1

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ
АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

**Дзяржаўная навуковая ўстанова**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**

220072 г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1
тэл./факс (017) 284-18-70

НАЦИОНАЛЬНАЯ
АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ

**Государственное научное учреждение**
**ИНСТИТУТ ИСТОРИИ**

220072 г. Минск, ул. Академическая, 1
тел./факс (017) 284-18-70

---

23.01.07 № 02-01/70 Форма № **4**

ДАЗВОЛ № ***1757***
Сапраўдны да 31 снежня 2007 г.

Выданы ДНУ «Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі»
**Дуку Дзянісу Уладзіміравічу** , загадчыку кафедры айчыннай і
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
ўсеагульнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага універсітэту
(пасада, установа)

Спадару (спадарыні) **Дуку Д.У.** дазволена праводзіць археалагічныя абследаванні, разведкі на торыторыі: ____

раскопкі на помніках: выратавальныя археалагічныя даследаванні ў ахоўнай зоне «Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка» у г. Полацке

у дзве тысячы *семым* годзе.
(прапісным)

Ён (яна) упаўнаважаны праводзіць тапаграфічную здымку планаў, фатаграфаванне, замалёўкі гісторыка-культурных каштоўнасцей (стаянак, селішчаў, гарадзішчаў, курганоў, могільнікаў), прымаць меры па ахове помнікаў. ***Усім органам улады, дзяржаўным установам, грамадскім арганізацыям ды прыватным асобам належыць усяляк садзейнічаць*** **Дуку Д.У.** ***у выкананні ўскладзеных на яго (яе) абавязкаў.***

ПАДСТАВА: «Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195); «Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ» (Пастанова СМ РБ ад 22 мая 2002 г. № 651).

Адказнай за захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці (усіх яе адметных вартасцей) у працэсе работ, а таксама здабытых археалагічных матэрыялаў і адпаведнасць даследаванняў навукова-метадычным патрабаванням з'яўляецца асоба, атрымаўшая «Дазвол».

Передача ўказаных вышэй правоў іншай асобе забараняецца. Дазвол сапраўдны толькі пры адначасовым прад'яўленні пашпарта ці іншага дакумента органам улады на месцы правядзення работ.

Дырэктар Інстытута гісторыі
Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі — *Каваленя А. А.*

Кіраўнік Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага
грамадства (загадчык аддзела) — *Ляўко В. М.*

Старшыня Палявога камітэта — *Лысенка П.Ф.*

Дазвол зарэгістраваны ва Ўпраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (рэгістрацыйны № 1793)

(подпіс)

Узор Дазвола па форме № 4

Дадатак 2

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Бюро Прэзідыума
Нацыянальнай акадэміі навук
Беларусі
12.05.2006 № 246

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку выдачы Дазволаў на
выкананне археалагічных разведак
і раскопак, іх правядзенні,
састаўленні справаздач па
праведзеным работам

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзеная інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны", Палажэннем аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ ад 22 мая 2002 г. № 651.

1.2. Інструкцыя вызначае парадак выдачы Дазволаў на выкананне археалагічных разведак і раскопак (далей – Дазволы), парадак іх правядзення і парадак падрыхтоўкі справаздачы аб іх выкананні.

1.3. У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" усе археалагічныя помнікі – гарадзішчы, курганы, рэшткі старажытных паселішчаў, умацаванняў, свяцілішчы, старажытныя месцы пахаванняў, каменныя выявы (валуны, крыжы і т.д.), старажытныя прадметы, участкі гістарычнага культурнага слою старажытных населеных пунктаў, рэшткі архітэктуры – складаюць гісторыка-культурную спадчыну Беларусі і з'яўляюцца ўсенародным багаццем. Яны знаходзяцца пад ахавай дзяржавы.

1.4. Згодна з палажэннем аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ размяшчэнне археалагічных аб'ектаў фіксуецца ў кожйым раёне краіны на раённых картах землекарыстання. Інфармацыя, якая атрымана у ходзе правядзення работ па Дазволу ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", прадстаўляецца навуковымі арганізацыямі археалагічнага профілю (у тым ліку кафедрамі археалогіі вышэйшых навучальных устаноў) і музеямі, размешчанымі на тэрыторыі раёна. Дадзеная інфармацыя ўключае ў сябе ілюстраваныя і тэкставыя матэрыялы, якія распрацоўваюцца на аснове сучасных картаграфічных матэрыялаў, візіруюцца ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" і Упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, пасля чаго зацвярджаюцца дзяржаўнымі органамі землекарыстання.

1.5. Палявыя даследаванні археалагічных помнікаў (разведкі ці раскопкі) могуць выконвацца толькі ў навуковых, ахоўных і ўліковых мэтах спецыялізаванымі навуковымі і навукова-рэстаўрацыйнымі ўстановамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і музеямі, якія маюць кафедры археалогіі ці спецыялістаў-археолагаў.

1.6. Кіраўніцтва палявымі даследаваннямі можа выконвацца толькі спецыяльна падрыхтаванымі асобамі, якія маюць адпаведны Сертыфікат і могуць забяспечыць выкананне ўсіх неабходных методык, што можа гарантаваць высокі навуковы ўзровень даследаванняў і фіксацыі іх вынікаў у форме навуковай справаздачы.

1.7. Правядзенне разведак і раскопак помнікаў археалогіі можа праводзіцца толькі пры наяўнасці ў даследчыка дакумента – Дазволу на правядзенне разведак і раскопак, і ў межах, вызначаных формай гэтага дакумента.

1.8. Самавольныя раскопкі археалагічных помнікаў без Дазволу, разглядаюцца як знішчэнне ці псаванне помнікаў гісторыі і культуры. Абвінавачаныя ў гэтым асобы, а таксама кіраўнікі ўстаноў і арганізацый (дзяржаўных, кааператыўных ці прыватных) падлягаюць прыцягненню да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці па дзеячаму заканадаўству.

## 2. ДАЗВОЛЫ НА ПРАВЯДЗЕННЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ, ІХ ФОРМЫ І ПАРАДАК ВЫДАЧЫ

2.1. Дазволы на права выканання археалагічных разведак і раскопак на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь выдаюцца ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" па даручэнню Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і рэгістрыруюцца Упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

2.2. Дазволы ў залежнасці ад характару даследаванняў маюць чатыры формы:

Форма № 1 – на права выканання раскопак і разведак.

Форма № 2 – на права выканання разведак з абмежаваным ускрыццём невялікіх участкаў паселішчаў і грунтовых могільнікаў (да 24 кв. м на помніку).

Форма № 3 – на права правядзення разведак без якіх-небудзь земляных работ.

Форма № 4 – на права ахоўных даследаванняў (назіранне і тэрміновыя раскопкі) помнікаў, якія знаходзяцца ў аварыйным стане ці ў зоне будаўнічых работ.

Дазволы па формах 1 і 4 выдаюцца на раскопкі канкрэтных помнікаў археалогіі, Дазволы на разведкі – з указанием адміністрацыйных раёнаў.

2.3. Дазволы выдаюцца па заяўках дзяржаўных ўстаноў і арганізацый, якія праводзяць археалагічныя раскопкі, на імя даследчыка. Установа, якая патрабуе Дазвол, нясе адказнасць за якасць выканання работ, своечасовае прадстаўленне, паўнату і якасць справаздачы аб даследаваннях, а таксама захаванне здабытых матэрыялаў да перадачы іх на пастаяннае захоўванне ў адпаведным Закону парадку.

2.4. Заяўка на выдачу Дазволу паступае ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" не пазней, чым за два тыдні да пачатку работ. Выключэнні могуць быць толькі ў выпадку неабходнасці тэрміновага вывучэння помнікаў, якія разбураюцца ці трапляюць у зону неўзгодненага будаўніцтва.

2.5. У заяўцы на выдачу Дазволу трэба ўказаць:

2.5.1. прозвішча, імя і імя па бацьку, службовае становішча і навуковую ступень выканаўцы археалагічных работ;

2.5.2. форму Дазволу;

2.5.3. пералік помнікаў, на якіх павінны быць праведзены раскопкі, і раёнаў, дзе будуць праводзіцца разведкі, згодна з сучасным адміністрацыйным падзелам;

2.5.4. магчымы характар разведак (суцэльнае абследаванне раёну, пошук помнікаў якой-небудзь катэгорыі і т.д.), тэрмін прац;

2.5.5. абгрунтаванне неабходнасці правядзення работ (вырашэння канкрэтнай навуковай праблемы, складанне археалагічнай карты, улік і пашпартызацыя помнікаў, выратаванне аб'ектаў, што разбураюцца і т.д.);

2.5.6. аб'ём работ, іх сувязь з раней праведзенымі раскопкамі;

2.5.7. крыніцы фінансавання;

2.5.8. установы, куды будуць здадзены археалагічныя матэрыялы на тэрміновае і пастаяннае захаванне;

2.5.9. да заяўкі на Дазвол па форме № 4 трэба прыкласці даведку з характарыстыкай стану помніка, які разбураецца, з указаннем прычын, ступені і інтэнсіўнасці яго разбурэння, альбо дакументацыю па ўзгадненню мяркуемага будаўніцтва, ці дагаворную дакументацыю, якая пацвярджае неабходнасць працягу археалагічных прац на аб'екце;

2.5.10. да заяўкі на археалагічнае даследаванне помнікаў архітэктуры, а таксама на тэрыторыі іх зон аховы патрэбна дадаць Дазвол Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з інфармацыяй аб тым, што археалагічныя працы на помніку скаардынаваны з архітэктурна-рэстаўрацыйнымі работамі (указваецца таксама навуковы кіраўнік рэстаўрацыйных работ).

2.6. Калі Дазвол патрабуецца на імя даследчыка, які ўпершыню самастойна праводзіць палявыя работы, то да заяўкі на Дазвол патрэбна прыкласці рэкамендацыю археолага-прафесіянала, пад кіраўніцтвам якога ён ўдзельнічаў ў археалагічных даследаваннях не менш, чым два палявых сезоны. Спецыяліст, які даў рэкамендацыю, павінен адзначыць у ёй узровень практычнай падрыхтоўкі і валоданне метадамі сучаснай палявой археалогіі асобы, за якую ён нясе адказнасць.

2.7. Для каардынацыі археалагічных работ на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, разгляду заявак на выдачу Дазволаў, правядзення экспертызы навуковых справаздач і т.д., загадам дырэктара ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" з ліку высокакваліфікаваных спецыялістаў-археолагаў ствараецца Палявы камітэт, паўнамоцтвы якога зацвярджаюцца Палажэннем аб Палявым камітэце.

2.8. ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" разглядае заяўку на выдачу Дазволу ў двухтыднёвы тэрмін. Ён можа выдаць Дазвол у адпаведнасці з заяўкай, або з абмежаваным аб'ёмам работы ў параўнанні з заяўленым, ці нават адмовіць у выдачы Дазволу.

2.9. Падставамі для абмежавання ці адмовы ў выдачы Дазволу могуць быць:

2.9.1. немэтазгоднасць работ з пункту гледжання задач археалагічных даследаванняў ці аховы археалагічных помнікаў;

2.9.2. неапраўдана вялікі аб'ем заяўленых палявых работ, што можа адмоўна адбіцца на іх якасці;

2.9.3. недастатковая археалагічная кваліфікацыя асобы, на імя якой запатрабаваны Дазвол;

2.9.4. выдача Дазволу на той жа помнік ці раён (калі супадае тэматыка даследаванняў) другой асобе;

2.9.5. выкарыстанне даследчыкам, на імя якога патрабуюць Дазвол, метадаў, што не адпавядаюць сучасным патрабаванням выканання палявых работ (вядуць да страты часткі навуковай інфармацыі і псавання помнікаў);

2.9.6 незабяспечанасць уліку і тэрміновага захавання здабытых матэрыялаў;

2.9.7. перавышэнне аб'ёмаў работ, якія былі абумоўлены папярэднім Дазволам і правядзенне работ на помніках ці ў раёнах, якія не былі ўказаны ў Дазволе і да т.п.;

2.9.8. непрадстаўленне ці дрэнная якасць справаздачы па папярэдняму Дазволу;

2.9.9. непрадстаўленне акта аб перадачы археалагічных матэрыялаў (ці іх часткі) на пастаяннае захаванне ў адпаведную ўстанову.

2.10. Па ўсіх выпадках адмовы ў выдачы Дазволу ці абмежаванняў аб'ёмаў палявых работ ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" інфармуе у пісьмовай форме ўстанову ці арганізацыю, якія падалі заяўку, з указаннем прычын ці матываў такога рашэння.

2.11. Дазволы, якія выдаюцца ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", візіруюцца ва Упраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства

культуры Рэспублікі Беларусь і прадстаўляюцца ў мясцовыя ўстановы ўлады, на тэрыторыі якіх праводзяцца археалагічныя даследаванні.

2.12. Пры завяршэнні палявых работ даследчык абавязаны прадставіць ва Упраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, дзе быў зарэгістраваны Дазвол, кароткую інфармацыю аб усіх абследаваных помніках і выніках раскопак.

2.13. Нявыкарыстаны Дазвол пасля заканчэння тэрміну яго паўнамоцнасці, вяртаецца ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" з тлумачальным лістом установы, якая яго запатрабавала, аб прычынах невыканання запланаваных работ.

## 3. АБАВЯЗКІ ЎСТАНОЎ, ЯКІЯ ВЯДУЦЬ ПАЛЯВЫЯ АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

3.1. Установа, якая арганізуе археалагічныя даследаванні і патрабуе Дазвол на іх правядзенне, нясе адказнасць за якасць выканання палявых работ.

3.2. Установа, якая праводзіць палявыя даследаванні, нясе адказнасць за своечасовасць прадстаўлення і якасць справаздачы аб выкананых работах.

3.3. Навуковыя справаздачы аб выніках палявых даследаванняў павінны быць завераны подпісам і пячаткай кіраўніка ўстановы, якая іх праводзіла.

3.4. Установе, якая праводзіла археалагічныя раскопкі і разведкі, належыць выключнае права на выкарыстанне навуковай справаздачы аб іх выніках, паколькі яна з'яўляецца творам, выкананым у якасці службовага задання (Закон Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве, дадатак 1). Але пры гэтым павінны захоўвацца правы аўтара справаздачы (гл. п. 4.7. дадзенай інструкцыі).

## 4. АБАВЯЗКІ, ПРАВЫ І АДКАЗНАСЦЬ ДАСЛЕДЧЫКА, ЯКІАТРЫМАЎ ДАЗВОЛ

4.1. Даследчык, які атрымаў Дазвол, абавязаны:

4.1.1. кіраваць палявымі даследаваннямі, не пакідаючы месца работ на працягу ўсяго часу (магчыма толькі кароткачасовая адсутнасць даследчыка па важных прычынах), перадавер кіраўніцтва раскопкамі іншай асобе забараняецца;

4.1.2. пры правядзенні археалагічных даследаванняў па гаспадарчых дагаворах прысутнасць кіраўніка на помніку патрэбна па неабходнасці пад час земляных работ;

4.1.3. калі Дазвол не быў выкарыстаны і работы не праводзіліся вярнуць Дазвол у ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" з азначэннем прычын невыкарыстання;

4.1.4. забяспечыць захаванне даследуемых помнікаў пад час працы і спрыяць іх захаванасці пасля завяршэння раскопак;

4.1.5. садзейнічаць ахове археалагічных помнікаў у раёнах правядзення работ, разам з мясцовымі дзяржаўнымі органамі аховы прымаць меры па прадухіленню самавольных раскопак.

4.2. Пры выяўленні ў працэсе археалагічных разведак раней не вядомых помнікаў даследчык абавязаны пісьмова паведаміць аб гэтым дзяржаўны орган па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, на тэрыторыіі якога знаходзіцца гэты помнік. Копія гэтай інфармацыі размяшчаецца ў навуковай справаздачы.

4.3. Пасля завяршэння палявых работ і камеральнай апрацоўкі рэчавых матэрыялаў даследчык абавязаны падрыхтаваць навуковую справаздачу па выніках палявых даследаванняў і прадставіць яе у ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" не пазней 30 красавіка наступнага года у адпаведнасці з патрабаваннямі Інструкцыі, а таксама кароткую анатацыю (каля 1 стар.) дзеля ўключэння ў інфармацыйную базу дадзеных.

4.4. Да 10 лютага наступнага за даследаваннямі года даследчык павінен прадставіць інфармацыйны артыкул на справаздачную канферэнцыю (друкуецца у Гісторыка-археалагічным зборніку).

4.5. Матэрыялы, выяўленыя падчас археалагічных раскопак і разведак мінулага года, даследчык павінен перадаць ў дзяржаўны музей ці ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" для пастаяннага захоўвання у адпаведнасці з устаноўленымі правіламі.

4.6. Аўтару навуковай справаздачы аб археалагічных даследаваннях належыць аўтарскае права на гэты твор, які быў выкананы у якасці службовага задания (Закон Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве).

4.7. Аўтар даследаванняў і навуковай справаздачы мае права:

4.7.1. надрукаваць справаздачу ці яе частку, а таксама матэрыялы, якія атрыманы пры палявых даследаваннях, пад сваім прозвішчам;

4.7.2. запрасіць сааўтараў для надрукавання матэрыялаў са справаздач;

4.7.3. дазволіць іншым асобам друкаваць матэрыялы справаздачы ці іх частку, а таксама асобныя знаходкі рэчаў ці іх серыю.

4.8. Аўтарскае права на навуковую справаздачу аб палявых даследаваннях дзейнічае пастаянна. Выключнае права аўтара на публікацыю матэрыялаў раскопак дзейнічае на працягу 10 год пасля завяршэння яго работ на помніку.

4.9. З моманту паступлення справаздачы аб археалагічных даследаваннях на захоўванне ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", яна павінна быць даступнай для азнаямлення з пісьмовага дазволу аўтара.

4.10. Выкарыстанне справаздач аб археалагічных даследаваннях, якія захоўваюцца ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", дазваляецца яго дырэкцыяй на аснове заяўкі афіцыйнай установы па ўзгадненню з аўтарам справаздачы. На справаздачы робіцца адзнака аб часе і характары выкарыстання.

4.11. Пры любым выкарыстанні ў навуковай працы матэрыялаў справаздач абавязкова адпаведная спасылка на справаздачу.

4.12. Даследчык, які атрымаў Дазвол, нясе персанальную адказнасць за:

4.12.1. захаванне гісторыка-культурнай спадчыны (усіх адметнасцей даследуемага помніка);

4.12.2. навукова-метадычнае абаснаванне прымаемых і рэалізуемых праектных рашэнняў;

4.12.3. якасную падрыхтоўку навуковай справаздачы і своечасовае прадстаўленне яе ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі";

4.12.4. фіксацыю і захаванне знаходак ў адпаведнасці з палявым вопісам да іх перадачы на пастаяннае захоўванне ў музей ці навуковыя археалагічныя фонды ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі".

## 5. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАЗВЕДАК

5.1. Разведкі – навуковае абследаванне помнікаў археалогіі з мэтай выяўлення і першаснага вывучэння новых, а таксама асэнсавання на сучасным узроўні ужо вядомых аб іх літаратурных і архіўных звестак.

5.2. Палявым даследаванням павінна-папярэднічаць знаёмства з літаратурнымі і архіўнымі матэрыяламі, якія маюць дачыненне да помнікаў і тэрыторый, на якіх будуць праводзіцца даследаванні.

5.3. У час разведкі на кожны помнік трэба:

5.3.1. даць поўную характарыстыку помніка (яго назва, апісанне геаграфічнага размяшчэння, суадносіны з суседнімі вадаёмамі і населенымі пунктамі, рэльеф і тапаграфічныя асаблівасці, формы, параметры, наяўнасць на іх пабудоў, дрэў, ямаў ці ін-

шых пашкоджанняў, тэрыторыя распаўсюджвання знаходак, звесткі пра помнік у літаратуры, сучаснае выкарыстанне і захаванасць помніка, а таксама магутнасць і насычанасць культурнага пласта (у выпадку шурфоўкі ці пры наяўнасці агаленняў, ямаў);

5.3.2. скласці сітуацыйны план і план помніка (у маштабе 1:500 і т.д.) у залежнасці ад памераў помніка, з абазначэннем гарызанталямі ці другімі спосабамі рэльефу, з дакладнай прывязкай помнікаў да арыенціраў, абазначэннем усіх шурфоў (памерам 2×2 м, ці 1×1 м), зачыстак, а таксама з пазначэннем месцаў пашкоджання культурнага пласта (кар’ер, ямы і інш.);

5.3.3. зрабіць фатаграфічную фіксацыю помніка з улікам таго, што фотаздымак павінен поўна і дакладна адлюстраваць асаблівасці рэльефа і тапаграфічную сітуацыю. Пры фатаграфаванні дэталяў помніка неабходна выкарыстоўваць масштабную рэйку;

5.3.4. сабраць археалагічны матэрыял з паверхні глебы і скласці яго вопіс з дакладнай пашпартызацыяй кожнай знаходкі.

5.4. Даследчык, які працуе па Дазволу па форме № 2, мае права з мэтай вызначэння магутнасці, пашырэння і характару культурнага пласта адкрытага помніка правесці на ім невялікія земляныя работы, зачыстку агаленняў, закладку шурфоў ці траншэй. На раней даследаваных помніках мэтазгоднасць ускрыцця глебы трэба абгрунтаваць.

5.5. Закладка разведкавых шурфоў ці траншэй дапускаецца на паселішчах, гарадзішчах і ў месцах верагодных грунтовых могільнікаў. Шурфоўкі курганоў ці іншых бачных археалагічных комплексаў забараняюцца. Нельга закладваць шурфы на западзінах ад жытлаў, на старажытных пахаваннях ці сходных аб’ектах, калі яны бачны на паверхні.

5.6. Пры выкананні земляных работ у час разведак неабходна імкнуцца да мінімальнага разбурэння культурнага слою (пазбягаць ускрыцця плошчы і абмяжоўвацца зачысткай, фіксацыяй агаленняў: адхоны, сценкі ямаў і іншыя пашкоджанні). У выпадку парушэння аб’екта пад уздзеяннем прыродных альбо тэхнагенных з’яў, яго, па магчымасці, неабходна даследаваць цалкам.

5.7. У выпадку закладання разведкавых шурфоў ці траншэй, іх колькасць для аднаго помніка не павінна перавышаць трох, з агульнай плошчай да 24 кв м. Неабходнасць закладкі вялікай колькасці шурфоў павінна быць спецыяльна абгрунтавана. Памеры шурфоў вызначаюцца мэтамі даследавання і характарам помніка. Шурфы павінны мець плошчу не меньш чым 1×1 м.

5.8. Пры знаходжанні ў шурфах рэштак жытлаў і другіх старажытных пабудоў нельга парушаць іх комплекснасць, таму раскопкі на гэтым месцы трэба прыпыніць і рэшткі пабудовы закансерваваць (засыпаць шурф глебай). Пры знаходжанні ў шурфе часткі пахавання неабходна пералічыць памеры шурфа і даследаваць пахаванне цалкам.

5.9. Усе шурфы, траншэі, зачысткі павінны быць нанесены ў масштабе на план вывучаемага помніка. Абавязковым з’яўляецца складанне планаў і стратыграфічных профіляў усіх аб’ектаў (у масштабе не менш 1:40), незалежна ад наяўнасці ці адсутнасці культурнага пласта. Стратыграфія ўсіх зробленых агаленняў павінна дакладна фіксавацца як у дзённіку, так і на фотаздымках.

5.10. Пасля завяршэння разведкавых работ усе шурфы і траншэі павінны быць засыпаны, што фіксуецца на фота.

5.11. Знаходкі, якія выяўлены падчас разведак і характарызуюць помнік, павінны быць сабраны, занесены ў палявы вопіс і мець этыкеткі з дакладным абазначэннем месца і ўмоў знаходжання.

5.12. Павінна быць праведзена картаграфаванне вынікаў разведкі. Пры суцэльным абследаванні на карце замкнутай лініяй фіксуецца ўчастак разведкі і рознымі адзнакамі пазначаюцца ўсе абследаваныя і раней выяўленыя помнікі археалогіі. Пры

маршрутнай разведцы на карце паказваецца фактычны маршрут абследавання і ўсе помнікі археалогіі пад нумарамі. Расшыфроўка нумароў даецца асобна ў легендзе да карты.

## 6. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПАК

6.1. Археалагічныя раскопкі з'яўляюцца асноўнай і важнейшай формай навуковага вывучэння помніка. Яны маюць мэтай усебаковае вывучэнне, дакладную фіксацыю і навуковую ацэнку помніка, яны патрабуюць поўныя характарыстыкі тапаграфіі і стратыграфіі помніка, яго культурнага пласта, пабудоў, выяўленых знаходак і г.д.

6.2. Першаснай мэтай палявой археалогіі ў сучасных умовах з'яўляецца захаванне археалагічных каштоўнасцей для будучых пакаленняў даследчыкаў, што зафіксавана "Міжнароднай хартыяй па ахове і выкарыстанню археалагічнай спадчыны" (1990 г.) і "Еўрапейскай канвенцыяй па археалагічнай спадчыне" (1992 г.).

6.3. Для правядзення раскопак выбіраюцца помнікі, якія могуць даць значныя вынікі, неабходныя для распрацоўкі планавых навуковых тэм і праблемных пытанняў па гісторыі Беларусі. Раскопваць належыць, перш за ўсё, помнікі, якія будуць разбурацца ў час запланаваных гаспадарча-будаўнічых прац, а таксама помнікі, якія разбураюцца ад прыроднага ўздзеяння.

6.4. Правядзенню стацыянарных раскопак павінна папярэднічаць дэталёвае абследаванне як самога помніка, так і навакольнай мясцовасці, складанне іструментальнага плана помніка і яго ўсебаковая фотафіксацыя.

6.5. Выбар месца для закладкі раскопа на помніку і акрэсленне яго памераў вызначаюцца мэтамі даследавання, тэхнічнай магчымасцю раскопак на тым ці іншым месцы і іншымі фактарамі. Пры гэтым абавязкова павінна ўлічвацца захаванне помніка і прыярытэтнасць першачарговага даследавання аддаецца тым участкам, якім у найбольшай ступені пагражае пашкоджанне ці разбурэнне ў выніку прыродных працэсаў ці гаспадарчай дзейнасці.

6.6. Раскопкі паселішчаў і грунтовых могільнікаў павінны весціся дастаткова вялікімі плошчамі, што гарантуе магчымасць яснай характарыстыкі помніка, яго частак і істотных дэталяў. Раскопкі археалагічных помнікаў толькі пры дапамозе шурфоў ці траншэй катэгарычна забараняюцца. Забараняецца закладваць невялікія ізаляваныя раскопы над асобнымі аб'ектамі, жытловымі западзінамі, пляцоўкамі ад жытлаў, магіламі і т.д. Усе такія аб'екты павінны ўваходзіць у межы агульнага раскопа, які ахоплівае таксама прастору паміж аб'ектамі.

6.7. Трэба імкнуцца да закладкі на адным помніку мінімальнай колькасці раскопаў. Павелічэнне колькасці раскопаў трэба весці, па магчымасці, шляхам прырэзак да існуючых раскопаў. Забараняецца пакідаць паміж раскопамі невялікія ўчасткі невывучанага культурнага слоя, якія потым непазбежна разбураюцца.

6.8. Пры неабходнасці закладкі некалькіх раскопаў у розных частках помніка трэба размяшчаць іх па адзінай каардынацыйнай сетцы для дакладнага стыкавання раскопаў у далейшым. Такую сетку рэкамендуецца накладаць на ўвесь помнік у пачатку работ. Неабходна таксама ўвязка адзнак вышынь на ўсіх раскопах. Для гэтага на помніку павінен быць адзін рэпер, ад якога робіцца нівеліроўка ўсіх раскопаў.

6.9. Калі даследаванні праводзяцца у горадзе, альбо сельскай мясцовасці і іх размяшчэнне ахоплівае вялікую плошчу, магчыма прывязка да балтыйскай сістэмы.

6.10. Помнікі, на якіх магчыма атрымаць дадатковую інфармацыю з дапамогай прыродазнаўчых метадаў, пажадана вывучаць з прыцягненнем спецыялістаў гэтых галін ведаў.

6.11. Раскопкі курганоў праводзяцца толькі са здыманнем усяго насыпа і вывучэннем усей прасторы пад насыпам, а таксама прылеглай плошчы, на якой могуць

знайсціся ровікі, прысыпкі, сляды трызны і г.д. Вывучэнне курганных могільнікаў з кепска вылучальнымі, задужа прыплюшчанымі, узаемна перакрывальнымі насыпамі павінны весціся суцэльнай плошчай, як пры даследаванні грунтовых могільнікаў.

6.12. Пры даследаванні насыпаў курганоў павінны быць забяспечаны выяўленне і інструментальная фіксацыя ўсіх аб'ектаў у іх (упускныя пахаванні, трызны, асобныя знаходкі і інш.), асаблівасцей канструкцыі і складу самога насыпу, узроўню пахавання і глебы, наяўнасці падсыпкі, накідаў, выкладак ці іншых збудаваняў унутры насыпа, пад ім ці вакол яго.

6.13. Вывучэнне культурнага слоя ці пахаванняў вядзецца толькі ручным інструментам. Выкарыстанне ў гэтых мэтах землярыйных машын і механізмаў катэгарычна забараняецца. Гэтыя машыны могуць выкарыстоўвацца толькі для баластных работ (транспарціроўка перабранага грунта, зняццё перакрываючага помнік стэрыльнага слою і т.д.).

6.14. Раскопкі старажытных паселішчаў усіх відаў (стаянак, селішчаў, гарадзішчаў) праводзяцца паслойна і пакваратна з дакладным выяўленнем усіх асаблівасцей, якія мае слой і паселішча ў цэлым. У культурным слоі інструментальна фіксуюцца ўсе рэшткі аб'ектаў, а таксама размяшчэнне знаходак на плошчы раскопак і іх суадносіны са слаямі і пабудовамі.

6.15. Пры раскопках помнікаў са шматслойнымі культурнымі напластаваннямі паслядоўнае паглыбленне ў ніжэйшыя слаі мае быць толькі пасля дэталёвага вывучэння верхніх слаёў на дастаткова шырокай плошчы і вычарпальнай іх фіксацыі.

6.16. Вывучэнне культурных адкладаў павінна быць зроблена да матэрыка, калі гэтаму не перашкаджаюць знойдзеныя будаўнічыя і архітэктурныя рэшткі першаступеннага значэння, якія патрэбна захаваць.

6.17. Пры правядзенні ахоўных раскопак даследчык мае права у выпадку навуковай неабходнасці зрабіць прырэзку да раскопа па-за межамі будаўнічага участка.

6.18. Пры раскопках помнікаў, дзе прысутнічаюць архітэктурныя рэшткі, працу трэба весці так, каб яны не парушыліся і не разбураліся да поўнага іх выяўлення і ўсебаковай фіксацыі. У выпадку правядзення сістэматычных шматгадовых раскопак на адным помніку з захаваннем знойдзеных архітэктурных рэшткаў у адкрытым выглядзе павінны быць прыняты меры для іх аховы і кансервацыі.

6.19. Для стратыграфічных назіранняў унутры вялікіх раскопаў пакідаюць некранутымі папярочныя броўкі. Пры раскопках кургана (калі ён не даследуецца па сектарах) таксама пакідаюць дзве і болей (калі курган падоўжаны) перпендыкулярныя броўкі. Броўкі абавязкова разбіраюцца пасля іх чарцёжнай і фатаграфічнай фіксацыі.

6.20. Падчас раскопак помнікаў усіх тыпаў абавязкова праводзіцца нівеліроўка паверхні (раскопа, кургана) і ўсіх аб'ектаў (пабудоў, узроўня падлогі, праплясткаў, вогнішчаў, пахаванняў, рэшткаў трызн і інш.), а таксама найважнейшых знаходак ад адзінага нулявога рэпера. Пры вымярэнні глыбінь ад паверхні, ад ўзроўня пахаванай глебы ці ад іншых узроўняў выконваецца пералік дадзеных нівеліроўкі адносна нулявой адзнакі.

6.21. Пры вывучэнні выяў на камянях неабходна ахопліваць усю паверхню іх знаходжання. Нельга абмяжоўвацца рэгістрацыяй і апісаннем найбольш эфектных фігур і кампазіцый.

6.22. Даследчык абавязаны штодзённа весці палявы дзённік, у які заносяцца ўсе назіранні падчас раскопак. Дадзеныя дзённіка з'яўляюцца асновай для складання навуковай справаздачы. Дзённік лічыцца абавязковым і асноўным афіцыйным палявым дакументам і не можа быць заменены іншымі запісамі.

6.23. Акрамя запісаў у дзённіку, усе вынікі работ знаходзяць адлюстраванне ў чарцёжнай і фатаграфічнай дакументацыі. Усе чарцяжы-планы: разрэзы раскопаў, стра-

тыграфічныя профілі, планы і профілі курганоў, планы і разрэзы пахаванняў і інш. павінны складацца на месцы работ і ў максімальнай ступені адлюстроўваць усе назіранні даследчыка і, перш за ўсё, такія факты як узаемнае размяшчэнне слаёў і пабудоў, іх адносіны да вышынных адзінак; склад, структура і колер слаёў; наяўнасць грунтовых, попельных, вугальных і іншых плямаў; распаўсюджванне знаходак на плане раскопа, умовы і глыбіні іх залягання; паклад памерлага і рэчаў у магіле і г.д. Планы, разрэзы і профілі раскопаў павінны выконвацца ў адным маштабе (не менш 1:40). Планы і разрэзы пахаванняў складаюць у маштабе не менш 1:20. На планах павінны быць адлюстраваны асноўныя дэталі, якія зафіксаваны ў профілі. Калі фіксуюцца будаўнічыя траншэі, дапушчальны маштаб 1:40 (і больш дробны) пры адсутнасці культурнага пласта, ці яго нязначнасці. Але трэба даваць у адпаведным (1:40 ці 1:20) маштабе месцы, дзе прысутнічаюць ямы, будаўнічыя канструкцыі і складаная стратыграфія.

6.24. Абавязковай з’яўляецца фотафіксацыя працэса раскопак і ўсіх ускрытых аб’ектаў пахавання, стратыграфічных профіляў і інш.

6.25. Знойдзеныя падчас раскопак рэчавыя знаходкі: будаўнічыя матэрыялы, астэалагічныя, палеабатанічныя і іншыя рэшткі павінны фіксавацца ў дзённікавых запісах, а таксама знаходзіць адлюстраванне на чарцяжах.

6.26. Большую частку знаходак належыць узяць для далейшай апрацоўкі і музейнага захавання. Вызначэнне тых матэрыялаў, якія павінны быць узяты, і тых, якія застаюцца на месцы, выконваецца ў залежнасці ад ступені вывучанасці помніка і матэрыялаў, ад магчымасці дакладнай фіксацыі гэтых матэрыялаў на месцы, ад ступені іх захаванасці і г.д.

6.27. Пры ўсіх умовах павінны быць узяты:

6.27.1. інвентар пахавальных комплексаў цалкам;

6.27.2. усе матэрыялы закрытых комплексаў-пабудоў;

6.27.3. усе цэлыя ці складаныя рэчы;

6.27.4. усе індывідуальныя знаходкі;

6.27.5. усе нумізматычныя і эпіграфічныя знаходкі;

6.27.6. знаходкі, якія маюць мастацкае значэнне;

6.27.7. знаходкі, па якіх можна датаваць раскоп, пласт і т.д.;

6.27.8. знаходкі, якія паказваюць культурную прыналежнасць помніка, яго гаспадарчую характарыстыку і т.д.;

6.27.9. усе невядомыя да гэтага рэчы;

6.27.10. усе знаходкі, атрыманыя пры раскопках помнікаў каменнага і бронзавага веку;

6.27.11. усе выяўленыя археалагічныя матэрыялы павінны быць занесены ў палявы вопіс і мець пашпарты з адзнакай дакладнага месцазнаходжання кожнай рэчы ці фрагмента (помнік, раскоп, квадрат, пласт, глыбіня залягання, зямлянка, яма, пахаванне).

6.28. У залежнасці ад ступені вывучэння і захавання помніка і самога матэрыялу даследчык мае права адабраць частку знаходак, якая можа быць пакінута на месцы палявых работ. Пры гэтым адбор астэалагічных, антрапалагічных знаходак і рэшткаў металургічнай вытворчасці павінен праводзіцца пры ўдзеле спецыялістаў, а пры адсутнасці такіх узяты поўнасцю.

6.29. Застаўлены на месце раскопа матэрыял павінен быць асабліва падрабязна зафіксаваны ў дзённіку. Яго трэба сабраць у адным месцы і закапаць. Точнае месца закопвання адзначаецца на плане помніка.

6.30. Пасля завяршэння археалагічных раскопак даследчык абавязаны засыпаць усе зробленыя раскопы, прыбраць выкіды глебы, узнавіць глебавы пласт і існаваўшы да пачатку раскопак ландшафт. У выпадку незавяршэння раскопу па аб’ектыўных прычы-

нах патрэбна выканаць кансервацыю катлавана і асобных выяўленых аб'ектаў, што павінна быць усебакова задакументавана і адлюстравана ў навуковай справаздачы.

6.31. Пры вывучэнні раскопкамі каменных могільнікаў і да таго падобных аб'ектаў трэба па магчымасці пасля раскопак узнавіць гэтыя збудаванні ў першапачатковым стане. Гэта датычыцца таксама і старажытных каменных крыжоў, культавых камянёў і т.д., каменных кладак. Даследчык абавязаны прыняць меры для іх кансервацыі. Узноўлены пасля раскопак помнік павінен фіксавацца фотаздымкам, адпаведная дакументацыя павінна быць змешчана ў справаздачы.

6.32. Падчас раскопак даследчык абавязаны строга выконваць правілы тэхнікі бяспекі, прадугледжаныя для земляных работ спецыяльнымі інструкцыямі.

## 7. СПРАВАЗДАЧЫ ПА ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

7.1. Навуковая справаздача аб палявой рабоце бягучага года павінна складацца даследчыкам дакладна па ўмовах "Правіл прадстаўлення справаздач па Дазволах" і павінна быць здадзена ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" пасля заканчэння палявых работ не пазней 30 красавіка наступнага года.

7.2. Справаздачы, якія паступаюць у ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" пазней указанага тэрміну, разглядаюцца аддзеламі і Палявым камітэтам толькі пасля завяршэння палявога сезону.

7.3. За своечасовую здачу справаздачы ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" сумесна з аўтарам адказнасць нясе і ўстанова, якая з'яўляецца арганізатарам археалагічных даследаванняў і па заяўцы якой быў выдадзены Дазвол.

7.4. Копіі навуковай справаздачы прадстаўляюцца ва ўстанову, якая арганізавала археалагічныя разведкі ці раскопкі, а ў выпадку правядзення археалагічных работ на сродкі будаўнічых ці гаспадарчых арганізацый – у гэтыя ўстановы па іх патрабаванню.

7.5. З навуковай справаздачай у ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" здаюцца:

7.5.1. даведка аб здачы на пастаяннае захоўванне калекцый, ці аб часовым захаванні іх часткі, патрэбнай для паглыбленай апрацоўкі (тэрмін не больш за 2 гады);

7.5.2. выкарыстаны і завізіраваны ва Упраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Дазвол.

7.6. Пасля атрымання справаздачы ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" разглядае яе на працягу двух тыдняў і дае сваё заключэнне. Пры гэтым справаздача, у залежнасці ад яе зместу і афармлення можа прымацца без заўваг ці с практычнымі заўвагамі, аб якіх інфармуюць даследчыка, можа вяртацца на дапрацоўку альбо прызнаецца незадавальняючай (аб чым паведамляецца ўстанове, якая запатрабавала Дазвол).

7.7. ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" можа запатрабаваць ад аўтара справаздачы дапоўніць яе іншымі матэрыяламі (апісаннямі, чарцяжамі, фотаздымкамі і т.д.), а ў выпадку неабходнасці запатрабаваць для прагляду і палявую дакументацыю (дзённікі, палявыя чарцяжы і т.д.). Асобы, якія праводзяць самастойныя даследаванні (раскопкі) упершыню, абавязаны здаваць палявую дакументацыю на прагляд.

7.8. Калі справаздача вернута аўтару на выпраўленне ці дапрацоўку, то яна павінна прадстаўляцца ў археалагічны аддзел ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" ў другі раз праз два тыдні.

7.9. Да выпраўленай справаздачы прыкладаецца тлумачальная запіска, у якой аўтар павінен адзначыць, як ён выправіў ўказаныя ў водгуку недахопы, чым дапоўніў справаздачу (указанне старонак, нумароў табліц і т.д.). Па тых крытычных заўвагах,

якія аўтар не палічыў неабходным улічваць, неабходна прадставіць абгрунтаваныя тлумачэнні.

7.10. Заключэнне ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" аб якасці праведзеных работ і прадстаўленай справаздачы даводзіцца да ведама іх аўтара, а ў нездавальняючых выпадках і да ведама кіраўніцтва установы, якая арганізавала палявыя даследаванні.

7.11. Незадавальняючая ацэнка справаздачы можа быць падставай для адмовы аўтару ў атрыманні новага Дазволу.

7.12. Пры паўторнай здачы незадавальняючай па якасці справаздачы новы Дазвол не можа быць выдадзены.

## 8. ПРАВІЛЫ ПРАДСТАЎЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧ ПА ДАЗВОЛАХ

8.1. Кожны даследчык, які ажыццяўляў археалагічныя раскопкі ці разведкі па Дазволу, які быў выдадзены ДНУ "Інстытута гісторыі НАН Беларусі", павінен прадставіць навуковую справаздачу аб праведзеных палявых работах у тэрміны, прадугледжаныя пунктам 4.3, дадзенай Інструкцыі.

8.2. Навуковая справаздача аб палявых даследаваннях з'яўляецца індывідуальнай навуковай працай археолага, атрымаўшага Дазвол, і ствараецца ў час выконвання службовых абавязкаў. Таму за якасць справаздачы і своечасовае яе прадстаўленне ў ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" нясе адказнасць і ўстанова ці арганізацыя, якая праводзіла археалагічныя даследаванні.

8.3. Якасць справаздачы з'яўляецца крытэрыем магчымасці прадстаўлення ў далейшым аўтару права на самастойныя археалагічныя разведкі і раскопкі.

8.4. У тых выпадках, калі ў стварэнні справаздачы прымалі ўдзел і іншыя супрацоўнікі экспедыцыі (акрамя асобы, якая атрымала Дазвол), то іх удзел павінен быць адзначаны ў тэксце. На тытульным аркушы прозвішчы гэтых асоб адзначаюцца па прапанове даследчыка помніка, атрымаўшага Дазвол.

8.5. Справаздача павінна цалкам адлюстроўваць усе разведкавыя і раскопачныя работы, якія праводзіліся ў палявым сезоне.

8.6. Калі раскопкі ці разведкі ў некаторых раёнах альбо на некаторых помніках, якія былі пералічаны ў Дазволе, па якіх-небудзь прычынах не праводзіліся, то пра гэта неабходна згадаць у тэксце справаздачы.

8.7. Справаздача павінна ўключаць наступныя даныя:

8.7.1. аб мэтах і задачах, якія ставіў перад сабой даследчык і аб ступені іх выканання ў сезоне;

8.7.2. аб сувязі работ, што выконваліся, з папярэднімі даследаваннямі тых самых помнікаў ці раёнаў;

8.7.3. аб арганізацыі работ і іх фінансаванні;

8.7.4. аб асноўных удзельніках палявой экспедыцыі і іх функцыях;

8.7.5. аб прынятай методыцы працы;

8.7.6. аб планах (калі яны маюцца) далейшых даследаванняў тых жа помнікаў ці раёнаў.

## 9. СПРАВАЗДАЧА АБ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАЗВЕДКАХ

9.1. У справаздачы аб археалагічных разведках павінны абавязкова знаходзіцца:

9.1.1. апісанне маршрута ці раёна разведак з пералікам усіх абследаваных помнікаў;

9.1.2. карты разведкі з абазначэннем геаграфічных арыенціраў (рэкі, азёры, населеныя пункты і інш.), маршрута разведкі і ўсіх даследаваных помнікаў;

9.1.3. поўнае апісанне кожнага вывучанага помніка з адлюстраваннем яго назвы, геаграфічнага месцазнаходжання, захаванасці, стану паверхні, тапаграфічных асаблівасцей, яго формы і памераў (калі яны вызначаюцца візуальна), ці межаў распаўсюджвання знаходак, характарыстыкі культурнага пласта (пры правядзенні разведачнай шурфоўкі) і ўсяго знойдзеннага матэрыялу;

9.1.4. інфармацыя аб тым, адкрыты ці абследаваны помнік упершыню, альбо быў вядомы раней, кім і калі абследаваўся і вывучаўся;

9.1.5. указанне памераў усіх шурфоў, траншэй, зачыстак з адлюстраваннем іх стратыграфіі;

9.1.6. планы і стратыграфічныя профілі ўсіх аб'ектаў незалежна ад наяўнасці ці адсутнасці на іх культурнага пласта.

9.2. Абследаваныя помнікі павінны быць пранумераваны адпаведным нумарам на карце.

9.3. Кожны даследаваны помнік павінен прадстаўляцца ў справаздачы планамі, інструментальным ці візуальным, які складаецца ў пэўным маштабе і адлюстроўвае асаблівасці рэльефу і тапаграфічную сітуацыю. Для гарадзішчаў і іншых помнікаў з адмысловым рэльефам яна павінна давацца яшчэ і ў разрэзе ў тым жа маштабе, што і план помніка.

9.4. План помніка павінен мець добрую тапаграфічную прывязку да пастаянных арыенціраў на мясцовасці: указанне адлегласці і напрамку да населеных пунктаў, дарог, мастоў, геадэзічных пунктаў і т.д.

9.5. Пры адлюстраванні на плане рэльефу пры дапамозе гарызанталей павінен ўказвацца берг-штрыхамі напрамак схілу і адзначацца вышыня сячэння гарызанталей.

9.6. Пры закладцы на помніку разведкавых раскопаў, траншэй, шурфоў і зачыстак усе яны павінны быць дакладна зафіксаваны.

9.7. Палявыя фотаздымкі павінны рабіцца з тым улікам, каб найбольш поўна і падрабязна перадаць асаблівасці рэльефу і тапаграфічнае становішча абследаваных помнікаў.

9.8. Знойдзеныя ў час разведак археалагічныя матэрыялы павінны быць апісаны ў тэксце і прадстаўлены ў альбоме ў малюнках і фатаграфіях.

## 10. СПРАВАЗДАЧА АБ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПКАХ

10.1. Справаздача аб археалагічных раскопках павінна ўключаць:

10.1.1. поўнае апісанне помніка, які вывучаецца і адлюстроўваць яго назву, геаграфічнае становішча, форму і памеры, тапаграфічныя асаблівасці, магутнасць і склад культурнага пласта і інш;

10.1.2 план помніка з дакладным абазначэннем у маштабе ўсіх раскопаў, траншэй, шурфоў і т.д., тых якія закладваў аўтар у годзе справаздачы і ў папярэднія гады, а таксама зробленыя ў выніку раскопак іншымі археолагамі.

10.2. У справаздачы ўказваецца методыка і падаецца абгрунтаванне выбару гэтай методыкі.

10.3. Апісанне вынікаў раскопак паселішчаў робіцца на раскопках (участку) па слаях ці пластах. Кожны раскоп прадстаўляецца планам і профілямі сценак раскопа, бровак. Пры значнай глыбіні раскопа і даследаванні шматслойнасці паселішчаў на кожны будаўнічы гарызонт (ці слой, пласт) павінен рабіцца асобны план.

10.4. На плане раскопа наносяцца ніveліровачныя адзнакі (ці прадстаўляецца асобны план нівеліроўкі паверхні). Гэтыя дадзеныя павінны паўтарацца на профілях.

10.5. На планы раскопак наносяцца ўсе знойдзеныя пабудовы (пабудовы, ямы, канаўкі і інш.), грунтовыя плямы, вогнішчы і інш., а таксама важнейшыя знаходкі з адзнакамі іх месцазнаходжання і з адзнакамі глыбінь.

10.6. Планы і профілі раскопа павінны выконвацца ў адным маштабе, на профілях адзначаюцца межы квадратаў, якія прадстаўлены на плане. У выпадку значнага памяншэння агульнага плана раскопа ў справаздачы мэтазгодна рабіць планы асобных комплексаў (пабудовы, вогнішчы) у больш буйным маштабе.

10.7. Пры даследаванні ў раскопе каменных, цагляных ці драўляных архітэктурных пабудоў, акрамя іх дэталёвага апісання, планаў і профіляў раскопаў, прадстаўляюцца дэталёвыя планы пабудоў, разрэзы, фасіроўкі і іншыя архітэктурныя чарцяжы.

10.8. Профілі сценак раскопа ці бровак павінны дакладна адлюстроўваць стратыграфічную сітуацыю, якую назірае даследчык. Нельга даваць абагульненаю стратыграфію (па некаторых профілях) ці стратыграфічныя калонкі, якія адлюстроўваюць толькі частку профіля.

10.9. Усе сустрэтыя пры праскопках рэшткі пабудоў (падмуркі, ямы, зямлянкі, канаўкі і інш.) падрабязна апісваюцца ў тэксце з адзнакамі іх месцазнаходжання, памераў, формы, запаўнення і інш.

10.10. На чарцяжах прадстаўляюцца разрэзы ўсіх ям, зямлянак і іншых грунтовых пабудоў, а на планах раскопаў указваюцца лініі, па якіх зняты разрэзы гэтых пабудоў.

10.11. Пры раскопках грунтовых могільнікаў пасля агульнага апісання археалагічнага становішча (размяшчэнне, знешнія прыкметы, захаванасць, гісторыя знаходкі і вывучэння, тэхніка раскопак і інш.) павінна ісці падрабязная характарыстыка кожнага даследаванага пахавання ці магілы, без залежнасці ад захаванасці і зместа комплексаў.

10.12. На план могільніка наносяцца ўсе знойдзеныя пахаванні з дакладным адлюстраваннем формы, памераў і арыентыроўкі шкілетаў у магілах.

10.13. Апісанне кожнага пахавальнага комплексу павінна ўключаць поўную характарыстыку магільнага збудавання з адлюстраваннем усіх памераў (пры паказе глыбінь неабходна указаць, ад якога ўзроўня праводзілася вымярэнне – ад сучаснай ці старажытнай паверхні, ад ўзроўня мацерыка і т.д.), формы канструкцыйных асабліваcцей і дэталей, а таксама запаўнення магільнай ямы.

10.14. Абавязкова апісанне палажэння кожнага шкілета ў могільніку, пералік усяго інвентара пахавання з дакладным месцазнаходжаннем кожнай рэчы ў адносінах да шкілета.

10.15. Кожнае пахаванне прадстаўляецца планам, на якім даюцца контуры магільнай ямы (калі яны праглядаюцца), выявы шкілета і ўсіх рэчаў, якія выяўлены пры раскопках, а таксама ўсе элементы пахавальнага абраду (падсыпкі, вогнішчы, рэшткі трунаў і інш.).

10.16. Пры даследаванні пахавання ў простай яме павінен рабіцца папярочны разрэз магілы, пры гэтым разрэз выконваецца ў тым жа маштабе, што і план магілы. Пры даследаванні складаных пахавальных пабудоў такіх разрэзаў павінна быць некалькі. Лініі разрэзаў адлюстроўваюцца на планах магіл.

10.17. Усе рэчы пахавальнага інвентара нумаруюцца на плане, а ў подпісе да плана ўказваецца, што знойдзена пад кожным нумарам.

10.18. Кожнае пахаванне павінна прадстаўляцца на фотаздымках. Пры раскопках курганоў справаздача павінна ўключаць характарыстыку кожнага кургана як пахавальнага комплексу з указаннем паслядоўнасці асноўных і ўпускных пахаванняў, гісторыю стварэння насыпу і інш.

10.19. Абавязкова прадстаўляецца план і не менш чым 2 профілі кожнага кургана з адзнакай на плане ўсіх пахаванняў, усіх паўкурганных пабудоў, канструкцыйных элементаў насыпаў – каменных і іншых абкладак, накідаў, ровікаў і інш. На профілі адзначаюцца толькі тыя пахаванні, якія бачны ў броўцы. План і профілі кургана выконваюцца ў адным маштабе.

10.20. На плане і профілях кургана абавязкова прыводзяцца дадзеныя нівеліроўкі ў адносінах да рэпера, месца якога таксама абавязкова адзначаецца на чарцяжах.

10.21. Абавязкова апісваецца склад курганнага насыпу і ўсіх яго элементаў – прысыпкі, магільных выкідаў, рэшткаў трызны, асобных знаходак і інш. Гэтыя элементы павінны быць адлюстраваны на плане і профілях кургана.

10.22. Кожнае пахаванне ў кургане апісваецца і дакументуецца таксама, як і пахаванні грунтовага могільніка. У выпадку змяшчэння ў справаздачу паменшанага плана курганоў з пахаваннямі мэтазгодна прыкладаць план пахаванняў ў больш буйным маштабе.

10.23. Справаздача павінна мець інфармацыю аб кансервацыі раскопаў ці аб іх засыпцы, аб характары рэкультывацыі глебы на месцы раскопак, аб узнаўленні надмагільных пабудоў і іншых археалагічных аб’ектаў. Гэтыя дадзеныя павінны быць пацверджаныя фотаздымкамі помнікаў пасля завяршэння работ.

## 11. ПАРАДАК АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧЫ

11.1. Справаздача здаецца ў ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі” ў адным экземпляры (дадатак 2). Ён прадстаўляецца ў выглядзе перадрукаванага тэкста (першы экземпляр). Усе калекцыйныя вопісы, карты, чарцяжы, фотаздымкі і малюнкі прыкладаюцца да справаздачы пасля тэксту ці зведзенымі ў асобны альбом, які аддаецца сумесна са справаздачай. Фармат альбома не павінен перавышаць 45×32 см (пажадана ў фармаце А4).

11.2. На тытульным аркушы ўказваецца ўстанова, дзе выконвалася праца, прозвішча і імя даследчыка, месца і характар работ у гэтым годзе.

11.3. Пасля тытульнага аркуша прыкладаецца Дазвол, а затым аглаўленне справаздачы, асноўны тэкст і дадаткі (вопісы, ілюстрацыі, фотаздымкі і т.д.). Справаздача павінна быць падрыхтавана для перапляцення і мець агульную нумерацыю старонак.

11.4. Чарцяжы ў справаздачы выконваюцца тушшу на паперы, кальцы ці міліметроўцы, альбо прадстаўляюцца ў выглядзе света – ці ксеракопіі і г.д.

11.5. Пры фатаграфаванні ці другіх метадах памяншэння чарцяжоў трэба звяртаць увагу на тое, каб усе дэталі, подпісы, лічбы і інш. былі добра бачны. Трэба не дапускаць празмернае памяншэнне і недастатковую выразнасць копій.

11.6. Буйнафарматныя чарцяжы, якія нельга паменшыць, павінны складацца да памераў альбома ці тэкста справаздачы. Прадстаўленне чарцяжоў у рулонах недапушчальна.

11.7. Кожны чарцёж (карта, план, профіль і інш.) павінны мець расшыфроўку усіх умоўных абазначэнняў. Можна вынесці гэтую расшыфроўку на асобны ліст (пры ўмове выкарыстання ў справаздачы адзінай сістэмы ўмоўных абазначэнняў).

11.8. Усе чарцяжы (карты, планы, профілі, разрэзы і інш.) і малюнкі ці фатаграфіі знаходак павінны мець лінейны паказальнік маштабу.

11.9. На ілюстрацыях прадстаўляюцца важнейшыя знаходкі (пажадана ўсе індывідуальныя знаходкі) з указаннем калекцыйных нумароў, для масавага матэрыялу – найбольш характэрныя рэчы). Індывідуальныя знаходкі падаюцца ў маштабе 1:1, а масавыя – 1:2, ці 1:4.

11.10. Малюнкі і фотаздымкі знойдзеных рэчаў кампануюцца ў табліцы, прычым кожная рэч у табліцы павінна мець свой індывідуальны нумар, на які робіцца спасылка ў тэксце справаздачы пры апісанні матэрыялу.

11.11. Паміж тэкстам справаздачы і дадаткамі (вопіс, альбом ілюстрацый) павінна існаваць цесная сувязь у выглядзе адсылак у тэксце на ўсе ілюстрацыі.

11.12. Усе ілюстрацыі павінны мець тлумачальныя подпісы. Спіс ілюстрацыйнага матэрыялу ня можа замяніць тлумачальных подпісаў.

11.13. У тлумачальных подпісах да рэчаў павінны давацца іх дакладныя пашпартныя дадзеныя (альбо нумар у калекцыйным вопісе).

11.14. У подпісах пад фотаздымкамі раскопаў і аб’ектаў пажадана ўказваць, з якога боку фатаграфаваўся раскоп ці аб’ект.

11.15. Справаздача павінна быць здадзена ў пераплёце (акрамя пластыкавага), альбо у папцы, падрыхтаванай да пераплёту з двума тытульнымі лістамі.

ЗМЕСТ


Уводзіны ... 3
Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны ... 4
Прыкладныя тэмы кантрольных работ для студэнтаў завочнага аддзялення ... 7
Прыкладныя пытанні да экзамену ... 7
1. Археалогія як навука, яе прадмет, метады і ўзаемасувязь з сумежнымі дысцыплінамі. ... 9
1.1. Вызначэнне археалогіі як навукі ... 9
1.2. Гісторыя археалогіі ... 9
1.3. Помнікі археалогіі як гістарычная крыніца. Віды археалагічных помнікаў ... 12
1.4. Заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў ... 15
1.5. Археалагічныя разведкі і раскопкі ... 16
1.6. Культурны пласт і стратыграфія ... 20
1.7. Камеральная апрацоўка археалагічнага матэрыялу ... 20
1.8. Археалагічная культура ... 21
1.9. Метады датавання ў археалогіі ... 22
1.10. Тэорыі развіцця грамадства ў археалогіі ... 24
2. Палеаліт ... 29
2.1. Агульная характарыстыка палеаліту ... 29
2.2. Алдувайская эпоха ... 33
2.3. Ашэльская эпоха ... 34
2.4. Эпоха мусцье ... 37
2.5. Верхні палеаліт ... 39
2.6. Верхні палеаліт на Беларусі ... 43
2.7. Мастацтва верхняга палеаліту ... 44
3. Мезаліт ... 47
3.1. Агульная характарыстыка мезаліту ... 47
3.2. Культуры мезаліту ... 49
3.3. Мезалітычныя індустрыі ... 50
3.4. Мастацтва мезаліту ... 51
4. Неаліт ... 53
4.1. Агульная характарыстыка неаліту ... 53
4.2. Прылады, асноўныя катэгорыі рэчаў і рамёствы неалітычнай эпохі ... 58
4.3. Жытлы і пасяленні неалітычнай эпохі ... 59
4.4. Гаспадарка неаліту ... 60
4.5. Асаблівасці неаліту Еўропы ... 61
4.6. Асаблівасці пахавальных помнікаў неаліту ... 63
4.7. Мастацтва неаліту ... 64
5. Энеаліт і бронзавы век ... 67
5.1. Агульная характарыстыка энеаліту і бронзавага веку ... 67
5.2. Індаеўрапейская праблема. Першыя індаеўрапейскія культуры Еўразіі ... 69
5.3. Каўказскі цэнтр бронзаліцейнай металургіі ... 72
5.4. Культуры вытворчага энеаліту і бронзавага веку Еўропы ... 73
5.5. Культуры бронзавага веку Сярэдняй Азіі і Закаўказзя ... 81
5.6. Мастацтва бронзавага веку ... 82
6. Жалезны век і сярэдневякоўе ... 86
6.1. Агульная характарыстыка жалезнага веку ... 86
6.2. Гальштат і латэн. Паморская і пшэворская культуры ... 87
6.3. Культуры стэпаў Усходняй Еўропы ... 90

6.4. Культуры балцкіх плямён ........ 93
6.5. Культуры фіна-уграў ........ 97
6.6. Заходнееўрапейскае сярэдневякоўе ........ 98
6.7. Славянскія культуры жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя ........ 100
7. Старажытная Русь ........ 109
7.1. Узнікненне Русі ........ 109
7.2. Усходнеславянская вёска ........ 110
7.3. Гандлёвыя сувязі ........ 112
7.4. Дружынныя курганы на Русі ........ 113
7.5. Распаўсюджванне пісьменства ........ 115
7.6. Феадальна-ўласніцкія замкі ........ 116
7.7. Гарады ўсходніх славян ........ 117
Метадычныя рэкамендацыі па выкананню заданняў
на семінарскіх занятках ........ 125
Практыкум ........ 126
Тэрміналагічны слоўнік ........ 134
Дадатак 1 ........ 139
Дадатак 2 ........ 140

*Вучэбнае выданне*

ДУК Дзяніс Уладзіміравіч

АРХЕАЛОГІЯ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 03 01 "Гісторыя"

Рэдактар *В. В. Рудак*

Дызайн вокладкі *В. А. Вінаградавай*

---

Падпісана да друку 30.03.09. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 9,04. Ул.-выд. арк. 8,92. Тыраж 60 экз. Заказ № 534.

---

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт"

ЛИ № 02330/0133020 ад 30.04.04 ЛП № 02330/0133128 ад 27.05.04

211440 г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29